КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №3 (179)
◂ 29 СТУДЗЕНЯ ◂ 2010 г.

# Новы Час




**БЕЛАРУСІ НЕ ХАПАЕ ЗМЕНАЎ**

Стар. 3

**АДКУЛЬ СТОЛЬКІ ПАЗІТЫВУ?**

Мы канструюем не толькі плот на лецішчы, мы канструюем сацыяльную рэальнасць. У кожнага яна свая

Стар. 4

**СЕРЫЯЛ «ШКОЛА»: ВЯРТАННЕ Ў ЗВЯРЫНЕЦ**

«Крычыце на іх. Забірайце і рвіце кнігі, часопісы і сшыткі не па вашым прадмеце. Стаўце двойкі атрамантам у журнал. Гэта не дзеці, гэта жывёлы»

Стар. 22

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–16

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

Нарыс Кастуся Тарасава

**ПАСЕЧАНАЯ ДЫНАСТЫЯ**

З цыклу «Невядомая гісторыя»

▸ **З НАГОДЫ**

# ТРЭНД КРУГАВОГА РУХУ

**Вольга ХВОІН**



**Цягам апошніх месяцаў працэсы палітычнай лібералізацыі ў Беларусі прытармазіліся, аднак у сферы палітычнай дэмакратызацыі адбыліся змены да лепшага — гаворыцца ў першай справаздачы з серыі сістэматычных штоквартальных маніторынгаў Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў. Супаставім высновы аналітыкаў з рэчаіснасцю.**

«Праявы патэнцыйнай лібералізацыі альбо яе дэклараваныя намеры ў такіх сферах, як свабода слова (спрошчаны парадак рэгістрацыі газет па новым законе і заяўленая адмова ад абмежавання свабоды ў інтэрнэце) і свабода асацыяцый (разгляд магчымасці адмены крымінальнага артыкула 193-1, спрашчэнне рэгістрацыі НДА), не знайшлі свайго развіцця, а ў шэрагу выпадкаў адбыўся адкат назад або быў агучаны намер узмацніць жорсткасць палітыкі», — канстатуюць эксперты.

Лібералізацыя — гэта працэс, які прадугледжвае накіраванае дзеянне, то бок вектар руху. У выпадку ж Беларусі гэты рух нагадвае вальс — танец па колу. Напрыклад, сітуацыя са СМІ. Пасля вяртання ў сістэму дзяржаўнага распаўсюду некалькіх Non-Governmental выданняў і спрашчэння парадку рэгістрацыі новых СМІ лагічным выглядала чаканне далейшага прагрэсу і развіцця сітуацыі. Аднак праз колькі месяцаў старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна з сумам гаворыць: «Ідзе адкат назад».

Прабіцца хоць нейкім бокам ў сістэму распаўсюду, увайсці ў легальнае поле здолелі дзве грамадска-палітычныя рэгіянальныя газеты. Шэсць газет, сярод якіх і «Новы час», дагэтуль немагчыма набыць ні праз «Белпошту», ні праз «Саюздрук». Затое стабільна прыходзяць адмовы ў рэгістрацыі, а напрыканцы года пасыпаліся яшчэ і папярэджанні СМІ з Мінінфармацыі. Папярэджанне атрымала і «свяшчэнная карова» медыйнай карпарацыі — Беларуская асацыяцыя журналістаў.

Паколькі «трэнд» — гэта тэндэнцыя, пастолькі лагічным наступным крокам выглядае заява першай намесніцы кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталлі Пяткевіч, што «інтэрнэт павінен падлягаць рэгуляванню». І толькі шум вакол гэтага намеру стрымлівае ідэю кіраўніка дзяржавы «спыніць анархію» ў сеціве, хаця грамадскасці ўжо патрапіў на вочы праект прэзідэнцкага ўказа «Аб мерах па ўдасканаленні нацыянальнага сегмента глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт». Трэнд рэгрэсіі прасочваецца выразна.

Другі аспект, які дэмакратычная супольнасць лічыць адным з індыкатараў лібералізацыі, — свабода асацыяцый. У гэтай сферы з тэндэнцыямі таксама ўсё зразумела — буйных і хоць колькі ўплывовых суб'ектаў ніхто рэгістраваць не збіраецца, аргкамітэт партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Асамблея няўрадавых дэмакратычных аб'яднанняў, праваабарончы цэнтр «Вясна» ды іншыя могуць складаць сабе план аббівання парогаў Мінюсту і судоў, але станоўчага выніку трэнд не абяцае.

У якасці стрымліваючага бар'еру застаецца ў сіле (і застанецца надалей) артыкул Крымінальнага кодэкса 193-1, і ніякія дзяды марозы з зайцамі з усёй сваёй крэатыўнасцю і адвагай не змогуць пераламіць лінію дзяржаўнай палітыкі знутры. Так склалася, што да якіх-кольвек пазітыўных пераменаў у «чырвоным доме» прыходзяць толькі пад ціскам знешніх фактараў. Унутраныя інтарэсы фактычна не разглядаюцца.

«Тым не менш, у галіне палітычнай дэмакратызацыі адбыліся змены да лепшага. Асноўнай падзеяй стала прыняцце парламентам паправак у Выбарчы кодэкс», — гаворыцца ў справаздачы Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў. Пад палітычнай дэмакратызацыяй аўтары дакумента разумеюць працэс de jure і de facto паляпшэнні ў сферы справаздачнасці ўлады (як гарызантальнай, так і вертыкальнай).

З de jure можна пагадзіцца, хаця з вялікай агаворкай, бо доступу да кантролю за падлікам галасоў — да важнейшага элементу празрыстасці выбарчага працэсу — па-ранейшаму няма. А вось de facto ўжо цяпер (мясцовыя выбары толькі ў красавіку) з'яўляюцца прэцэдэнты абкатанай не за адзін год практыкі правядзення электаральных кампаній: ціск на сем'і рэгіянальных актывістаў, скандал з настаўнікамі, якім прымусова загадалі пакінуць шэрагі іх палітычных партый, тэрміновы прызыў у войска (зімовы прызыў, да слова, ужо завяршыўся) мастоўскага актывіста, якога вылучылі ў склад Гродзенскай абласной выбарчай камісіі.

Перамены ў сферы культуры, у супрацьвагу грамадска-палітычнай, эксперты ацэньваюць як найбольш пазітыўныя. «Асноўнай тэндэнцыяй апошняга квартала 2009 года стала паглыбленне «карэкціровачнай» беларусізацыі і еўрапеізацыі культурнай палітыкі ўладаў». У якасці прыкладаў прыводзяцца факты «рэабілітацыя беларускай мовы ў сродках масавай інфармацыі», «фактычнае заахвочванне грамадзян падчас перапісу сцвярджаць сваю беларускую ідэнтычнасць», «падтрымка беларускімі ўладамі грамадскай кампаніі па прапагандзе транслітэрнай назвы дзяржавы «Беларусь» у замежных мовах».

«Гэтыя крокі спрыялі таму, што грамадзянская супольнасць атрымала вялікую свабоду ў вытворчасці культурных прадуктаў, якія спрыяюць «беларусізацыі» і «еўрапеізацыі» грамадскай свядомасці — дастаткова ўспомніць аб кампаніі «Будзьма», якая сутыкалася толькі з абмежаваным супрацівам з боку дзяржаўных органаў», — адзначаюць аналітыкі.

Сфера культуры — сапраўды адзіная прастора, у якой за пятнаццаць год так ці інакш атрымліваецца рэалізоўваць недзяржаўныя праекты без татальнага кантролю, хаця і не без перашкодаў з боку ўлады. Тут варта нагадаць, што летась у манапольнай сістэме тэлебачання фактычна толькі на рэгіянальных каналах былі ўведзеныя беларускамоўныя блокі навінаў, а колькасці беларускамоўных школ і класаў не пабольшала.

Пасля аналізу асноўных тэндэнцый грамадскага жыцця ў чацвёртым квартале 2009 года эксперты прыходзяць да высновы, што «беларускае кіраўніцтва вычэрпвае рэзервуар палітычна бяспечных новаўвядзенняў і набліжаецца да неабходнасці выбару паміж істотнай мадэрнізацыяй сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і культурнай мадэлі або адкатам да рэпрэсіўнай палітыкі характэрнай для сярэдзіны першага дзесяцігоддзя XXI стагоддзя».

Калі прыняць да ўвагі зваротнасць усіх ліберальных навінак і стойкі флёр прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, то, у найлепшым выпадку, можна чакаць хіба што «танцаў па колу».

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### САЛІГОРСК. ВІНАВАТЫЯ НЯСУЦЬ АДКАЗНАСЦЬ

Як паведаміў грамадскасці праваабаронца Валерый Шчукін, некаторыя вінаватыя ў заўчаснай смерці яго калегі Яны Паляковай ужо трымаюць пакаранне. У сакавіку мінулага года Яну абвінавацілі ў паклёпе і асудзілі за скаргу ў пракуратуру на супрацьпраўныя дзеянні ўчастковага капітана Пугачова. Гэта і прывяло дзяўчыну да самагубства. Капітан Пугачоў звольнены з органаў МУС. Пракурора, па патрабаванню якога ў адносінах да Яны Паляковай была распачата несправядлівая крымінальная справа, змясцілі ў следчы ізалятар. І, мяркуючы па часе, праведзеным ім пад вартай, апраўдальнага выраку не будзе.

### БРАСЛАЎ. СМЕЦЯЦЬ, СМЕЦЯЦЬ, СМЕЦЯЦЬ

Як паведаміла раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у мінулым годзе за ўтварэнне несанкцыянаваных звалак бытавога смецця было прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці 42 чалавекі. Як лічаць супрацоўнікі гэтай установы, віной усяму — нізкая культура паводзін насельніцтва. Такія звалкі ўтвараюцца стыхійна, і спыніць іх з'яўленне вельмі цяжка. Прыкра яшчэ тое, што яны звычайна знаходзяцца навідавоку. Так, нядаўна была ліквідавана звалка непадалёку ад былога аэрадрома, акурат ля шашы, якая вядзе да гары Маяк і асноўнай групы азёраў, што з'яўляюцца гонарам краю. Прыродаахоўная арганізацыя плануе і надалей праводзіць адносна асобаў, што засмечваюць навакolle, карныя мерапрыемствы.

### ШАРКАЎШЧЫНА. ШТО БУДЗЕ З РАЁНАМ?

Гэты раён ужо рэарганізоўвалі двойчы. Мясцовы праваабаронца Сафія Табола лічыць, што калі такое адбудзецца ў трэці раз, то раён як адміністрацыйная адзінка будзе ліквідаваны ўвогуле. Па гэтым пытанні яна не адзін год вядзе перапіску з чыноўнікамі розных рангаў, аднак канкрэтнага адказу не атрымала. Тым не менш падобныя чуткі існуюць і працягваюць хваляваць местачкоўцаў, бо ў такім выпадку гарадскі пасёлак ператворыцца ў глухое, забытае ўсімі паселішча.

### МІЛАШЭВІЧЫ. ЛЯМПАЧКІ ДА ЛЯМПАЧКІ

Жыхары вёскі Мілашэвічы Лельчыцкага раёна звярнуліся ў райвыканкам са скаргай на адсутнасць асвятлення на вуліцы Савецкай. Неўзабаве атрымалі адказ, што «будзе выканана ўстаноўка прыбораў вулічнага асвятлення пры выдзяленні грашовых сродкаў з Гомельскага абласнога бюджэту ў 2010 годзе». Такі адказ здзівіў вяскоўцаў, бо прыборы вулічнага асвятлення ёсць і неабходна замяніць толькі перагарэўшыя лямпачкі. Каб не блукаць у цемры, адзін жыхар набыў лямпачку, а электрыкі ўстанавілі яе. Чыноўнікі адрэагавалі на падобнае самаўпраўства неадкладна. Для навядзення парадку ў вёску прыехала сама старшыня сельсавета Галіна Гаўрылавец. У вёсцы зноў паўстала цемра.

### ТАЛАЧЫН. ГРАМАДСКАСЦЬ СУДЗІЦЬ МІРНЫ АТАМ

Талачын, Орша, Віцебск, Барысаў, Мінск. Такі маршрут спланаванага грамадзянскай кампаніяй «Наш дом» грамадскага суда над ядзернай энергетыкай. Галоўныя фігуранты «працэсу» — у мінулым старэйшых афіцэры савецкага войска. Праваабаронца Валерый Шчукін будзе падтрымліваць дзяржаўнае абвінавачванне, а яго апанентам выступіць Мікалай Петрушэнка. Іх дуэль па абутку вайскоўцаў будзе нагадваць жарт тых жа савецкіх часоў: супрацьстаянне «чаравіка» і «бота».

Мэта акцыі — звярнуць увагу грамадскасці на звязаныя з пабудовай АЭС на Беларусі праблемы.

### ЛІДА. «ДАЖЫНКІ» ПАСКОРЫЛІ

Чарговае рэспубліканскае свята «Дажынкі–2010» пройдзе ў Лідзе і раёне восенню. Аднак ужо створаны штаб і штодня праводзяцца пасяджэнні. Складзены план пабудовы новых і рэканструкцыі гістарычных аб'ектаў. У план занесена адкрыццё музея паэта Валянціна Таўлая.

Рэканструкцыя будынка, дзе з восені 1939 па лета 1940 года жыў творца, вядзецца ўжо пэўны час. У тыя гады дом быў драўляны, потым абкладзены цэглай. Зараз фасад будынка, каб мець прыстойны выгляд, атынкованы, а ўнутраныя сцены абшыты гіпсакардонам. Аднак інтэр'ер застаўся тым жа. Пакуль не зроблена металічная вінтавая лесвіца на другі паверх, якая паўстане замест былой, драўлянай.

### ВІЦЕБСК. СМАКАТА ДЫ І ТОЛЬКІ

Мясцовыя грамадскія актывісты працягваюць асваенне «Кухняў свету», чым радуюць сябе і гледачоў. Дэгустацыя арыгінальных блюдаў прайшла тут некалькі дзён таму. Стравы былі самыя разнастайныя. Прыкладам, Аляксандр Карнышоў прэзентаваў «Рулецікі па-нямецку», Марына Якаўлева прадставіла «Рулецікі па-польску», Раман Зінько згатаваў пюрэ з бульбы па-французску, Святлана Зінько — страву ўзбекскай кухні «Гюльчэхра», а Наталля Чумакова — эстонскі рулет «Райская асалода». Якасць страў ацэньвала журы і прыйшло аднагалосна да высновы: усё было неверагодна смачна і вельмі прыгожа.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ФОРУМ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

**У Брусэлі адбылося першае пасяджэнне Каардынацыйнага камітэта Форума грамадзянскай супольнасці праграмы «Усходняе партнёрства». На мерапрыемстве з Беларусі прысутнічалі кіраўнік Рабочай групы Асамблеі НДА і кіраўнік няўрадавай арганізацыі «Кансорцыум «ЕўраБеларусь».**

Сябры Каардынацыйнага камітэту абмеркавалі шляхі павелічэння ўплыву грамадзянскіх супольнасцяў краін-удзельніцаў на праграму «Усходняе партнёрства». Пра гэта паведаміў афіцыйны спікер Форума Сяргей Мацкевіч.

Паводле яго слоў, падчас першага пасяджэння Каардынацыйнага камітэту ўдзельнікі абмяркоўвалі, якім чынам стаць больш уплывовымі ў праграме «Усходняе партнёрства». Як вядома, на дадзены момант ва «Усходнім партнёрстве» ўсё вырашаюць урады краін-удзельніц і Еўракамісія. Каб рабіць больш ўнёсак у праграму, было вырашана распачаць працу па тэматычных пляцоўках. У прыватнасці, у бліжэйшы час мусіць быць падрыхтаваны маніторынг «Усходняга партнёрства», працягнецца інфармацыйная праца, а таксама плануецца правядзенне пілотных праектаў па супрацоўніцтву паміж грамадскімі арганізацыямі і экспертамі. Акрамя таго, сябры Каардынацыйнага камітэта мусяць распрацаваць празрыстыя механізмы ўдзелу ў Форуме грамадзянскай супольнасці. Сяргей Мацкевіч збіраецца прыняць удзел у падрыхтоўцы наступнага Форуму.

Чарговае пасяджэнне адбудзецца ў канцы сакавіка ў Кіеве. Да пачатку Форума, які пройдзе восеннюю гэтага года, мусяць быць зладжаныя тры пасяджэнні.

Нагадаем, Каардынацыйны камітэт з 17 чалавек быў створаны падчас Форуму грамадзянскай супольнасці краін-удзельніц «Усходняга партнёрства» ў лістападзе мінулага года. Паводле задумы, Каардынацыйны камітэт мусіць весці інфармацыйную і камунікацыйную працу, маніторынг развіцця сітуацыі.

**Паводле прэс-рэлізу Асамблеі НДА**

ПАЛІТЫКА

## РУХ «ЗА СВАБОДУ» ВЫЙШАЎ З АДС

**«За Свабоду» заявіў пра афіцыйнае спыненне свайго ўдзелу ў кааліцыі Аб'яднаных дэмакратычных сіл (АДС).**

Паводле слоў намесніка старшыні руху Юрыя Губарэвіча, рада руху «За Свабоду» прыняла рашэнне пра выхад з АДС яшчэ ў пачатку лістапада 2009 года. Заява пра выхад была даслана Лябедзьку па факсе 25 студзеня. «Наша заява — гэта рэакцыя на заяву Лябедзькі пра тое, што рух «За Свабоду» афіцыйна не выйшаў з АДС, але не бярэ ў працы кааліцыі ніякага ўдзелу. Прычым мы выслалі ліст Лябедзьку як лідэру Аб'яднанай грамадзянскай партыі, а не як сустаршыні АДС, бо мы, як і Партыя БНФ, лічым, што АДС на сённяшні дэ-факта спынілі сваё існаванне», — адзначыў Губарэвіч.

Анатоль Лябедзька заявіў, што лічыць такія заявы «несур'ёзнымі». «Ліст напісаў адзін намеснік, заўтра другі намеснік скажа адваротнае. Калі арганізацыя бярэ ўдзел у дзейнасці АДС ці афіцыйна выходзіць з гэтай дзейнасці — павінна быць адпаведнае рашэнне арганізацыі. Гэта значыць, павінен быць сход, павінна быць рашэнне, аформленае пратаколам. Нам падаецца выпіска з пратакола — і арганізацыя больш не з'яўляецца членам АДС. Гэта элементарныя рэчы. Аднак ніякага рашэння, пацверджанага дакументамі, мы не атрымлівалі, і сябар сойму Партыі БНФ Вінцук Вячорка бярэ ўдзел у працы палітсавета АДС», — адзначыў Лябедзька.

**Паводле БелаПАН**

ГРОШЫ

## БЮДЖЭТ ПАМЕНШАНЫ

**Іван БАРЫСАЎ**

**На нядаўняй сесіі Круглянскага раённага Савета дэпутатаў зацверджаны бюджэт раёна на 2010 год.**

Даходы раёна прагназуюцца ў памеры 31,5 млрд. рублёў і памяншаюцца ў параўнанні з выкананнем 2009 года на 1,8 млрд. рублёў (94,6 %). Разліковыя пакэзчыкі на 2010 год па расходах у Круглянскім раёне вызначаны ў агульнай суме 28,2 млн. рублёў, альбо 78,5 працэнта ад выканання 2009 года.

Як бачна з прыведзеных вышэй лічбаў, бюджэт Круглянскага раёна па расходнай частцы вельмі значна ўрэзаны, уведзены цвёрдыя бюджэтныя абмежаванні на выкананне важных сацыяльных праграм.

Вялікае пытанне, ці будзе выкананы і гэты, значна ўрэзаны, бюджэт на 2010 год. У мінулым 2009 годзе, у сувязі з невыкананнем даходаў агульнарэспубліканскага бюджэту, Круглянскаму раёну была зменшана датацыя на 7,2 млрд. рублёў. Гэта прывяло да таго, што шэраг прадугледжаных расходаў было недафінансавана і, адпаведна, да рэзкага росту крэдыторскай запазычанасці бюджэтных арганізацый Круглянскага раёна за выкананыя работы, аказаныя паслугі і атрыманыя таварна-матэрыяльныя каштоўнасці на суму каля двух мільярдаў рублёў.

Уласныя даходы Круглянскага раёна ў 2009 годзе склалі 11,2 млрд. рублёў, раён выжывае толькі за кошт датацый з абласнога і рэспубліканскага бюджэту.

Нягледзячы на гэта, сярэдняя заработная плата ў Круглянскім раёне за 11 месяцаў 2009 года склала 879,9 тыс. Па памеры сярэдняга заробку раён займае першае месца сярод сельскіх раёнаў Магілёўскай вобласці.

ДАТА

## ПАМЯЦЬ ХАЛАКОСТУ

**27 студзеня 1945 года быў вызвалены буйнейшы нацысцкі лагер смерці Асвенцым. Паводле пастановы Генеральнай Асамблеі ААН гэты дзень штогод адзначаецца як Міжнародны дзень памяці ахвяраў Халакосту.**

Сваю трагедыю Халакосту перажыла і Беларусь: на яе тэрыторыі ў гады другой сусветнай вайны нацысты знішчылі 805 тысяч габрэяў, у тым ліку 90 тысяч, дэпартаваных з Аўстрыі, Германіі, Нідэрландаў, Венгрыі, Польшчы, Чэхіі і Францыі. У Мінску знаходзілася адно з самых буйных гета на тэрыторыі Еўропы.

У памяць ахвяраў Халакосту прадстаўніцтва Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі і грамадскае аб'яднанне «Рэспубліканскі фонд «Халакост» 27 студзеня ў Палацы культуры ветэранаў зладзілі жалобную імпрэзу, на якой адбылася і прэзентацыя кнігі былога вязня Мінскага гета Валянціна Скоблы «На ацалелым чоўне».

У сталіцы да помнікаў ахвярам мінскага гета на вуліцы Сухой, а таксама да мемарыялу «Яма» былі ўскладзены кветкі.

У гэты дзень у Берліне ў вялікай выставачнай зале побач з Бундэстагам адкрылася фотавыстава заслужанага архітэктара Беларусі, старшыні Саюза беларускіх габрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын Леаніда Левіна «Халакост: погляд праз 65 гадоў».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# БЕЛАРУСІ НЕ ХАПАЕ ЗМЕНАЎ

*Сяргей САЛАЎЁЎ*




**Была такая показка падчас нафтагазавай вайны Расіі з Украінай: Цімашэнка прапанавала пастаўляць ва Украіну туркменскі газ у абыход Расіі. У адказ Пуцін прыслаў ёй мапу кантынента з адным пытаннем: «Як?» Здаецца, тое ж самае зараз адбываецца з Беларуссю.**

Два дні цягнуўся афіцыйны візіт у Беларусь прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава. Як паведамляюць СМІ, у першы дзень афіцыйнага візіту ў Беларусь прэзідэнта Туркменістана падпісаны шэраг дакументаў аб супрацоўніцтве. Так, паводле вынікаў перамоў Лукашэнка і Бердымухамедаў прынялі сумеснае камюніке, у якім «пацвердзілі ўзаемную зацікаўленасць ва ўсямерным умацаванні раўнапраўных і ўзаемавыгадных адносінаў паміж Беларуссю і Туркменістанам». Пацверджана зацікаўленасць у «далейшым павелічэнні ўзаемных пастаак шырокай наменклатуры тавараў».

Кіраўнікі дзвюх дзяржаў падпісалі таксама пагадненне пра гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва ў сферы паставак беларускай сельскагаспадарчай, аўтамабільнай тэхнікі і гарадскога транспарту. А ўрады Беларусі і Туркменістана падпісалі дакументы пра ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва, стварэнне міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве, шэраг іншых пагадненняў.

Невядома, канешне, ці ішла размова пра газ і нафту. З аднаго боку, не магла не ісці, а з іншага — такі транзіт нафты праз Расію нам уляціць у капейчыну, і немалую капейчыну.

Больш насцярожвае падпісанне дакументаў пра ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. Таму што раней Беларусь падпісала дамову пра калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання. А побач з Туркменістанам — такая «парахавая бочка», як Афганістан, і працягласць мяжы паміж дзвюма дзяржавамі немаленькая. Як бы нам гэта ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва бокам не вылезла...

Але ж па нафце такі дамовіліся. Беларусь і Расія падпісалі пакет дакументаў аб пастаўках сырой нафты. Пра гэта віцэ-прэм'ер РФ Ігар Сечын праінфармаваў 27 студзеня прэзідэнта краіны Дзмітрыя Мядзведзева. «Сёння падпісаны цэлы пакет дакументаў. Гэта змяненні да пагаднення па пастаўках сырой нафты ў Беларусь, методыка тарыфаўтварэння на продаж нафты, баланс нафтавай сыравіны на 2010 год, сумесная заява віцэ-прэм'ераў дзвюх краін аб гарантыях беспеработнага транзіту», — цытуе Сечына «РИА Новости».

Сечын запэўніў Мядзведзева, што ў перамовах з Беларуссю ў апошнія два месяцы Расія зыходзіла з прапаноў, сфармуляваных прэзідэнтам РФ у лісце Аляксандру Лукашэнку ў адказ на яго ліст. У перамовах расійскі бок «зыходзіў з інтарэсаў расійскіх прадпрыемстваў», заявіў віцэ-прэм'ер. «Наша прапанова была запакетавана са стабілізацыяй тарыфу на пампаванне нафты спажыўцам у Заходняй Еўропе», — дадаў ён.

Сямашку трэба рыхтаваць «асіметрычны адказ Расіі». Прыкладам, калі мы «кватуем» нафту, то і скасуем ранейшыя дамоўленасці на аўтамабілі. Нагадаем, з 1 студзеня 2010 года дзейнічаюць новыя правілы ўвозу транспартных сродкаў у Беларусь юрыдычнымі асобамі. Змена правіл увозу аўтамабіляў фізічнымі асобамі чакаецца 1 ліпеня 2010 года, калі ў поўным аб'ёме запрацуе Мытны саюз Беларусі, Казахстана і Расіі. Плануецца, што ўвазныя пошліны ў Беларусі вырастуць да ўзроўню расійскіх. Чаму б не «кватаваць» і гэтую частку Мытнага саюза?

**Сечын запэўніў Мядзведзева, што ў перамовах з Беларуссю Расія зыходзіла з прапаноў, сфармуляваных прэзідэнтам**

Беларускі бок мае на гэта свой пункт гледжання. «Пагадненне ў сённяшнім стане не можа доўга жыць, — лічыць намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка. — Гэта нонсенс, што ў межах Мытнага саюза мы кватуем: колькі бяспошлінна, а колькі з пошлінамі. Сама па сабе пошліна не павінна быць. Мы мусім вярнуцца да гэтага пытання, і я ўпэўнены, што будуць істотныя, радыкальныя змены», — заявіў Сямашка.

Адзінае пытанне: нашто нам такі саюз?

На тыдні правалілася і знешняя палітыка, прычым, са, здавалася б, надзейным саюзнікам і партнёрам. Колькі было шуму вакол мінулагодняй вандроўкі Аляксандра Лукашэнкі ў Літву! Не куды-небудзь, а ў краіну Еўразвязу, якую раней бэсцілі па дзяржаўным тэлебачанні нібыта за падтрымку беларускай апазіцыі! А зараз — на табе! Прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ дала зразумець, што запрашэнне Аляксандра Лукашэнкі на святкаванне 20-годдзя аднаўлення незалежнасці Літвы (11 сакавіка) можа залежаць ад яго крокаў у справе Уладзіміра Усхопчыка.

«Як ужо ўзгадвала, цяпер мы вядзем перамовы з Беларуссю, спрабуем пачуць, якімі будуць крокі ў супрацоўніцтве, што тычацца справы Усхопчыка», — адказала 26 студзеня прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ на пытанне журналістаў адносна яе рашэння аб запрашэнні Лукашэнкі.

Літоўскія праваахоўныя органы падазраюць Уладзіміра Усхопчыка ў тым, што 13 студзеня 1991 года ён даў загад страляць па бяззбройных людзях. МЗС Літвы ўручыла Беларусі ноту ў сувязі з тым, што Генпракуратура адмовілася аказаць дапамогу суседняй краіне ў расследаванні справы 13 студзеня.

І яшчэ з адным пытаннем беларускія ўлады марудзяць. Ужо колькі разоў адказныя асобы выказваліся пра магчымасць адмены смяротнага пакарання, але ані кроку ў гэтым накірунку зроблена не было. Зараз чарговы спіч з гэтай нагоды выдаў генпракурор Беларусі Пётр Міклашэвіч. Паводле яго слоў, у пытанні ўвядзення мараторыя на смяротную кару адсутнічаюць канстытуцыйна-прававыя перашкоды.

Міклашэвіч таксама нагадаў, што ў 2004 годзе Канстытуцыйны суд даў заключэнне аб неабходнасці правядзення рэферэндуму для адмены смяротнай кары. «Калі ў Беларусі будзе ўзнята пытанне адмены смяротнай кары, то, магчыма, нам зноў давядзецца выказваць сваё меркаванне па ўліку канстытуцыйна-прававых аспектаў пры прыняцці гэтага рашэння», — сказаў старшыня Канстытуцыйнага суда.

А пакуль Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, у якой дагэтуль прымяняецца смяротная кара. У чэрвені 2009 года Парламенцкая асамблея Савета Еўропы прыняла рэзалюцыю пра вяртанне Беларусі статусу спецыяльнага запрошанага ў асамблеі пры ўмове ўвядзення ў рэспубліцы мараторыя на смяротную кару. Да ўвядзення мараторыя таксама заклікае Еўрасаюз. Гэта адна з умоў адмены візавых санкцый у дачыненні да беларускіх чыноўнікаў, якія ЕС прадоўжыў да кастрычніка 2010 года.

Ці зменіцца нешта пасля чарговай заявы? Наўрад ці...

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



Фота Юрыя Дзядзінкіна

### АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ

Былы намеснік старшыні партыі БНФ, а цяпер беспартыйны палітык Алесь Міхалевіч афіцыйна паведаміў, што будзе балатавацца ў прэзідэнты на выбарах 2011 года. У прэзідэнцкую кампанію Міхалевіч ідзе як беспартыйны палітык, але з вялікай і дасведчанай, па яго словах, камандай. Самапрэзентацыю журналістам будучы кандыдат у прэзідэнты пачаў са сталічнага планетарыя, а завяршыў у кавярні. Малады і амбітны палітык заявіў, што гатовы стаць галоўным кандыдатам на выбарах ад нацыянальна- дэмакратычных сілаў Беларусі. Канкурэнтам яму пакуль бачыцца толькі Аляксандр Мілінкевіч.

35 гадоў, неабходныя для ўдзелу ў прэзідэнцкай кампаніі ў якасці кандыдата, Алесю Міхалевічу споўніцца ў маі гэтага года. Палітык паходзіць з сям'і навукоўцаў. Па адукацыі — палітолаг. Мае досвед партыйнай, грамадскай працы, быў дэпутатам Пухавіцкага раённага савета. Жанаты, мае дзвюх дачок.

### ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА



Дваццацігадовая беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка выйшла ў чвэрцьфінал адкрытага чэмпіянату Аўстраліі. Праўда, далей прайсці не змагла. У адной восьмай фіналу Азаранка, якая займае сёмае месца ў сусветным рэйтынгу, выйграла матч, працягласцю дзве з паловаю гадзіны, у дзевятай ракеткі свету Веры Званаровай з Расіі. Але ў чвэрцьфінале Вікторыя саступіла першай ракетцы планеты амерыканцы Серэне Уільямс. «Думаю, я добра гуляла. Мы абедзве паказалі высокі клас гульні, але што зробіш? У мяне былі шанцы, я імі не скарысталася, так што... — пракаментавала паядынак спартсменка. — Я спрабавала быць больш агрэсіўнай, але, пэўна, стала даваць ёй больш часу на ўдары. Я не памяняла гульню і не тое што шмат памылялася. Проста трэба было быць больш агрэсіўнай». Разам з тым Вікторыя задаволеная, што дайшла да чвэрцьфіналу, і лічыць свой выступ у турніры добрым пачаткам сезону. Турнір на кортах Мельбурна завершыцца ў нядзелю, 31 студзеня.

У 2005 годзе Азаранка выйграла адкрыты чэмпіянат Аўстраліі і адкрыты чэмпіянат ЗША ў юніёрскім разрадзе і была названая ITF Чэмпіёнкай свету года сярод юніёрак. Яна стала першай з Беларусі, хто дамогся гэтага звання. У скарбонцы перамог Вікторыі — турніры Вялікага шлема — Адкрытага чэмпіянату ЗША 2007 года (у пары з Максімам Мірным) і Адкрытага чэмпіянату Францыі 2008 года (у пары з Бобам Браянам).

### ТЭРЭЗА СОБАЛЬ



У Івянцы разгортваецца скандал вакол асобы старшыні мясцовага аддзялення Саюза палякаў Беларусі — Тэрэзы Собаль. Актывістку непрызнанага ўладамі Саюза палякаў вінавацяць у злоўжыванні, сутнасць якога ў тым, што ў 2004 годзе па загадзе тагачаснага кіраўніка Саюза палякаў Тадэвуша Кручкоўскага Дом польскі ў Івянцы атрымаў матэрыяльную дапамогу. Нягледзячы на тое, што тэрмін даўнасці ўжо мінуў, была заведзеная крымінальная справа ў дачыненні да Тэрэзы Собаль. Жанчыну, якой ідзе сёмы дзесятак гадоў, цяпер выклікаюць на допыты, ёй забаранілі выезд з Беларусі на час правядзення следчых дзеянняў па крымінальнай справе, а таксама ўзялі адбіткі пальцаў.

Саюз палякаў Беларусі лічыць паводзіны ўладаў правакацыяй і ўпэўнены, што такім чынам яны хочуць паставіць на пасаду мясцовай арганізацыі СПБ лаяльнага ім чалавека.

26 студзеня паслу Польшчы ў Беларусі Генрыху Літвіну была ўручаная нота МЗС Беларусі за тое, што дзеянні супрацоўнікаў пасольства «не адпавядаюць базавым міжнародна-прававым дакументам, якія рэгламентуюць дзеянні замежных дыпламатаў у краінах акрэдытацыі». Інцыдэнт можа быць звязаны з падзеямі ў Івянцы, куды прыязджаў прадстаўнік польскага пасольства падтрымаць Тэрэзу Собаль.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# АДКУЛЬ СТОЛЬКІ ПАЗІТЫВУ?

Сяргей НІКАЛЮК

**Усе мы па прыродзе сваёй канструктары. Мы канструюем не толькі плот на лецішчы, мы канструюем сацыяльную рэальнасць. У кожнага яна свая: у токара і ў дырэктара прадпрыемства, у апазіцыі і ва ўлады.**



Інфармацыйна-аналітычны цэнтр (ІАЦ) пры Адміністрацыі прэзідэнта апублікаваў вынікі чарговага апытання. Калі іх падсумаваць, то сярэднестатыстычнага беларуса ў канцы 2009 года можна прадставіць як «чалавека задаволенага». Ён задаволены практычна ўсім: сваім матэрыяльным становішчам, сацыяльнай стабільнасцю і курсам, якім краіну вядзе ўлада. Працытую «Советскую Белоруссию»: «Адкуль столькі пазітыву? Нас цікавіць ацэнка людзьмі курсу, па якім ідзе развіццё краіны. За год колькасць рэспандэнтаў, якія лічаць яго правільным, вырасла з 68,5 да 73,8 працэнта». Цікавае пытанне, але адказ на яго відавочны. ІАЦ функцыянуе пад дахам Адміністрацыі прэзідэнта. Адтуль і пазітыў.

Строга кажучы, абмяркоўваць вынікі сацыялагічных апытанняў, не пабачыўшы поўнай анкеты, некарэктна. У гэтай справе дробязяў не бывае. Варта толькі нязначна змяніць фармулёўку пытання або прапанаваць крыху іншы пералік адказаў — і весці гаворку пра супастаўнасць вынікаў ужо не даводзіцца. Канкрэтны прыклад. Сацыёлагі НІСЭПД рэгулярна вымяраюць рэйтынгі даверу да дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў. У 2009 годзе ў адным з апытанняў вызначэнне «недзяржаўныя СМІ» было заменена на «незалежныя СМІ». Розніца, здавалася б, неістотная, але шматгадовы трэнд тут жа «зламаўся».

Аднак вернемся да пытання наконт курсу: 73,8% рэспандэнтаў яго ўхваляюць, супернікаў жа курсу істотна менш — 17,2%, а 9% не здолелі адказаць. А зараз, увага, пытанне: якая з трох лічбаў выклікае найбольшае здзіўленне? Правільны адказ — апошняя. Уся справа ў тым, што пытанне пра палітычны курс, які рэалізуецца ўладай, для грамадскай думкі досыць складанае. Пры адказах на пытанні падобнага ўзроўню складанасці колькасць рэспандэнтаў, якія не здолелі адказаць, як правіла, значна большая, што і дэманструе запазычаная з сайта НІСЭПД табліца 1.

Яшчэ адна цытата з «СБ»: «Даследаванне паказала, што колькасць грамадзян, якіх задавальняе жыццё, на працягу года застаецца стабільна высокай». Магчыма, паводле апытанняў ІАЦ, справа менавіта так і выглядае. Аднак, паводле дадзеных НІСЭПД, 2009 год увойдзе ў гісторыю як год рэкордных перападаў настрояў беларусаў.

## З жыцця індэксаў

Дынаміку сацыяльных настрояў прасцей за ўсё адсочваць пры дапамозе індэксаў. Палохацца гэтага слова не трэба. Тут усё максімальна проста. Калі адказ на пытанне прадугледжвае сцвярджальны і адмоўны варыянты, то іх розніцу і прынята называць індэксам.

Звернемся зноў да табліцы 1. Розніца паміж першым і другім радком і дае нам індэкс правільнасці курсу (ІПК). У год трэціх прэзідэнцкіх выбараў ён, зразумела, быў максімальным. І гэта натуральна. Таму што, паводле народнай прыкметы, менавіта на такія гады ў Беларусі прыходзіцца пік раздачы сацыяльных выплат і падвышаная актыўнасць дзяржаўных СМІ.

Выбары прайшлі — ІПК знізіўся. У канцы 2008 года ў рэспубліку прыйшоў крызіс. Як і варта было чакаць ад індэкса, які хоць крыху сябе паважае, ІПК на крызіс адказаў падзеннем, якое ў сакавіку 2009 года дасягнула дна. Да лета першапачатковы спалох пачаў «рассмоктвацца». Беларусы адаптаваліся да жыцця ў новых умовах, звыклым рухам зацягнулі тужэй паясы, і колькасць расчараваных у правільнасці курсу пачала зніжацца.

Тут патрэбна аўтарская рэмарка. Асноўны ўклад у дынаміку ІПК уносяць не супернікі курсу, колькасць якіх досыць стабільная, а яго прыхільнікі. Чаму так адбываецца? Адказ на гэта пытанне не з'яўляецца таямніцай. Прыхільнікамі курсу, які пракладае Лукашэнка, з'яўляюцца ў асноўным перыферыйныя сацыяльныя групы (старыя людзі, асобы з нізкім узроўнем адукацыі, жыхары сельскай мясцовасці і малых гарадоў), г. зн. тыя, хто без дзяржаўнай апекі выжыць у сучасных умовах не ў стане. У такіх асобаў адсутнічаюць уласныя рэсурсы, таму яны лёгка паддаюцца паніцы пры атрыманні першай негатыўнай інфармацыі. Як гэта адбываецца, мы памятаем на прыкладзе Нязнайкі, у якога ўрэзаўся хрушч. Ён вырашыў, што адарваўся кавалак сонца, залямантаваў: «Браткі, ратуйся. Кавалак ляціць!», кінуўся ў Кветкавы горад і перапалохаў пры гэтым усіх яго жыхароў. А вось уявіць, каб у падобнай сітуацыі аналагічным чынам паводзіў бы сябе Знайка, даволі складана.

Дынаміка індэкса матэрыяльнага становішча (ІМС) і індэкса чаканняў (ІЧ) за апошнія паўтара гады падобная да дынамікі ІПК (табліцы 2–3). Вось толькі амплітуда змяненняў у іх значна вышэйшая. У гэтым ёсць свая логіка. Яны больш прыземленыя, яны «ад жыцця». Гэта ж не абстрактныя развагі пра курс развіцця краіны!

Як маглі спецыялісты ІАЦ не заўважыць такіх істотных ваганняў сацыяльных індэксаў, для мяне застаецца загадкай, тым больш што аналагічныя працэсы ішлі ва ўсіх сумежных краінах. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова было падлучыцца да інтэрнэту і зайсці на адпаведныя сайты. Паводле снежаньскага апытання НІСЭПД, 41,4% беларусаў з той або іншай ступенню рэгулярнасці карыстаюцца інтэрнэтам, не карыстаюцца — 51,1% і толькі 7,5% не ведаюць, што гэта такое. Цікава, да якой з трох груп належаць сацыёлагі ІАЦ?

## Аўтамабіль — не раскоша…

У сакавіку 2009 года ІМС ушчыльную наблізіўся да гістарычнага мінімуму, які быў зафіксаваны ў далёкім 1994 годзе. Тады ў краіне адбылася «народная рэвалюцыя», а прадстаўнік савецкай наменклатуры прэм'ер-міністр Кебіч учыстую прайграў прэзідэнцкія выбары. Паніжэнне індэксаў да адмоўных значэнняў сведчыла пра тое, што эканамічны крызіс пераходзіць у сацыяльны, але пасля сакавіка стрэлка барометра пачала рух да адзнакі «пазітыў».

Адкуль ён (пазітыў) узяўся? Для пошуку адэкватнага адказу вернемся ў Кветкавы горад і паглядзім на яго жыхароў, перапуджаных лямантам Нязнайкі. Калі б мы здолелі правесці сярод жыхароў шэраг паслядоўных сацапытанняў, мы б зафіксавалі падобную дынаміку індэксаў. Пры гэтым на пачатковым этапе панікі больш «жвавым» быў бы індэкс чаканняў (з верасня па снежань ІЧ знізіўся ў Беларусі на 40, ІМС — на 21, а ІПК — усяго толькі на 12 адзінак).

Такое разыходжанне ва ўзроўнях «жвавасці» індэксаў сведчыць пра тое, што негатыў ішоў галоўным чынам не «ад жыцця», а быў згенераваны СМІ. У Кветкавым горадзе ні друкаваных, ні тым больш электронных СМІ не было, таму ўся інфармацыя сярод жыхароў распаўсюджвалася праз чуткі, г. зн. па каналах міжасобасных зносін.

Не варта думаць, што ў нашы дні міжасобасныя зносіны страцілі сваю актуальнасць у якасці носьбіта аўтарытэтнай інфармацыі. У псіхалогіі добра вядомы прынцып сацыяльнага доказу. Прывяду яго ў фармулёўцы амерыканскага псіхолага Роберта Чалдзіні: «Мы вызначаем, што з'яўляецца правільным, высвятляючы, што лічаць правільным іншыя людзі». Няма нічога дзіўнага ў тым, што «іншыя людзі» навакол нас у эканоміцы разбіраюцца на ўзроўні Нязнайкі, адсюль і паніка, зафіксаваная сацыёлагамі НІСЭПД.

Адсутнасць аб'ектыўных паказчыкаў для панікі пацвярджае і афіцыйная эканамічная статыстыка. Можна доўга спрачацца наконт росту ВУП на 0,2% у 2009 годзе, але жыхары беларускіх кветкавых гарадоў і вёсак заліваюць у бакі сваіх аўтамабіляў не ВУП, а бензін. Спажыванне ж бензіну ў мінулым годзе павялічылася на 3,6%. Аўтамабіль, такім чынам, стаў для беларусаў не раскошай, а сродкам перасоўвання!

Як ужо было адзначана, панікуюць у першую чаргу прадстаўнікі перыферыйных сацыяльных груп. Дзівіцца гэтаму не даводзіцца — працэнт нязнаек сярод іх вельмі значны, таму калі мы паглядзім на нашых заходніх суседзяў, то падобнага перападу настрояў не заўважым. Нягледзячы на масавыя акцыі пратэсту, якія то з пэўнай нагоды, то без падстаў (у нашым разуменні) практыкуюцца па Еўропе, узровень сацыяльнай стабільнасці ў «іх» вышэй, чым у «нас». У гэтым заключаецца адзін з парадоксаў дэмакратыі.

## Парадокс кіравання

Па незразумелай для мяне прычыне «СБ» не апублікавала рэйтынг даверу да Лукашэнкі. БЕЛТА ў гэтым сэнсе было больш інфармаваным: «Кіраўніку дзяржавы давяраюць каля 80% беларусаў». Гэта менш, чым знакамітыя 95%, якія, паводле неаднаразовага прызнання ўсё таго ж кіраўніка дзяржавы, ЦВК вымушана была фальсіфікаваць (знізіць да 83,0%).

Адкуль такая афіцыйная цяга да завоблачных паказчыкаў народнай падтрымкі Лукашэнкі? Здавалася б, ёсць большасць, якая патрабуецца па Канстытуцыі, вось і добра. Дык жа не — ад выбараў да выбараў, ад рэферэндуму да рэферэндуму ўзнікаюць лічбы, якія потым не прызнаюцца сусветнай супольнасцю. Краіны СНД не бяруцца ў разлік (як адзначыў адзін расійскі аналітык, СНД — гэта саюз прэзідэнтаў супраць уласных народаў).

Ёсць такое мудрагелістае слова — «сінкрэтызм», у перакладзе з грэчаскай мовы яно азначае «злітнасць, непадзельнасць». Самы вядомы прыклад сінкрэтызму — першабытнае мастацтва, калі скокі, музыка і спеў існавалі ў арганічным адзінстве. Думаю, чытачы ўжо зразумелі, куды я хілю. Феномен улады Лукашэнкі можа існаваць толькі ва ўмовах сацыяльнага сінкрэтызму, калі ўсё грамадства спявае і скача пад музыку, якую выконвае толькі адзін музыка. «У такі момант, — па прызнанні самога музыкі, — з'яўляецца асаблівае адчуванне: мы — адзіная і дружная сям'я».

За магчымасць рэгулярна атрымліваць «адмысловае адчуванне» даводзіцца плаціць актыўнай сацыяльнай палітыкай. Здавалася б, такую палітыку трэба толькі вітаць, але не ўсё так проста. Калі мы лічым, што абіраем роўнасць, на самай справе мы руйнуем адну роўнасць дзеля іншай. Дзяржава не можа дагадзіць усім, таму яна дагаджае адным за кошт іншых. У беларускім варыянце большасці плацяць з грошай меншасці. У дзяржавы — шмат хто пра гэта забывае або не жадае ведаць — няма сваіх грошай, яна здольная толькі пераразмяркоўваць чужыя. Паразмаўляйце з беларускімі прадпрымальнікамі, яны на гэты конт распавядуць вам шмат цікавага.

Але чым больш дзяржава пераразмяркоўвае на карысць большасці, тым больш становіцца яе запыты, тым вышэй яна ацэньвае верагоднасць дапамогі ў будучыні. Дапамога ператвараецца ў своеасаблівы наркотык, пазбавіцца ад якога без страты сацыяльнай стабільнасці зусім не проста. Тут будзе дарэчы прывесці парадаксальную думку сучаснага еўрапейскага філосафа Энтані дэ Ясаі: «Ператварэнню кіраваных у некіраваныя дапамагае кіраванне імі».

**Выбары прайшлі — ІПК знізіўся. У канцы 2008 года ў рэспубліку прыйшоў крызіс. Як і варта было чакаць ад індэкса, які хоць крыху сябе паважае, ІПК на крызіс адказаў падзеннем, якое ў сакавіку 2009 года дасягнула дна**

**ТАБЛІЦА 1.** НА ВАШ ПОГЛЯД, У ЦЭЛЫМ СТАНОВІШЧА РЭЧАЎ У НАШАЙ КРАІНЕ РАЗВІВАЕЦЦА Ў ПРАВІЛЬНЫМ АБО Ў НЯПРАВІЛЬНЫМ НАКІРУНКУ?

| Варыянт адказу | 06’06 | 09’08 | 12’08 | 03’09 | 06’09 | 09’09 | 12’09 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| У правільным | 57 | 53 | 45 | 40 | 48 | 53 | 47 |
| У няправільным | 31 | 30 | 34 | 35 | 34 | 31 | 32 |
| Цяжка адказаць | 12 | 17 | 21 | 25 | 18 | 16 | 21 |
| Індэкс правільнасці курсу (ІПК) | 26 | 23 | 11 | 5 | 14 | 22 | 15 |

**ТАБЛІЦА 2.** ЯК ЗМЯНІЛАСЯ ВАША АСАБІСТАЕ МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА ЗА АПОШНІЯ ТРЫ МЕСЯЦЫ?

| Варыянт адказу | 11’06 | 09’08 | 12’08 | 03’09 | 06’09 | 09’09 | 12’09 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Палепшылася | 21 | 18 | 9 | 2 | 6 | 11 | 7 |
| Не змянілася | 65 | 59 | 55 | 31 | 57 | 48 | 66 |
| Пагоршылася | 13 | 22 | 34 | 64 | 37 | 37 | 26 |
| Індэкс матэрыяльнага становішча (ІМС) | 8 | –4 | –25 | –62 | –31 | –26 | –19 |

**ТАБЛІЦА 3.** ЯК ЗМЕНІЦЦА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ГАДЫ?

| Варыянт адказу | 11’06 | 09’08 | 12’08 | 03’09 | 06’09 | 09’09 | 12’09 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Палепшыцца | 43 | 34 | 14 | 14 | 28 | 33 | 35 |
| Не зменіцца | 38 | 41 | 35 | 31 | 38 | 35 | 37 |
| Пагоршыцца | 11 | 18 | 38 | 46 | 25 | 21 | 16 |
| Індэкс чаканняў (ІЧ) | 32 | 16 | –24 | –32 | 3 | 12 | 19 |

ЗАКОН

# ВЫКЛЮЧЭННІ З ПРАВІЛАЎ... КАНСТЫТУЦЫЙНЫХ

Вольга ХВОІН

**Канстытуцыя Беларусі мае вяршэнства над усімі законамі і нарматыўна-прававымі актамі і валодае юрыдычнай сілай прамога дзеяння. Аднак нават старшыня Канстытуцыйнага суда Пётр Міклашэвіч прызнае, што на практыцы так адбываецца не заўсёды.**



## Парламент не прыслухаўся

У Канстытуцыйны суд Беларусі перыядычна прыходзяць скаргі ад грамадзян, якія хацелі б прайсці альтэрнатыўную воінскую службу (і, паводле Канстытуцыі, маюць на гэта права), аднак з-за таго, што адпаведнага закона не існуе, прызыўнікі такой магчымасці пазбаўленыя.

Яшчэ ў 2000 годзе КС разглядаў гэта пытанне і прызнаў, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці не толькі з Канстытуцыяй (артыкул 57), але і з Законам «Аб усеагульным воінскім абавязку і ваеннай службе» (артыкулы 1 і 14) маюць права, у прыватнасці, па рэлігійных перакананнях, на замену воінскай службы альтэрнатыўнай. Паводле артыкула 31 Канстытуцыі, кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, персанальна ці сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, выяўляць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам. Гэтыя нормы нацыянальнага заканадаўства суадносяцца з агульнапрызнанымі прынцыпамі і нормамі міжнароднага права, прыярытэт якіх прызнае Рэспубліка Беларусь.

Пасля разгляду запытаў КС прыйшоў да высновы, што грамадзяне краіны на падставе рэлігійных перакананняў не маюць магчымасці на практыцы выканаць свой абавязак па абароне Рэспублікі Беларусь, у тым ліку праз адбыванне альтэрнатыўнай службы. Немагчымасць забяспечыць правы на альтэрнатыўную службу тлумачыцца асобнымі службоўцамі тым, што няма адмысловага закона, гэта прыводзіць да канфліктаў паміж грамадзянамі і дзяржавай. Аднachасова не ўлічваецца той факт, што Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь валодае вяршэнствам і прамым дзеяннем.

Дзесяць гадоў таму КС вырашыў, што, у адпаведнасці з артыкулам 142 Канстытуцыі, законы, указы і іншыя акты, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі да прыняцця Канстытуцыі, прымяняюцца ў частцы, што не супярэчыць Асноўнаму закону. Таму прыцягненне да адказнасці за ўхіленне ад чарговага прызыву на ваенную службу дапускаецца толькі з умовай, калі выкананы патрабаванні вышэйзгаданых нормаў Канстытуцыі па стварэнні дзяржавай умоў для адбывання як воінскай, так і альтэрнатыўнай службы. Аднак перыядычна ўзнікаюць канфлікты паміж ваенкаматамі і прызыўнікамі, і вырашаюцца яны не на карысць апошніх. Адпаведны закон мусіць быць прыняты, што садзейнічала б узмацненню канстытуцыйных гарантый грамадзян. «На жаль, асобныя рашэнні Канстытуцыйнага суда працяглы час не выконваюцца», — зазначыў Міклашэвіч нібыта з няёмкасцю ў голасе.

## «Канстытуцыйны» ператрус

Прынятыя ў снежні мінулага года папраўкі ў закон «Аб аператыўна-вышуковай працы», якія дазваляюць праваахоўным органам праводзіць аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, праслухоўваць тэлефоны, рабіць запіс перамоў і агляд памяшканняў без адпаведнай санкцыі пракурора, на думку старшыні Канстытуцыйнага суда, не супярэчаць Асноўнаму закону Беларусі. «Прамой супярэчнасці канстытуцыйным нормам і палажэнням не мы бачым, — зазначыў Пётр Міклашэвіч. — Мы разглядалі палажэнні закона ў парадку папярэдняга канстытуцыйнага кантролю. 23 артыкул Канстытуцыі дае магчымасць у мэтах нацыянальнай бяспекі, абароны правапарадку і аховы здароўя рабіць пэўныя абмежаванні, адпаведна ў гэтым выпадку было прынята сувымернае абмежаванне ў мэтах узмацнення барацьбы са злачыннасцю».

Аднак Канстытуцыйны суд усё ж прызнаў, што з часам трэба пераходзіць «на больш высокі ўзровень забеспячэння канстытуцыйных правоў і свабодаў грамадзян», і ўвесці норму пра тое, што санкцы на арышт іператрус павінны даваць суды, як тое робіцца ў шэрагу еўрапейскіх краін, а таксама ў Расіі.

Да слова, кіраўнікі МУС, КДБ, Дэпартамента фінансавых расследаванняў і Камітэта дзяржкантролю могуць дазволіць правядзенне аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і заводзіць крымінальныя справы ў дачыненні да пракурораў і суддзяў, а таксама да цэлага шэрагу асобаў са структур улады (напрыклад, дэпутаты ўсіх узроўняў, члены Савета Рэспублікі).

## Не гадзіна суда

У кантэксце нафта-газавамалочных канфліктаў з Расіяй прагучала прапанова стварыць арбітражны суд Саюзнай дзяржавы, які б вырашаў падобныя спрэчныя пытанні. Аднак Пётр Міклашэвіч лічыць, што неабходнасці ў гэтым няма. Старшыня Канстытуцыйнага суда падкрэсліў, што для вырашэння розных гаспадарчых канфліктаў у Мінску існуе Эканамічны суд СНД. «Увогуле, патрэбна будаваць адносіны так, каб не было сітуацый, калі патрэбны суд», — рэзюмаваў Пётр Міклашэвіч.

Што тычыцца суда Саюзнай дзяржавы, стварэнне якога прадугледжана ранейшымі беларуска-расійскімі дамоўленасцямі, дык гаварыць пра гэта рана. Такая інстытуцыя можа быць створана толькі пасля падпісання адпаведнага канстытуцыйнага акта, якім і будзе кіравацца ў сваёй дзейнасці. Да фінішнай прамой гэты працэс за многа гадоў так і не дайшоў, і многія эксперты схіляюцца да думкі, што ніколі і не дойдзе.

ВЯРТАННЕ

# Алесь Каліта: БЕЛАРУСКАЕ ВОЙСКА ТРЭБА ПАЗБАВІЦЬ АД КАНТРАЛЮЮЧАГА БАЛАСТУ

Генадзь КЕСНЕР

**З войска вярнуўся першы лідэр «Моладзі БНФ» Алесь Каліта — дыпламаваны юрыст, адзін з першых моладзевых актывістаў, якіх праваабаронцы назвалі «палітычнымі прызыўнікамі».**



Алесь праходзіў службу ў 29-й зенітра-ракетнай брыгадзе ў вёсцы Межыца Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. 26 студзеня ён распавёў журналістам пра сваю службу, становішча ў беларускім войску, а таксама пра свае планы цяпер ужо ў цывільным жыцці. Пры гэтым тэму «палітычнага прызыву» амаль не кранані — больш увагі Алесь Каліта надаў цяперашняму стану беларускай арміі.

На прэс-канферэнцыю экскіраўнік моладзевага крыла Партыі БНФ прыйшоў у «поўным строі» — шыкоўная вайсковая форма, аздобленая нацыянальнай атрыбутыкай, вельмі да твару Алесю Каліцe, якога да гвалтоўнага прызыву на вайсковую службу (нягледзячы на не адпавядаючы патрабаванням стан здароўя) цяжка было сабе ўявіць у ролі жаўнера.

Алесь Каліта адразу выказаў падзяку ўсім сваім сябрам, якія дасылалі яму лісты ў вайсковую частку не толькі з Беларусі, але і з замежжа, а таксама рэдакцыям незалежных выданняў, якія рэгулярна забяспечвалі яго асобнікамі газет, дзякуючы чаму моладзевы актывіст заўжды быў інфармаваны пра падзеі, што адбываюцца ў краіне.

«Калі хтосьці там, «наверсе», думаў, што служба ў войску мяне выправіць ідэалагічна, то ён вельмі памыляўся, — кажа Алесь Каліта. — Наадварот, войска мяне вельмі ўмацавала, фізічна я сябе адчуваю ў разы мацнейшым, маральна — адпачыўшым, і зараз я гатовы падключыцца да актыўнай палітычнай дзейнасці. Я пакуль не вызначыўся, ці гэта будзе публічная дзейнасць, ці арганізатарская праца ў межах Партыі БНФ, але я дакладна вяртаюся ў актыўную франтаўскую дзейнасць. Зараз я адчуваю сябе больш моцным і трывалым».

Той моладзі, якая пойдзе ў войска, Алесь Каліта пажадаў не баяцца арміі ды імкнуцца скарыстаць тыя год-паўтара, каб удасканаліць сябе, а войска, паводле Алеся, дае такую магчымасць. Па словах былога лідэра «Моладзі БНФ», яго непасрэдныя камандзіры і саслужыўцы паставіліся з разуменнем да яго грамадзянскай пазіцыі, да яго партыйнай прыналежнасці. «Ніякіх перашкодаў пры ўжыванні мною беларускай мовы ці адстойванні нейкіх правоў і палітычных поглядаў не ўзнікала, — адзначыў Алесь Каліта. — З боку камандавання не было спробаў перавыхаваць мяне, таму і я не спрабаваў кагосьці перавыхаваць. Мае камандзіры збольшага былі ў веку 22–35 гадоў, яны разумеюць, што ёсць незалежнасць Беларусі, што мы не частка Расіі, што ў нас ёсць свая гісторыя, таму не было ніякіх праблем. Асноўная задача была — баявая падрыхтоўка, у маім прызыве вялікая ўвага надавалася баявой і мабілізацыйнай падрыхтоўцы».

Тым не менш, адзначыў Алесь Каліта, у сённяшнім беларускім войску ёсць шмат праблем, якія трэба вырашаць. «Неабходна рэфармаванне войска, перад усім трэба ліквідоўваць розныя наглядаючыя і кантрольныя органы, якія не даюць магчымасці звычайным афіцэрам — камандзірам батарэі, начальнікам разлікаў — займацца непасрэдна баявой падрыхтоўкай баявых разлікаў. Сённяшні ўзровень баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці беларускіх салдат адрозніваецца ад таго, які быў у 2003–2004 гадах. Мяне гэта непакоіць, і стала яшчэ больш непакоіць пасля расійска-грузінскага канфлікту, які паказаў, што мы можам таксама стаць той тэрыторыяй, на якую могуць увайсці расійскія войскі».

Па словах Алеся Каліты, ідэалогія ў беларускім войску засталася яшчэ з савецкіх часоў. «Не скажу, што гэта актыўна прапагандуецца, але існуе такая пазіцыя, што NATO — пагроза для Беларусі, і гэта нягледзячы на тое, што ў часопісе «Армія» ёсць некалькі старонак на англійскай мове. Я так разумею, гэта для замежнікаў — такая двайная гульня... Але салдатам даводзіца, што NATO — гэта патэнцыйны вораг, — кажа Алесь Каліта. — І найбліжэйшым часам гэты ідэалагічны складнік не зменіцца, таму што асноўная маса намеснікаў камандзіраў брыгад па ідэалагічнай працы — гэта людзі сталай савецкай загартоўкі, таму і далей у войску будзе прапагандавацца падобнае».

Па словах хлопца, у войску працягвае існаваць «дзедаўшчына»: «Для вялікай часткі моладзі, якая служыць у войску, становіцца зразумелым, што трэба так ці інакш выканаць каманду, толькі тады, калі ім дасі кухталя. 90 адсоткаў моладзі ў войску — гэта тыя, хто не мае ні ліцэйскай, ні тэхнікумаўскай адукацыі. Ім не цікава, хто ў нас у парламенце, яны не ведаюць міністраў, яны ведаюць толькі прэзідэнта, і больш нічога. Ім цікава пасядзець у інтэрнэце «ВКонтакте», завесці новыя знаёмствы, паслухаць музыку».

Сваю далейшую дзейнасць Алесь Каліта збіраецца засяродзіць на пытаннях рэфармавання беларускай арміі, а таксама на праблеме ўвядзення ў Беларусі альтэрнатыўнай службы.

ВЫЖЫВАННЕ

# БОРЦІ ВЯРНУЛІСЯ

**Палессе, магчыма, апошняе месца ў Еўропе, дзе захавалася прымітыўнае пчалярства ў калодах і борцях. Пра асаблівасці працы бортніка распавядае спецыяліст у гэтай галіне Мікалай Гаўрыленка з Лельчыц.**

На Палессі і на бліжэйшых тэрыторыях на старых развесістых дрэвах, пераважна дубах і хвоях, якія растуць на ўзлеску, замацавана вялікая колькасць борцей. Асабліва многа калод у лясах уздоўж рэчкі Убарць (падобна, што назва ракі паходзіць ад слова «борць»), правага прытоку ракі Прыпяць. Іх там не сотні, а тысячы. Гэта адзін з апошніх рэгіёнаў значнага распаўсюду бортніцтва на Беларусі. Калоды тут перадаюцца як спадчына ад бацькоў да дзяцей. Навучанне бортніцтву пачынаецца з дзяцінства. Ідзе перадача так званых тэхнічных навыкаў, прафесійных сакрэтаў, а таксама вядзьмарскіх прыёмаў (замовы, заклінанні). Усё гэта надае бортнікам своеасаблівы арэол, загадкавасць. Тут і прафесійныя складанасці, і небяспечнасць, а таксама закрытасць у справе. Бортнікаў называюць «вавёркамі».

Працяглы час бортніцтва было ў заняпадзе. Аднак другое дыханне гэта справа набыла ў пачатку 1990-х гадоў. Значная частка мясцовага насельніцтва, якое на сабе зведала, што такое эканамічны крызіс, вярнулася да забытага старадаўняга спосабу атрымання такога неабходнага, карыснага прадукту, як мёд.

Побач з пакінутымі і запушчанымі борцямі сталі з'яўляцца новыя.

Майстэрства бортніка заключаецца ва ўменні ўтрымання ў выдзяўбаных калодах некалькіх раёў дзікіх пчол і атрыманні ад іх вельмі смачнага мёду.

Сярэдняя вышыня борці паўтара метра, вага больш за 100 кілаграм. Новай борці даюць час прасушыцца і «выстаяцца» некалькі гадоў. Пчолы не любяць паху свежай драўніны, а павышаная вільготнасць прыводзіць да іх хваробы.

Перад тым, як замацаваць яе на дрэве, гатовую борць уцяпляюць, закрываюць квадратную адтуліну, апрацоўваюць некалькімі спецыяльнымі растворамі, каб не дапусціць разбурэння драўніны, адганяць яе шкоднікаў і заманьваць пчол. З дапамогай своеасаблівага прыстасавання (кола на восі) борць падымаюць на вышыню 5–10 метраў і там уладкоўваюць. Раней іх замацоўвалі на вышыні 15–25 метраў, дзеля таго, каб захаваць ад мядзведзяў і іншых аматараў мёду. Для абароны ад мядзведзяў таксама ставілі палі, самастрэлы і іншыя прыстасаванні. Вельмі эфектыўным сродкам было прывязанае побач з дрэвам бервяно. Мядзведзь, які лез па дрэву да борці, сутыкаўся з бервяном і спрабаваў адпіхнуць яго лапаю, а яно ў сваю чаргу вярталася на месца і ўдарала па мядзведзю. Мядзведзь піхаў яго мацней — бервяно адказвала гэтак жа. Усё гэта заканчвалася тым, што раззлаваная жывёліна адпускала ствол дрэва, каб схапіць бервяно дзвюма лапамі, і падала ўніз.

Зараз ніхто ў гэтых мясцінах чужую калоду ў лесе не ўскрые. За гэта тут жорстка караюць. Распавядаюць, што калі каго застануць на месцы злачынства, прымушаюць скакаць з дрэва. Пры гэтым злодзеі калечацца ці гінуць.

У бортнікаў няма ніякай гарантыі, што ў той ці іншай калодзе паселіцца рой. Бывае, на некаторыя борці пчолы не звяртаюць ніякай увагі, хоць гаспадар змарнаваў на яе шмат часу.

Развіццю бортніцтва на Палессі — і раней, і зараз — спрыяе наяўнасць вялікіх лясных масіваў. Лес з натуральнай зменай пакаленняў дрэў складаецца з мноства не сінхронна растучых элементаў раслінната покрыва — палян і ўзлескаў розных памераў, ветрапавалаў, гарэльнікаў і г. д. Гэта важна таму, што колькасць меданосаў у лясных умовах мае адварнотную залежнасць ад плошчы лясных угоддзяў і самкнутасці лесу. Склад меданосаў лесу: вербалозы, багульнік балотны, ягаднікі (чарніцы, брусніцы, журавіны), грэчка, яблыня, груша, крушына, ліпа, браткі, верас. Зараз асноўную частку мёду ў палескіх лясах пчолы бяруць з крушыны, чарніц і верасу. Гэтыя расліны маюць невялікія кветкі, таму пылок у дажджлівыя гады хутка вымываецца. У такія сезоны пчолы збіраюць мала мёду і нават могуць загінуць ад голаду, калі гаспадар не будзе падкормліваць іх цукрам ці цукровым сіропам. Пры нармальных умовах адна борць прыносіць 10–20 кілаграмаў мёду, а ў спрыяльныя гады нават болей.

Ачыстка лясоў, асушэнне балот і меліярацыя зямель, а таксама лясны пажары ў навакольных рэгіёнах прыводзілі да таго, што пчолы зляталі з гэтых рэгіёнаў у больш бяспечныя мясціны, адной з якіх з'яўляюцца глухія лясы ўздоўж рэчкі Убарць. Значная колькасць прыляцеўшых раёў спрыяла развіццю бортніцтва на гэтай тэрыторыі. Яшчэ развіццю бортніцтва спрыяе і попыт на дзікі мёд, дзякуючы чаму мясцовыя людзі маюць някепскі прыбытак.



**Даведка**

Бортніцтва — збор мёду дзікіх пчол, старажытны спосаб пчалярства. Назва паходзіць ад слова «борця» — дупло. На Палессі бортніцтва мела важную гаспадарчую ролю да пачатку XX стагоддзя, але з шырокім распаўсюдам рамкавых вулляў яно страціла сваё значэнне і практычна знікла.

З ПОШТЫ

# СПОВЕДЗЬ КСЯНДЗА БУЛЬКІ

**Віталь ВОРАНАЎ**



**Вёска Мосар, што на Глыбоччыне, набыла шырокую вядомасць дзякуючы дзейнасці ксяндза-прэлата Юзафа Булькі, які каля 20 апошніх гадоў служыў у тутэйшым касцёле Святой Ганны. Ён аднавіў гэты храм, а ў наваколлі разам з вернікамі заклаў дэндрапарк, дэкаратыўныя сажалкі, клумбы і алеі. Паводле ягонай ініцыятывы ля касцёла з'явіўся першы на Беларусі помнік Яну Паўлу II, а ў вёсцы Парыж на Пастаўшчыне — уласная «Эйфелева вежа» з каталіцкім крыжам наверсе.**

**Ксёндз Юзаф быў вядомы яшчэ і як нястомны барацьбіт з п'янствам і алкагалізмам: ягонымі высілкамі ў Мосары быў створаны антыалкагольны музей, а тэрыторыя тутэйшага Удзельскага сельсавету абвешчана «зонай цвярозасці».**

**9 студзеня гэтага года зямны шлях ксяндза Юзафа Булькі на 85-м годзе жыцця завяршыўся. Развітацца з ім і памаліцца прыйшлі тысячы вернікаў. Памяць пра яго засталася, аб чым сведчыць і гэты ліст у рэдакцыю.**

Калі я першы раз пабачыў ксяндза Бульку, мне было шэсць гадоў. Яму было шэсцьдзесят чатыры, але ў той час мне здавалася, што яму прынамсі дзевяноста. Адразу, дзякуючы бабуліным захадам, якая была прызнанай у каталіцкай грамадзе хадайніцай па аднаўленні касцёла, я атрымаў ганаровую пасаду міністранта.

У той час усіх хлопчыкаў, як і мужчын у комжах, якія прыслужвалі падчас святой імшы, мясцовыя аднолькава называлі закрыстыянамі. Мае абавязкі раслі з кожным днём. Спярша я атрымаў доступ да званочкаў, пасля да гарлачыкаў для палівання вады ў абрадзе ўмывання рук, яшчэ пазней да патэны для падстаўляння пад падбароддзе ў часе камуніі, якую мы проста называлі «тацай», і ўрэшце ці не да самага файнага і ў чымсьці вельмі паганскага літургічнага прычындалу — кадзідла.

З усіх закрыстыянаў у часе службы я адрозніваўся бездакорнымі паводзінамі, якія найперш заключаліся ў поўным маўчанні і дарослай павазе, што ксёндз Булька даволі часта адзначаў механічным пагладжваннем па галаве. Я заўсёды ставіўся да яго з пэўнай насцярогай, хутчэй за ўсё, з-за слабага разумення ягоных словаў. Ксёндз, які толькі прыехаў у Беларусь, гаварыў на руска-польскай мяшанцы з моцным літоўскім акцэнтам, які істотна перашкаджаў мне разумець ягоныя кароткія заўвагі і пытанні. У той час служба ў касцёле праходзіла яшчэ выключна па-польску. Я польскай мовы, апроч завучаных словаў розных малітваў, не ведаў. Таму фраза «Богу складамы дзенькі», перакладзеная мною як «Богу складаем дзенькі», перш за ўсё асацыявалася з чыннасцю збірання грошай у скарбонку, рабіла на мяне вялікае ўражанне.

Вобраз ксяндза Булькі для мяне ўсё ж больш звязаны з прыкасцельнай тэрыторыяй, чым з самім касцёлам. Ягоныя рукі часта былі запэцканыя ў зямлі, зліваліся з колерам сутаны і ўлюбёнай ім берэты — чорнай чатырохвугольнай шапкі з дзіўным пампонам наверсе. На сённяшні розум я б падумаў, што ён хутчэй пратэстант, які большасць дня праводзіць на працы ў садзе, ці можа нават пурытанін, які, пакінуўшы дом, едзе абжываць новую зямлю, па якой калі нават хтосьці і хадзіў перад гэтым, то было гэта вельмі даўно. У сваёй нянавісці да алкаголю — я добра памятаю ягоныя палымяныя супрацьалкагольныя казані — ён і праўда ў нечым больш нагадваў пурытаніна з каланіяльнага перыяду. Магчыма, таму Бульку так моцна любілі і ўсяляк падтрымлівалі вясковыя жанчыны, а мужчыны пераважна асцерагаліся.

Калі мне споўнілася восем, бабуля пастанавіла падрыхтаваць мяне ды выправіць да першай камуніі. Прайшоўшы этап тэарэтычнай падрыхтоўкі ў законных сясцёр, я актыўна рыхтаваўся да першай у жыцці споведзі. Чым бліжэй быў час споведзі, тым больш я губляўся ў «нарыхтоўцы» сваіх грахоў. Як заўжды, у такіх выпадках на дапамогу прыходзіла бабуля. Яна спярша прайшлася са мною па ўсіх смяротных грахах, за якія можна трапіць у пекла, якія здзяйсняюцца пры поўнай свядомасці і свабодзе выбару. З дзесяці прыказанняў бабуля пазначыла мне пункты тры і чатыры, а пасля мы перайшлі да грахоў з ліку лёгкіх — тых, з якімі можна было разлічваць на Чысцец. Каб занадта не перахваляваць мяне вывучэннем правінаў на памяць, бабуля дапамагла запісаць іх на адмысловую паперку.

Калі прыйшоў урачысты момант, ксёндз Булька спярша ўважна выслухаў завучаную мною формулу споведзі, а пасля зачытаныя з дапамогай шпаргалкі грахі. Сказаўшы сваю частку малітвы, ён загадаў больш не грашыць, задаў у якасці пакуты пэўныя пэўныя малітвы і ўжо ў самым канцы, выхіліўшыся з-за кратаў канфесіяналу бліжэй да мяне, на сваёй дзівоснай мове прашаптаў:

— Паперку пасля споведзі спаліць.

Скінуўшы з плячэй вялізарны груз, я, быццам паветраны балонік, вяртаўся з не менш за мяне задаволенай бабуляй дахаты.

— А каму спавядаецца ксёндз Булька? — мучыў я бабулю сваімі складанымі пытаннямі.

— Біскупу, — спакойна, як заўжды, адказвала яна.

— А біскуп? — працягваў я.

— А біскуп Папу рымскаму — казала бабуля, мусіць, не хочучы ўводзіць мяне ў складаныя падрабязнасці.

— А Папа рымскі? — не спыняўся я.

— А Папа рымскі... Богу — сказала бабуля, паставіўшы кропку ў нашым дыялогу.

«Дык вось, значыць, якім складаным шляхам мае грахі трапляюць да Бога», — думаў я і крочыў дадому.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №1 (39) (студзень)

www.litbel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«РОЗГАЛАС» .......... 2

«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Юркі ГОЛУБА .......... 3

«ПРОЗА»: ГІСТОРЫЯ «Х» (ПЛАЦЭНТА) Алесь ГАНАРОВІЧ .......... 4–5

«ПАЭЗІЯ»: вершы Віктара СЛІНКО .......... 6

«ЭСЭ»: Віктар ХУРСІК «ажыўляе» слаўную постаць XIX стагоддзя Гелену Скірмунт .......... 7

«ПАРАЛЕЛІ»: згадкі Валерыі КУСТАВАЙ пра шведскую выспу Готланд .......... 8


ЮБІЛЕІ

# ЧАЛАВЕК З БРЫЛЬЯНТАВЫМ СЭРЦАМ

Леанід Марцінавіч Дайнека нарадзіўся 28 студзеня 1940 года ў вёсцы Змітраўка 2-я Клічаўскага р-на Магілёўскай вобласці. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1967). Працаваў на будоўлях, на Ніжнетагільскім металургічным камбінаце, на Беларускім тэлебачанні. Быў адказным сакратаром часопіса «Маладосць», загадчыкам аддзела паэзіі выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Друкуецца з 1961 г. Аўтар зборнікаў вершаў: «Галасы» (1969), «Бераг чакання» (1972), «Мая вясна саракавая» (1979), «Вечнае імгненне» (1985), зборніка апавяданняў «Бацькава крыніца» (1976); рамана-дылогіі «Людзі і маланкі» (1977) і «Запомнім сябе маладымі» (1979), раманаў «Футбол на замініраваным полі» (1987), «Меч князя Вячкі» (1987), «След ваўкалака» (1988, разам з папярэднім раманам уганараваны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя К. Каліноўскага ), «Жалезныя жалуды» (1990). Аўтар фантастычнага рамана «Чалавек з брыльянтавым сэрцам» (1992).

Творы друкаваліся на рускай, украінскай, польскай, англійскай, эстонскай, латышскай, літоўскай, малдаўскай, армянскай, грузінскай, ідыш, іўрыце і іншых мовах.



Леанід Дайнека з унучкай Янай

***— Леанід Марцінавіч, па сцвярджэнні Уладзіміра Арлова — ён ведае свой радавод да пятага калена… Колькі словаў пра Вашыя радаводныя карані…***

— Ну так глыбока, як шаноўны спадар Арлоў, у свой радавод я не заглыбляўся. Але тым не менш… Прозвішча Дайнека паходзіць ад балцкага слова «дайна», што азначае — песня. Нездарма ёсць шмат вядомых спевакоў з такім прозвішчам. Ды і ў нашым родзе любяць і ўмеюць спяваць. Род Дайнекаў паходзіць з цэнтральнай Беларусі, з Клічаўшчыны. Мы людзі вольныя, ніколі не былі прыгоннымі. Я перакананы, што ў маім прозвішчы спляліся дзве радаводныя галіны — Дайнека і Данейка. А гэта значыць, што ў нашым радаводзе прысутнічаюць шляхецкія карані…

***— Вось адкуль тая цяга да тэмы рыцарскага слугавання Бацькаўшчыне, якая прысутнічае ва ўсіх Вашых гістарычных раманах.***

— Мяркую, што так. Ёсць такое паняцце — крэўная памяць. Голас крыві — голас нашых продкаў. А магчыма, якісь царскі пісар знарок зрабіў памылку ў прозвішчы — і Данейкі сталі Дайнекамі. Кастусь Тарасаў напісаў, што Дайнекамі ва Украіне называлі разбойнікаў. А хто называў? Ды тыя ж царскія пісары. А насамрэч — гэта былі ваяры за Вялікае Княства Літоўскае, і я ганаруся гэтым. Бацька мой Марцін Дайнека скочыў Свіслачскую гімназію, мама мела трохкласавую адукацыю, але па жыццёвай мудрасці і любові да беларускай паэзіі і песні яна была акадэмікам...

***— Літаратурную дарогу Вы пачыналі як паэт. Ці памятаеце свой першы верш? Што або хто натхніў на паэтычную творчасць?***

— Вось якраз мама і натхніла. Яна ведала на памяць безліч вершаў беларускіх паэтаў, любіла дэкламаваць паэзію Коласа. А яшчэ — нашая беларуская прырода. Клічаўшчына — гэта мой паэтычны рай. А першыя вершы я пачаў пісаць вельмі рана — недзе ў 5–6 гадоў. І мой дзед Сцяпан заўсёды любіў казаць бацьку: «Вось пабачыш, Марцін, з гэта хлопца выйдзе сапраўдны пісьменнік…»

***— У 1987 годзе з-пад Вашага пяра выходзіць першы раман «Футбол на замініраваным полі», у якім Вы асэнсоўваеце тэму горада, і гэтым жа годам пазначаны выхад рамана «Меч князя Вячкі». Ці не цяжка было ўадначас жыць сучаснымі рэаліямі і, азірнуўшыся на восем стагоддзяў назад, «браць вайсковы чын у барацьбе з крыжакамі»?***

— Для мяне гэта абсалютна няцяжка. І цяпер я ўадначас пішу свае «Герадоцінкі», вершы і новы гістарычны раман. А ў маладосці творчай энергіі было столькі, што прыходзілася шкадаваць, што ў сутках толькі 24 гадзіны…

***— Зварот да гістарычнай тэмы — гэта свядомы творчы выбар ці шчаслівы падарунак лёсу? Каго з папярэднікаў лічыце за свайго настаўніка?***

— Безумоўна свядомы. Бо мне было крыўдна чытаць і чуць, што мы, беларусы, нацыя — рахманая і талерантная. Навокал, у нашых суседзяў — свая гісторыя, свае героі, свой гістарычны лёс. А дзе Беларусы? Дзе дзесяцімільённы народ у самым сэрцы Еўропы? Дзе Вялікае Княства Літоўскае, якое я называю Краінай Ліцвініяй. Нават падчас апошняга перапісу я назваў сябе ліцвінам.

***— Вашыя гітарычныя раманы адразу заваявалі неверагодную папулярнасць, як прынята сёння гаварыць — траплялі ў лік бэстселераў, таму што Вы адкрывалі ў іх для чытача малавядомыя старонкі нашай гісторыі. Гэта значыць — адкрывалі нашую беларускую Душу… Якая яна для вас — душа беларуса?***

— Беларуская душа — гэта душа нязломнага ваяра. Гісторыя беларусаў — гэта гісторыя войнаў, у якіх нашыя продкі бралі ваярскі чын і ў бальшыні выпадкаў перамагалі. Згадайма вайну з Тэўтонскім ордэнам, з Масковіяй, супраць крымскіх татараў. І ў авангардзе літоўскага войска заўжды выступала беларускае рыцарства — прадстаўнікі шляхецкіх родаў. Адзін з галоўных герояў майго рамана гетман Канстанцін Астрожскі, які ў бітве пад Оршай у 1514 годзе разграміў на шмат пераўзыходзячае маскоўскае войска, якое імкнулася захапіць і падпарадкаваць сабе нашыя землі.

***— Як мне здаецца, Вашыя раманы вельмі кінематаграфічныя. Згадваючы досвед палякаў, якія знялі фільмы амаль па ўсіх рамах Генрыка Сянкевіча, не магу не запытацца, ці не марыце аб экранізацыі сваіх твораў?***

— Яшчэ за савецкім часам мне патэлефанавалі з Беларускай кінастудыі і прапанавалі зняць фільм па рамане «Меч князя Вячкі». Але прайшло дваццаць гадоў, а воз, як кажуць, на тым жа месцы. Як мне здаецца, сучасным дзяльцам ад кінематографа не выгадна здымаць фільмы, дзе б паўстала рэальная гісторыя нашага народа. Таму і з'яўляюцца ў пракаце фальклёрныя трэшы пра слуцкую князёўну — па версіі рэжысёра — змагарку не столькі за вольнасць Беларусі, як за праваслаўную веру і міфічную ідэю славянства ўвогуле. У выніку атрымалася вялікабюджэтная кінематаграфічная казка, а не гістарычны кінаэпас галівудскага ўзроўню.

***— Ведаю, што на некалькі Вашых вершаў напісаны песні. З кім з беларускіх кампазітараў пашчасціла супрацоўнічаць?***

— Сапраўды, я лічу сваім творчым шчасцем, што на мой верш напісаў песню блiскучы майстар беларускай мелодыкі — Юрый Семяняка. Ёсць дзіцячая песня, якую стварыў Леанід Захлеўны. Супрацоўнічаў я і з Алегам Чыркуном. Самая вядомая мая песня — «Беларуская застольная». Яе выконвае хор Цітовіча і ансамбль «Свята».

***— Менавіта ў гэтым песенным хіце, які цудоўна выконвае Дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята», і ёсць такія радкі:***
***Зноў за сталом нявузкім***
***Дружнай сядзім сямейкаю…***
***Хто збіраецца сёння за гэты нявузкі сямейны стол Дайнекаў?***

— За гэтым нявузкім сямейным сталом Дайнекаў збіраецца вялікая і дружная сям'я. Бог узнагародзіў мяне трыма сынамі: Сяргеем, Зміцерам і Сцяпанам. У мяне цудоўная гаспадыня — жонка Зінаіда, з якой у радасці і скрусе мы жывем ужо сорак чацвёрты год.

Гэта маё студэнцкае каханне. І пачуццё таго юначага кахання і вернасці мы зберaглі па сённяшні дзень. Нашая восеньская радасць — нашыя ўнукі. Іх у нас пяцёра: тры ўнукі і дзве ўнучкі.

***— У часопісе «Дзеяслоў» за 2010 год друкуецца Ваш раман «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка». А што сёння на пісьмовым стале Леаніда Дайнекі?***

— Працую над дзесятым па ліку гістарычным раманам: «Той, каго ўдарылі па шчацэ...». У аснову гэтага рамана лёг лёс нашага беларускага пакутніка, змагара за вуніяцкую веру — Ясафата Кунцэвіча… Які пасля быў кананізаваны самім Папам Рымскім.

***— Гэта юбілейны па ліку раман у Ваш юбілейны год! Хочацца па-эстраднаму выгукнуць: «Брава, майстра!». Дазвольце пажадаць Вам моцнага здароўя і доўгіх гадоў жыцця, асветленых любоўю і павагай блізкіх людзей — і Божым дабраславеннем на новыя творчыя вышыні.***

**Гутарку вёў Эдуард АКУЛІН**

# ПАТРЫЯРХ СУЧАСНАСЦІ

**Старэйшыне Саюза беларускіх пісьменнікаў, паэту, празаіку і перакладчыку Міколу Якаўлевічу АЎРАМЧЫКУ — 90 гадоў.**



Паэт нарадзіўся 14 студзеня 1920 года ў вёсцы Плёсы Бабруйскага раёна Магілеўскай вобласці. Пасля вучобы на філфаку Мінскага педінстытута некаторы час працаваў у рэдакцыі газеты «Піянер Беларусі». Затым быў на фронце.

Пасля вайны — рэдакцыі газет «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», часопісы «Полымя» і «Маладосць».

Свае першыя вершы М.Аўрамчык апублікаваў у 1937 годзе. Ён аўтар 10 кніг паэзіі, рамана «У падзямеллі» (1986). Перакладаў на беларускую мову творы Байрана, А.Міцкевіча, Л.Украінкі, І.Франка, М.Джаліля, Г.Эміна і іншых.

Сябра СП СССР з 1947 года. Заслужаны работнік культуры Беларусі. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы за зборнік «Сустрэча былых канагонаў».

Саюз беларускіх пісьменнікаў шчыра віншуе правялебнага калегу і даўняга сябра з днём нараджэння, жадае яму жыццёвага аптымізму, сяброўскага ўшанавання ды моцнага здароўя!

ПАМЯЦЬ

# ДА СТАГОДДЗЯ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

**2010 год багаты на літаратурныя юбілеі. Адзін з найбольш «высокіх» — 100-годдзе з дня нараджэння выдатнай беларускай паэтэсы і патрыёткі Ларысы Антонаўны Геніюш. Юбілей класіка нацыянальнай літаратуры, яе легенды-пакутніка, якая і да гэтага часу не рэабілітаваная беларускай дзяржавай…**



Ларыса Геніюш (у дзявоцтве Міклашэвіч) нарадзілася 9 жніўня 1910 года ў маёнтку Жлобаўцы (цяпер Ваўкавыскі раён Гродненскай вобласці). Пасля Ваўкавыскай гімназіі жыла з мужам-эмігрантам у Празе. Там у 1942 годзе выдала першую кнігу. 5 сакавіка 1948 года, з'яўляючыся грамадзянкай Чэхаславакіі, Ларыса Геніюш была арыштаваная, знаходзілася ў турмах Чэхаславакіі, са жніўня — у савецкіх турмах Вены і Львова, а з канца 1948-га — у турме ў Мінску. Была асуджаная на 25 гадоў пазбаўлення волі як асоба без грамадзянства.

Пакаранне паэтка адбывала ў лагерах Інта і Абедзь (Комі АССР), а таксама ў Мардоўскай АССР. У 1956 годзе Л.Геніюш была датэрмінова вызваленая, аднак не рэабілітаваная. Пасля вызвалення пасялілася на радзіме мужа, у Зэльве (Гродненская вобласць), дзе фактычна знаходзілася пад хатнім арыштам. Да самой смерці (7 красавіка 1983 года) паэтка так і не прыняла савецкае грамадзянства.

Яе дом, які наведвалі многія патрыёты Беларусі, стаў на доўгія гады асяродкам нацыянальнага дысідэнцтва.

І да гэтага часу нацыянальная пакутніца — не рэабілітаваная дзяржавай. Хоць талент паэтэсы не патрабуе анічыйга апраўдання — пачынаючы з часоў Сталіна, падобны стан рэчаў не робіць гонару ні Айчыне, ні суайчыннікам Л.Геніюш.

Два гады назад Грамадскі аргкамітэт па ўвекавечванні памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій, Саюз беларускіх пісьменнікаў і Беларускі Хельсінкскі камітэт накіроўвалі генеральнаму пракурору Беларусі Пятру Міклашэвічу (нагадаем: дзявочае прозвішча Л.Геніюш — Міклашэвіч) хадайніцтва аб рэабілітацыі паэтэсы.

Дакумент падпісалі больш 70 прадстаўнікоў беларускай грамадскасці, у тым ліку акадэмік Радзім Гарэцкі, гісторык Ігар Кузняцоў, народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, пісьменнікі Алесь Пашкевіч і Васіль Якавенка, праваабаронцы Таццяна Працько і Гары Паганяйла.

Генеральны пракурор Беларусі П. Міклашэвіч адмовіў у рэабілітацыі Ларысы Геніюш. У адказе, атрыманым з Генпракуратуры, паведамлялася, што генеральны пракурор не надзелены правам апратэставання пастановы прэзідыума Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь. Менавіта такой пастановай, прынятай 24 лістапада 1999 года, Ларыса Геніюш была прызнаная не падлеглай рэабілітацыі.

Вярхоўны суд, як адзначалі праваабаронцы, прыняў палітычна матываванае рашэнне, далёкае ад прынцыпаў законнасці і справядлівасці. Саюз беларускіх пісьменнікаў абвяшчае аб стварэнні аргкамітэта па святкаванні 100-годдзя Ларысы Геніюш і запрашае да супрацы грамадскія аб'яднанні Беларусі і чытачоў краіны.

ДЫСКУРС

# КНІГА — ГРОШЫ — ТАВАР?

**Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка гатовы добра заплаціць айчынным пісьменнікам за якасны тавар. Аб гэтым ён абвясціў на прэс-канферэнцыі 30 снежня мінулага года.**



Уладзімір Някляеў на прэзентацыі сваёй новай кнігі «Цэнтр Еўропы», якая па апытанні «Радыё Свабода» названая лепшай кнігай 2009 года

«Усе шчокі надзімаюць, дзяржава не падтрымлівае, не дапамагае. Дайце прадукт, дайце тавар! Я калісьці сказаў: «Войну и мир» на стол — я заплачу. Дзе «Война и мир», хоць бы «Поднятая целина», дзе яна? За што плаціць?», — задаў пытанне прэзідэнт дзяржавы. «Можа вы, людзі, якія чытаюць больш мяне, назавіце мне хоць адзін твор нашых пісьменнікаў, за які сёння можна добра заплаціць, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да журналістаў. — У чэргах людзі стаяць у кнігарнях, каб купіць гэтую кніжку. Назавіце, я буду вам удзячны, я выпраўлю сваю памылку. Я заплачу гэтым пісьменнікам, мастакам і гэтак далей».

Прэзідэнт заклікаў творчых людзей адысці ад савецкіх звычак: «Дайце, дайце, а мы паглядзім, што даць». «Не, пакладзіце на стол тавар — атрымаеце добрыя грошы. Гарантую», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

…Не справа літаратурнага выдання спрачацца з тым, што не падлягае спрэчкам. Не да гаворак пра адметнасць творчасці XXI стагоддзя. Не да напамінаў аб штучнай моўнай раздвоенасці літдруку і літпрацэсу ды плачу аб нешматлікасці беларускамоўнага чытача-спажыўца, ды стогнаў аб задушэнні беларускай кнігі расійскім рынкам. Не да месца лекцыі пра ўнікальнасць сучаснай беларускай літаратуры, як і згадкам аб ролі мастацтва ў фармаванні любога грамадства і абавязку дзяржавы перад ім. Проста ўжо не першы год у агучанай шкале прыярытэтаў — чарка, шкварка і каб не было вайны (як яшчэ з дахрысціянскіх часоў пазычанага — «хлеба и зрелищ») — выпадае яна — некалі яе вялікасць, а цяпер папялушка літаратура. Але куды выпадае?

Выпадае ў недзяржаўны, грамадскі сектар. Няма годных кніг? Дзе? Чыіх? Выдадзеных дзяржаўнымі выдавецтвамі за кошт падаткаплацельшчыкаў? Магчыма, бо іх кіраўнікі і рэдактары ўжо не тое што «крамольных», актуальных, вострых, цікавых твораў ды аўтараў баяцца, але і палохаюцца ўласнага ценю. Што ж да недзяржаўных… Поўная статыстыка, магчыма, ёсць толькі ў Кніжнай палаце і міністэрстве інфармацыі. Але і не аб тым размова. Найбольш запатрабаваныя кнігі выходзяць сёння ў незалежных выдавецтвах і выдаўцоў. Іх няшмат, яны небагатыя, але ім, як колішняму піцерскаму «Загляне сонца ў наша ваконца», праз дзесяцігоддзі мусяць ставіць помнікі. Не будзь сёння «Кнігазбора», «Кнігарні Наша Ніва», «Галіяфаў», Логвінава, Хурсіка, «Дзеяслова» ды падобных — мы б зноў мусілі ствараць ды слухаць (як некалі і было) па тэлебачанні не пазначаным аўтарам напісаную «Цаліну»…

Зрэшты, чытачам «Літаратурнай Беларусі» не трэба і нагадваць, што з нумара ў нумар у нашай газеце падаваліся анонсы сотняў някепскіх кніг. Ды і на іх прэзентацыі збіраліся поўныя залы. Ды і па аўтографы калі-нікалі стаялі чэргі. А чатыры з пяці выдадзеных Саюзам беларускіх пісьменнікаў кніг (серыя «Кнігарня пісьменніка») называліся незалежнымі экспертамі сярод лепшых выданняў года! А «Цэнтр Еўропы» (з той жа серыі) Уладзіміра Някляева па апытанні «Радыё Свабода» — лепшая кніга 2009 года! Але — зноў жа — не аб тым гаворка. Гаворка вядзецца да запытання: хто ж тыя «просьбіты», якія так непрыстойна патрабуюць грошай?! Бо 99 працэнтаў членаў наймасавай пісьменніцкай арганізацыі краіны — Саюза беларускіх пісьменнікаў — не публікуюць сваіх тэкстаў у дзяржаўнай «Мастацкай літаратуры», не «з'ядаюць» народных грошай. Сітуацыя парадаксальная да немагчымасці: народны паэт Беларусі (як і большасць яго ных калег) мусіць, каб адрукаваць сваю кнігу, адкладваць на тое тысячы са сваёй пенсіі!

…Не хочацца думаць, што на высокі стол кладуцца не тыя кнігі. Як не хочацца прыходзіць і да наступнай высновы з усяго сказанага: паводле логікі, улада сёння павінна плаціць Дар'і Данцовай, бо якраз яе кнігі найбольш запатрабаваныя сёння народам (амаль чэргі) у Беларусі (як і ў Расіі). Так, цікавяцца, купляюць сёння найперш яе, а не Талстога ці Караткевіча.

А таму што не трэба да кнігі ставіцца як да тавару. Яшчэ напачатку мінулага стагоддзя аб тым нас папярэджваў Максім Багдановіч-Кніжнік: «Добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?».

Але кажуць, што сучасная «хімія» амаль вывела з нашых калгасных палеткаў тыя блакітнавокія кветкі…

Мікола КАЛІНОВІЧ

САЮЗ

# «У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ «ЗАМАЦОЎВАЎСЯ» ЯК ДОМА, ТАК І ЗА МЯЖОЙ»

**У 2009 годзе Саюз беларускіх пісьменнікаў не толькі дзейсна і юрыдычна правамоцна дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі, але і «замацаваўся» за мяжой дзякуючы папулярызацыі сучаснай беларускай літаратуры і творчага братэрства, заявіў у інтэрв'ю БелаПАН старшыня СБП Алесь Пашкевіч.**

Паводле ягоных слоў, у 2009 годзе Саюз беларускіх пісьменнікаў быў прыняты ў Еўрапейскую пісьменніцкую раду (ЕПР), у якую ўваходзяць каля сотні літаратурных арганізацый краін Еўрасаюза. «Варта адзначыць, што Саюз беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца першым і адзіным грамадскім аб'яднаннем з краін СНД, прынятым у гэтую самую ўплывовую і вядомую еўрапейскую пісьменніцкую арганізацыю. Упершыню ў гісторыі Беларусі для айчыннай літаратуры юрыдычна і арганізацыйна адчынена акно еўрапейскай культурнай прасторы. І гэта вялікія павага і гонар», — адзначыў А.Пашкевіч.

Ён падкрэсліў, што ўваходжанне ў ЕПР дазваляе комплексна вырашаць арганізацыйныя і творчыя пытанні СБП. Так, яго прадстаўнікі ўдзельнічалі ў двух пасяджэннях бюро Рады і плануюць ушаноўваць адносіны як з Радай, так і з пісьменніцкімі саюзамі еўрапейскіх краін.

У мінулы год СБП быў прыняты, да ўсяго, і ў Балтыйскую пісьменніцкую асацыяцыю, што таксама садзейнічае кантактам і ажыццяўленню розных творчых і выдавецкіх праектаў, у тым ліку ў галіне перакладаў твораў беларускіх пісьменнікаў на мовы краін Балтыі. Першыя «ластаўкі» — анталогія-білінгва сучаснай беларускай паэзіі «Свята ў вокнах», выдадзеная ў Вільні, а таксама некалькі «балтыйскіх» «пасляпленэрных» альманахаў.

СБП працягваў кантакты і з тымі міжнароднымі пісьменніцкімі структурамі, у якіх ён працуе не першы год, распавёў старшыня грамадскага аб'яднання БелаПАНу. Маюцца на ўвазе Міжнародная супольнасць пісьменніцкіх саюзаў (правапераемнік Саюза пісьменнікаў СССР) і Міжнародная асацыяцыя пісьменніцкіх саюзаў «Слова без межаў», заснаваная СБП разам з Нацыянальным саюзам пісьменнікаў Украіны (у арганізацыю, акрамя украінцаў і беларусаў, уваходзяць творчыя суполкі Балгарыі, Польшчы, Славеніі, Славакіі, Македоніі, Малдовы, Румыніі, Грузіі, Арменіі, Азербайджана,Турцыі і Ізраіля).

Сярод найбольш значных спраў Саюза ў межах Беларусі А.Пашкевіч назваў каля 500 літаратурна-мастацкіх выступаў членаў СБП ва ўсіх рэгіёнах краіны падчас правядзення агульнанацыянальнай грамадска-культурніцкай акцыі «Будзьма беларусамі!». Аб грамадскай цікавасці да сучаснай нацыянальнай літаратуры сведчаць поўныя залы яе аматараў і тыя адметныя пытанні, якія задаваліся на сустрэчах з беларускімі пісьменнікамі, падкрэсліў А.Пашкевіч.

Акрамя таго, па словах старшыні СБП, упершыню грамадскае аб'яднанне пачало выдаваць сваю бібліятэчку «Кнігарня пісьменніка», у якой выйшла пяць кніг (Уладзіміра Някляева, Кастуся Цвіркі, Віктара Казько, Вольгі Іпатавай і зборнік сучаснай жаночай прозы — 24 аўтаркі). Рыхтуюцца да друку яшчэ тры: кніга прозы беларускамоўнага празаіка з Беласточчыны (Польшча) Міхася Андрасюка, а таксама зборнік сучаснай беларускай жаночай паэзіі і паэтычныя пераклады Ніны Матяш.

Як адзначыў А.Пашкевіч, сёмы год выходзіць незалежны літаратурна-мастацкі часопіс «Дзеяслоў», які выдае кіраўніцтва СБП. Адзін з намеснікаў старшыні СБП — Эдуард Акулін — стаў рэдактарам новага літаратурна-мастацкага часопіса для малады х літаратараў «Верасень» (заснаваны ТБМ імя Францішка Скарыны) і ўзваліў на свае плечы праблемы па яго выданні і распаўсюдзе. Пры падтрымцы і садзейнічанні кіраўніцтва СБП з'явіўся сёлета ў свет і другі нумар літаратурна-мастацкага альманаха Брэсцкага аддзялення СБП «Жырандоля».

Старэйшая творчая арганізацыя краіны Саюз беларускіх пісьменнікаў штоквартальна папаўняецца новымі членамі і застаецца самым шматколькасным пісьменніцкім аб'яднаннем Беларусі.

БелаПАН; http://naviny.by

ВЕРШЫ

# ЮРКА ГОЛУБ

## Наскрозь

*У балота зрудзелы покрыў
хіба вырай на памяць скраў,
а тужлівы, нібы апокрыф,
снег загортваецца ў небакрай.*

*Падуладны зімовым метам,
да грудзіны ўчарнеў чарот,
нібы ў чэргах да апраметнай
і яго наступіў чарод.*

*Заліўныя абсягі старыц
затаілі ў глыбінях спуд;
вось каму наступіла старасць:
вербам цяжка брысці на груд.*

*У здароўчага бору знешне
і ў каморы знутры — прыпас,
смольны золатам і не меншы
за мядовы, што зычыў Спас.*

*І дарога — невераемна! –
не збылася глухіх капыт,
і бутэліцы штосьь нядрэмна,
што ў карчомачцы прыкупіў…*

## Зваротнае

*Дзе ластаўкі ўпрытык
Агучаныя дротам,
Стукоча стыку стык:
— Назад няма звароту.*

*Не бачыць сцежка дзён
Наступнага скароту.
Выток ёй не відзён:
— Назад няма звароту.*

*Вунь шосты з семярых,
Хоць ёлупень віротны,
Забіў разумным дых:
— Назад няма звароту.*

*Спіхнула пад адхон,
Ці змыла пешых з броду,
Сіпелі наўздагон :
— Назад няма звароту.*

*Раструшчаны на друз
У запаведзь вароты.
І шэпча служка муз :
— Назад няма звароту.*

*Ды рэкае дзівак,
Сабе самому здрайца,
Што можа сонца знак
Праз шчыліну вяртацца.*

## Простая мова

*Раса раскашуе. Рудзец
Загару маёва.
Выносяцца гукі з грудзей.
Простая мова.*

*У матчынай хустні каснік –
Сусвету абнова.
Не схільная звону казны
Простая мова.*

*Будзіла будынкі бяда
Грымотна. Сурова.
Ахоўвала краю будан
Простая мова.*

*Патрапіў у пекла сатрап?
У жорсткія ловы.
Кавадла — радзіма сярпа.
Простая мова.*

*Дарэмна ламаў ураган
Вясёлку на дровы…
Зубры са стажком на рагах…
Простая мова.*

*Зракліся замовы ануч,
Дзе з шэптамі змова.
Зацятыя вусны на ключ.
Простая мова.*

## Колас і васілёк

*З іх кожны зямлю валок:
Расквечвалі спольна кола
І колас, і васілёк,
Васілёк ды колас.*

*Азваўся ім неба дар.
Не ўдарыў абух віхуры,
А крушнае кары ўдар
Дастаўся дубовай скуры.*

*Збыўся дымок здалёк.
Попелу ўнік Везувій.
Колас і васілёк –
Крэўная з небам сувязь.*

*Раіў дачцы магнат:
Шпацыр заганны пешкі,
У жыцце калі мігіцяць
Валошкавыя памежкі.*

*Даўнюю сцежку згроб
Вецер шурпатай лапай.
Выправіў звычку горб –
Кланяцца перад лапцем.*

*Разбэшчвалі свет нарцыс
І вобак яго бліскучкі.
Спёцы карцяць карцы,
Дзе золата сноп закручваў.*

*Зрушыўся небасхіл
І рынуў на стог саломы.
Там колас пазбыўся сіл
І з ім васілёк-паломнік.*

*Зімны забыты сон:
Спрахлі яго аковы.
Колас гучыць, як звон,
У колеры васільковым.*

*Гнанаму ад валок,
Не вы мне пялі калісь?..
Колас і васілёк,
Васілёк ды колас.*

## Філіпіка сучаснаму чорту

*З тутэйшай знешнасцю каўбоя,
З мясцовай выкладкай глуздоў,
Дык вось — павернецца да бою –
Слана загоніць на гняздо.*

*Не дадаваць, аднак, і спрыту:
Калі кухталь на дно турне,
Гатоў па значнасці іспыты
Здаваць з аднакай і ў турме.*

*На вузкай сцежцы да распаду
Падручны гвалту, самаед
Не супраць называцца падлам
Без перапынку на абед.*

*Чужое гора не казыча.
Распуста скуру не дзярэ.
Яшчэ б вось мазгаўню пазычыць,
Каб хвосцік вышчаміць з дзвярэй…*

## Пра жывучасць

*Далей небяспечна плыць:
Знямоглага плынь зграбае.
Змрочны меморый з пліт.
Каровы жуюць гербарый.*

*Расплывіста ходзіць сказ.
Губляе развагу слова.
Задыханы, як вадалаз,
Паветра аловак ловіць.*

*Разрахавалі лік:
Веліч звялі на дробы.
Выключна — з бутэлькі лык
Для вісуса ўжо не пробны.*



*Валютчыкам — не вераб'ям –
Адносна бывае млосна:
З іх кожны — куст выбіраў
Самому сабе мілосны.*

*Паўсвету збянтэжыў хлус,
Хвалько дамагаўся — цалкам.
Адкроены пушчы кус,
Бадай, што адной запалкай.*

*Няўжо над палеткам знік:
З валошкай жаўрук не ў змове?
Пачварна азызлы зык
Дзялянку гародзіць мове.*

*Хрыпаты, як жарабец,
Век атрасае мыла.
Ні ў жолабе, ні ў журбе
Брыда нас, аднак, не змыла.*

## Акцёр

*Сплываў пясок сыпучых дзён.
Кларнет курочыў ціш карэнна.
Акцёр, на вольніцу жадзён,
У ногі кленчыў Мельпамене.*

*Мяняла сцэна хор і ўбор,
І ён мяняў наноў аблічча.
І паўставала, як дакор,
Нямое сцэны акалічнасць.*

*Двайное дно, як двойчы два,
Трымае на выпадак сцэна.
А ён сябе ёй аддаваў
І меў надзею: моцных цэняць…*

*І падымаў на глум кулак,
І нёс пяшчоту срэбнай ноце,
І рагатаў, як ваўкалак,
І да крыві здзіраў пазногці.*

*І паваліўся — напавал.
Душа адрынула кудысьці…
Заслоны грымнуўся абвал,
А з-пад яго не маюць выйсця.*

## Зноў пра запавет

*Не распуснік — калі араты.
Сівы з помнае галавы.
І таму на парозе страты
Падаецца: жывеш жывы.*

*Над табою віхураў лямант.
Пад табою — вякоў пласты,
Дзе спачыў, як апошні мамант,
Той, хто з цэмры пісаў лісты.*

*На асадку была надзея
І апірышча — на душу.
Абдымала яго нядзеля
З абяцанкаю: прысушу.*

*Хібны час навылёт калечыў.
Дых смяротны, як грушу, трос,
Але ён перад тым не кленчыў:
Запаветам таму ўваскрос.*

*Акіянам гаеў зялёных
Зноў насустрач панесла свет.
Покуль неба на зоры зойме,
Іх запальвае запавет.*

## Ноч

*Дзе прагу змрок каўтаў,
Да ўчынку зноў ахвочы,
Вунь ярасна ў ката
Трашчаць уночы вочы.*

*Адчулася на слых
У свеце навакольным:
Забіла гаю дых
У салаўінай штольні.*

*Звысоку — не на жарт –
Ляцела ўніз камета…
Ды хто кахання варт,
Не заўважалі гэта.*

## Вінаград

*Як агат у град карат,
У смычок навошчаны
Граў на гронах вінаград,
Бо ўваскрос над прошчаю.*

*Спакушаў ён пеўчы хор:
Грэў харалы з хорам.
Ратаваў з пячорных гор
Каралеўскі корань.*

*Азіраўся па баках
Той, хто змове ласы.
Ён жа ўверх узнёс бакал,
Каб з размаху ляснуць.*

*Лішку з горычы не браў,
Спешчаны спякотай.
Абдымаў прыгоды брам…
— Дам? Аб тым — на потым…*

*Грацый цокала каза.
Зайздрасць лезла ў норы.
Мог ён нораў паказаць
І не толькі нораў!*

*Карнавал. І апасля
Супраць этыкету
Ён сядаў замест пасла
У карэту-рэтра.*

*Спела вуснаў каляда.
Голасна і вусна
Вінаграду прыгадаў
Скус пра час спакусны.*

*Прыцямнела. Райскі сад
Даў адхланне кронам.
І выконвалі расклад
Вартавыя схронаў.*

*На пярыне хроп Адам.
Вінаград з-за плоту
Еве любчык перадаў,
Ды аб тым — на потым…*

## Сакавік

*З крутою сілай пажагнаны,
Калі пачуўся весні гул,
Хрыбет марозу на паркане
У тры пагібелі сагнуў.*

*Дзе раўчукі раўлі,а зубру
Круціла рогі Белавеж,
Ігралі сосны,што на зрубы
Ён не пусціў з заходніх меж.*

*Як волакам цягнула крыгі,
Дык ён нягегламу наздзіў
З усіх гаеў загроб адлігі
І ім бярозавік цадзіў.*

*Каб стаў бурштынам мёдны ўзятак
І пазбыліся пчолы звад,
Дрымотны вулей,як дзіцятка,
Ён беражна аднёс у сад.*

*Пралеску вабілі на ўзлеску
Яго пастава, зрок і зык.
І стаўся сэрцайкам пралескі
Плячысты хлопец сакавік.*

МАРГІНАЛІІ

# ГІСТОРЫЯ «Х»
## (ПЛАЦЭНТА)

Алесь ГАНАРОВІЧ

**Калі чалавек пачынае сябе ўсведамляць, біяграфія заканчваецца.**

Першы ўспамін — апошняя старонка жыццяпісу. З таго часу пачынаецца не жыццё, а ягонае стварэнне. Усё — колькі б яно ні цягнулася: трыццаць тры гады, семдзесят, вечнасць — толькі расцягнутае рэха жыцця першаснага, неўсвядомленага. І якраз тое жыццё — найцікавае, найкаштоўнае, неразгаданае й па сёння. Акурат яно — вечнае, бо і ёсць вечнасць.

Такія сентэнцыі запаланілі імператара. Калі ён упершыню іх пачуў — зразумеў, што зможа перамагчы свет і жыць па-райску. Свет, паўтаралася ім, — гэта сапсаваная чалавецтвам плацэнта, яе сінонім — рай.

Ён дасягнуў на гэтай зямлі ўсяго: неабмежаваная нікім і нічым улада, любоў народу, росквіт сабранай з аскепкаў імперыі. І вось наважыўся ўзысці на вышэйшую прыступку чалавечага існавання: аднавіць у сабе страчаны рай. Вярнуцца да свайго неўсведамлення. У сваю першаснасць...

Ён ішоў да гэтага няпроста і не адзін месяц. Ці жарты: пакінуць імперыю на дзевяць месяцаў без свайго нагляду! І да медыкаў асаблівага даверу не меў: а што калі задушаць той пупавінай? Аднак... Сеанс, як ахрысцілі тую працэдуру-аперацыю, мусіў незвычайна абмаладзіць арганізм. Абяцаў новыя дзесяцігоддзі жыцця...

Пачыналася ж усё казённа. Раніцай у ягоны кабінет, сваімі памерамі падобны да хакейнага поля (толькі замест лёду ляжаў канадскі паркет), ветліва пастукаў Першы памочнік Жакей, мякка прачыніў дзверы і далікатна вымавіў:

— Вітаю Вас, пане Імператар... Дазволіце зайсці?..

(Калі б памочнік не меў такога прозвішча, яго б трэба было прыдумаць. Яно служыла і пашпартнай пазнакай, і мянушкай. Прычым — з падвойным сэнсам. Жакей — ён і нястомны «вершнік», паразітам з вуснаў якога не сходзіла «галопампаяўропам», ён — да ўсяго — і ненасытны каваман. Аніхто не мог даўмецца: як у яго ўлазіць столькі кавы? Думалі, што той напой ужо і ў ягоных венах. А любімым гатункам была, натуральна, кава «Жакей»...)

— Што ў цябе? — Імператар неахвотна адарваўся ад чытаніны. — Ты што паперу не эканоміш? Заваліў мяне гэтымі запіскамі... Вочы мае хоць бы пашкадаваў!

— Прабачце, я б не турбаваў, але тут без папярэджання Ціхонцаў прасіцца...

— А яму што?

— Не магу знаць. Сказаў, што па нумары нуль...

Так — нумар нуль — кадыфікавалі найсакрэтныя перамовы, якія без пасярэднікаў вялі службоўцы з кіраўніком. Зразумела, тыя службоўцы, якія мелі доступ...

— Запускай.

Ціхонцаў, старшыня Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі, пакамечаны жыццём, службай і прыроднымі катаклізмамі, але ў зіхоткай аправе з некалькіх радоў ардэноў і ў навюткім генеральскім мундзіры, кінуў на Першага памочніка прыхавана-раўнівы позірк і, сам зачыніўшы масіўную дзверыну, працокаў да стала імператара і там выпаліў:

— Здравія-жадаю-таварыш-Галоўна-каман-дуючы!

— Ды цішэй ты!.. Сядай.

Ціхонцаў наструнена глядзеў на імператара і не варушыўся, пакуль той не адклаў раздрукаваны вялікім шрыфтам аркуш і не ўздыхнуў:

— Вочы скора вылезуць... Давай, што ў цябе?

Старшыня Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі ўскочыў і залепятаў:

— Таварыш Імператар! Я маю радасць далажыць Вам, што ў выніку праведзенай нашым Дэпартаментам працы і адпаведных мерапрыемстваў... мы маем у выніку... хочам прапанаваць Вам... паколькі праверка праведзена шматпланава, ну а да ўсяго праходзіла аперацыя ў найсакрэтным рэжыме... — ён нечакана для сябе збіўся і акамянеў.

— Не трындзі ты, — зноў уздыхнуў імператар. — Толкам можаш сказаць?

— Так точна... — Ціхонцаў выцер аб лампасы спатнелыя далоні. — У нашым сакрэтным цэнтры дамагліся нечувалага! Маю на ўвазе аперацыю «Плацэнта»... Праведзены доследы і аперацыя, пасля якой пацыент памаладзеў на тры дзесяцігоддзі!

Ён набраў паветра і замоўк.

— Ну-у... — імператар недаўменна склаў на жываце рукі. — І што: дзяржаўную прэмію табе за гэта даць?

— Я не аб тым, таварыш Імператар, не так зразумелі... Я да Вас з прапановай... Толькі правільна мяне зразумейце... Аперацыя найсакрэтная. Акрамя праверанага медперсаналу з Дэпартамента аб тым знаю толькі я і мой намеснік. Я асабіста курыраваў... А таму маю гонар прапанаваць... Толькі правільна зразумейце...

— Ды не цягні ты мякіну, што хочаш?!

— Хачу, толькі правільна... бо ад усяе адданасці... Лішнія ж трыццаць Вашых гадоў анікому не перашкодзяць... Хачу прапанаваць... абмаладзіцца...

Імператара як ашпарылі:

— Што?! Ты гэта... Думаеш, што я ўжо не магу са сваімі старымі косткамі тут сядзець?! Так?!!

— Аніяк не, таварыш Імператар... Я зусім не аб тым... Я проста як лепш... Грошай жа на тое пайшло... Таму каб лепш хацеў... — і Ціхонцаў нечакана абмяк ды заціх.

— Як лепш, кажаш? А што там за аперацыя? Не падцяжкі ж ты мне прапануеш зрабіць, а?

— Што-о Вы... — ажывіўся Ціхонцаў. — Медыкі сеансам завуць... Там, гэта... пупавіну нарошчваюць, а пацыента, так сказаць, у бараплацэнту...

— У бара што?

— Плацэнту, таварыш Імператар. Аб тым лепш самі медыкі хай... Мы ж найперш за бяспекай і сакрэтнасцю... Ну а выніці, я Вам скажу-у-у! Дзеда аднаго... і напаўсляпы быў, і хваробаў букет... ледзь соваўся, а праз дзевяць месяцаў, прашу прабачэння, маладзіцу папрасіў! І вось ужо паўгода джыгітуе, як падшыванец...

— Маладзіцу, кажаш?.. — Імператар упершыню за дзень усміхнуўся. — Што ж, будзем думаць. Працягвайце працу...

Старшыня Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі выйшаў з выглядам пераможцы, чым насцярожыў Першага памочніка.

— Ты гэта, галопампаяўропам, мне нічога не хочаш сказаць?

— Не маю права, таварыш Жакей, нумар нуль, сам разумееш...

А праз некалькі хвілінаў памочніка паклікаў да сябе імператар.

— Зрабі так, каб Ціхонцава я, і не толькі я, больш не бачыў. І тэрмінова да мяне ягонага намесніка. Як там яго?

— Бадакін, пане Імператар.

— Ды хоць Какакін...

Імператар ноччу не змог заснуць. Завярэдзілі ўспаміны: малады, пасля інстытута... А да ўсяго — адолелі болі: і ў галаве, і ў суставах... Задышка падкацілася... Ад пігулак і парашкоў ужо на ваніты цягне...

Раніцай выклікаў памочніка. Той, як і гаспадар, таксама не спаў — кубкамі глытаў каву і выглядаў бадзёрым.

— Рыхтуй сустрэчу. Паедзем у іхнюю лабараторыю, хачу паглядзець, што там...

Пра візіт імператара ў медыцынскі цэнтр Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі акрамя ахоўнікаў ведалі толькі два чалавекі: Жакей і Бадакін. Напачатку ў лабараторыі паказалі два відэазапісы. Кульгавы стары да «сеанса» і ажывелы мужчына гадоў пад сорак.

— І што, гэта адзін і той жа хрэн?! — не паверыў бачанаму імператар.

— Так. Працэс сеанса кантраляваў асабіста я. Па-праўдзе, і сам дагэтуль дзіўлюся, — ускочыў па стойцы «смірна» Бадакін.

— То раскажы, як такая байда атрымалася?

— Да сеанса рыхтаваліся дзевяць гадоў. За медзабеспячэнне адказвае прафесар Скоркін. Мае трох асістэнтаў, медычак. Усе, як разумееце, правераныя ды ізаляваныя. Пацыент быў адабраны ў Шоцкім раёне. 75 гадоў. Па легендзе знік без вестак. Дастаўлены ў лабараторыю 2 жніўня 20... года. Сеанс пачаўся 13 жніўня, закончыўся 30 красавіка 20..-га. З таго часу — пад нашым наглядам. Адчуванне выдатнае, медпаказчыкі выдатныя, толькі... — Бадакін заціх.

— Ну?

— Толькі жанчын патрабуе. Новых. А тут жа — сакрэтны аб'ект. Прафесар скардзіўся, што ягоных медычак заюзгаў...

— То не хвароба! — зарагатаў імператар і запытаў сур'ёзна: — А ёсць якія асцажненія?

— Не, таварыш Імператар, не выяўлена.

— Дык што ж, урэшце, вы яму тут зрабілі? Не на клізмах жа памаладзеў?!

— Не, таварыш Імператар, тут цэлая праграма. Яму, гэта... пупавіну аднавілі... і ў плацэнту, як у матчын жывот...

— Аляксандр Герасімавіч, — мякка прамовіў Жакей (любіў у прысутнасці высокіх асобаў так назваць імператара, падкрэсліваючы сваю блізкасць да кіраўніка і казыраючы тым). — Я моцна перапрашаю, што перабіваю, але, можа, варта паклікаць самога прафесара? Ён бы распавёў пра ўсё больш дэталёва...

— Так, правільна, давай!..

Састарэлы прафесар напачатку ледзь не самлеў ад нечаканкі, але потым ачомаўся і выглядаў упэўнена:

— ...Доследы базуюцца на аснове медыкафізічных, неўрапсіхалагічных і біяметральных фактараў...

— Стоп-стоп, — замахаў імператар. — Не гані свою пургу! Ты можаш проста і па-чалавечы растлумачыць, як дзеда абмаладзіў?

— Так-так, прабачце, зараз... — прафесар дастаў насоўку, выцер спатнелы лоб і працягнуў: — Вашая Імператарская Вялікасць, чалавек пачынае старэць з таго часу, як нараджаецца. Свет — гэта дадзеная Усявышнім і сапсаваная чалавецтвам плацэнта... Вось мы і паспрабавалі вярнуцца да першаснасці, да матчынага, так сказаць, улоння. Стварылі штучную бараплацэнту ды змясцілі ў яе старога пацыента. Усе тэрмальныя ды іншыя жыццёванеабходныя працэсы кантралявалі аўтаматычна. Пацыент спаў, а за перыяд сеанса цела ачышчалася і акумулявала назапашаную энергію. Абмаладжалася...

— А як ён дыхаў? — пацікавіўся імператар.

— Так, як і ў жываце маці, толькі, зразумела, штучна...

— А што еў у тым вашым пузыры?

— Неабходныя вітаміны і адэкватнае харчаванне падавалася ў плацэнту, ці, па-Вашаму, пузыр, праз...

— Ды ведаю я тую плацэнту не менш вашага, — перабіў імператар прафесара. — Мы іх з ветэрынарамі яшчэ паследамі называлі...

Усе зноў уталопіліся на прафесара, але той быў збіты спанталыку параўнаннем і зноў выцер лоб.

— Вашая Імператарская Вялікасць... чалавечы пуп ёсць таямніца, своеасаблівае злучэво з сусветам. Праз яго, пасля адмысловых аперацый, мы і падводзім неабходныя шляхі харчавання і выводу адходаў. Паўтаруся, метад вельмі просты і натуральны. Па сутнасці, ён паўтарае тое ж, што робіцца ў матчыным улонні з дзіцем. І тэрмін, як



разумееце, мы запраграмавалі той жа…

— Ну а потым, праз дзевяць месяцаў, што? — імператар зноў ажывіўся.

— Усё… — не зразумеў прафесар. — Спыняем сеанс…

— І пупавіну рэжаце?

— Ну так, можна і гэтак сказаць. Адпаведныя шляхі хірургічна адразаюцца…

Пытанняў больш не было. Пацмокаўшы ўстаўнымі зубамі, імператар нечакана прапанаваў:

— А давай, прафесар, мы і цябе абмаладзім. Галава, бачу, разумная, а то яшчэ кеўкнешся, і медыцына нашая збядnee!

Прафесар ніякавата ўсміхнуўся, а Бадакін ускочыў і залепятаў:

— Таварыш Імператар, Вашая воля для нас закон, але прашу прабачыць і зразумець… Сеанс надзвычай затратны ў плане фінансавання… Я б сказаў найзатратны…

— Паняў, — уздыхнуў імператар, зноў цмокнуў і загадаў: — То пакажыце мне ўжо свайго дзеда!

«Пацыента» прывёў сам Бадакін. Дзедам назваць яго магло хіба што немаўля: выглядаў падцягнута, бадзёра. Убачыўшы імператара, абрадаваўся і ледзь не кінуўся абдымацца:

— Ля-а-ксандар Герасімыч, здароўця, ці вы гэта?

— Ну-ну, астынь! — буркнуў на яго Бадакін, але імператар толькі ўсміхнуўся:

— Нічога-нічога… Дык як, мужык, ты сябе пачуваеш?

— Скардзіцца няма на што…

— А мне казалі, што да маладзіцаў не пускаюць.

— Ну… ента можна й папраўіць.

Імператар наблізіўся да «пацыента», зазірнуў у вочы, пахлопаў па плячы і падрахаваў:

— Харош, мацы тваю! — і праз паўзу: — Мне даклалі, што ты мой зямеля. І праўду з Шоцкага раёна?

— Ну а адкуль жа, Герасімыч?..

— А чым займаешся?

— Цяперака ж нічым. Вось, у гэнтай санаторыі адпачываю. Дзякуй вам і дахтарам: і накормлены, і апрануты, і клопату ня маю!

— А да «санаторыі»?

— Дык гэта… конюхам. Пасу, кармлю, а яшчэ летам за бабу на весавой сяджу…

— А не цяжка ў такіх гадах за коньмі бегаць?

— Што вы, Герасімыч! Да санаторыі, не схлушу, ня мог ужо, думаў кідаць. А цяпер вылюдnеў так, што й галопам дам рады!..

— Чуў, Жакей, — імператар павярнуўся да памочніка. — Яшчэ адзін наезднік у нашым эскадроне! — задаволена ўсміхнуўся і ляснуў далонямі, што азначала: канчай базар, гайда дамоў…

І зноў ён ноч не спаў. А можа і спаў, ды замест сноў у галаве тыя лабараторныя ролікі круціліся: плацэнта тая з мутнай вадкасцю, чалавек у ёй… Ну рыхтык малое ў вантробе парадзіхі… Толькі вонкі нейкія шлункі спавіваюць, а за імі — дзесяткі апаратаў, манітораў, лямпаў…

Толькі на трэці дзень, натомлены роздумамі і нездаровасцю, састарэлы імператар рашыўся:

— Ну што, конюхі мае верныя, рыхтуйце свае плацэнты… Была ні была: буду абмаладжацца! — ён як рэнтгенам прапёк Жакея і Бадакіна, даўжэй узіраўся ў апошняга і, дадаючы ў голас грознасці, спытаў:

— А ты што гэта да мяне без лампасаў прыпёрся?!

Бадакін, як загіпнатызаваны, ціха выціснуў:

— Таварыш Імператар, палкоўніку лампасы… не паложаны…

— А чаму гэта палкоўніку? Жакей, галопамцябепаяўропам! Рыхтуй мой указ аб прысваенні яму генерала! І прызначаю Бадакіна старшынёй Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі. Глядзіце толькі, каб за дзевяць месяцаў тут байды якой не ўпаролі, а то скуру спушчу!.. — Памаўчаў, зноў прыдзірліва агледзеў падначаленых і закончыў ужо больш ласкава: — Пакумекайце, каб за гэты час я з тэлевізара не вылазіў… Мантаж там які зрабіце, ну… як я прымаю аднаго, другога, дакументы падпісваю, вас, гультаёў, ганяю. Ясна?

— Так! — у адзін голас гэўкнулі памочнік і дэпартаменшчык.

— Ну вось і лады. Не пабіцеся толькі, хто маёй павіталкай будзе, плацэнта-шмацэнта…

Народ піў гарэлку і глядзеў тэлевізар. Напачатку моцна даставаў прэм’ер, рваўся да імператара з нейкімі неадкладнымі клопатамі — пакуль яго сяміпавярхова не абклаў Першы памочнік і не выгнаў з рэзідэнцыі. Прэм’ер надламаўся, засеў на лецішчы і таксама запіў.

І вось — тэлефанаванне старшыні Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі:

— Таварыш Першы памочнік, тэрмін сеанса зачончаны. Будзем спыняць?

— А якія іншыя прапановы?

— Не зразумеў…

— Разумееш ты ўсё не менш майго, — абрэзаў яго Жакей. Канешне, соладка было яму, — па сутнасці, кіраўніку дзяржавы, — гэты час; і розныя ўжо каштунныя думкі ў галаву лезлі, але баяўся ён іх, адганяў як праказу: хто ведае, чым тое адгукнецца… Ды і, ведаючы нораў гаспадара, не мог не думаць аб тым, што без чыёйсьці падстрахоўкі імператар палез у тую плацэнту… — Канешне заканчвай!

Першы памочнік Жакей скасавурыўся на партрэт імператара, замовіў сабе кавы, выпіў без задавальнення — і заспяшаўся ў сакрэтны цэнтр.

Каля ўвахода ўжо стаяў імператарскі лімузін, і Жакей спалохаўся, што спазніўся першым прывітаць гаспадара. Каля ліфта яго чакаў скамянелы Бадакін, — нярвова схапіў за рукаў і пацягнуў углыб вестыбюля.

— Таварыш Першы… выйшла неспадзяванка. Не ведаю, як патлумачыць…

— Імператар жывы? — абарваў яго Жакей.

— Так, так… Што ты! Усё атрымалася, толькі…

— Што «толькі»?! Не цягні!

— Памаладзелы, здаровы, толькі… у сваім часе.

— Як у сваім?

— Ды хадзем, сам убачыш!

…У ярка асветленай палаце сядзеў выгалены і памыты імператар. Памаладзелы ці не на палову. Калі б не памяць ягоных растыражаваных фота «даімператарскага перыяда», яго б цяжка было пазнаць.



— Пане Імператар, дазвольце прывітаць Вас! — пачаў Жакей, але гаспадар злосна сплюнуў і закрычаў:

— Яшчэ во аднаго прыдурка прывялі! Сам ты пан зачуханы, выхранціўся тут мне. Што, яшчэ ад будуна не прасох? Імператары ў цяжкім мінулым! — памаўчаў і нечакана кіўнуў на акно: — Дзе звенявыя? Чаму машыны з разгар пасяўной на двары стаяць?!..

— Зараз, зараз, усё зробім… — сам не ведаючы, што абяцае, Жакей, цягнучы за лампас Бадакіна, падаўся да выхада. Прычыніўшы дзверы, ён паслабіў гальштук і прамармытаў: — Гэта, галопампаеўропам, што такое?!!

— Імператар…

— Ды сам бачу! Пра якую пасяўную крычыць?

— Прафесар сцвярджае, што гэта сіндром вяртання. Ён — у сваім часе… Памаладзеў на тры дзесяцігоддзі — і на тры дзесяцігоддзі ў мінулае вярнуўся…

— А з тым конюхам што?.. Што з тым тваім сіндромам?! Дзед жа — нармальны… — Жакей уздрыгануўся і паправіўся: — У сэнсе нармальна з тога сіндрома вярнуўся.

— Ну так…

— Так тваю цераз так!!! Што рабіць будзем? — Жакей яшчэ больш паслабіў гальштук, і верхні гузік на кашулі не вытрымаў — адарваўся і паскакаў па гранітнай падлозе…

І раптам нешта нібыта абудзілася ў вачах памочніка: — Нука дай мне асабовую справу тога дзеда!

— Паверхам ніжэй, у архіўнай…

…Памочнік глядзеў на біяграфію першага пацыента сакрэтнай лабараторыі, хітаў галавой і не мог вымавіць ні слова. У горле страшэнна перасохла.

— Можа, кавы замовіць?

— Што?

— Можа, кавы, — паўтарыў старшыня Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі.

— Кавы? Не, давай гарэлку, і пабольш… Як вы маглі так з дзедам лапухнуцца?

— Ніякага лапухнуцца… Выхад, як і прафесар зацвердзіў, з сеанса быў беспраблемным, без часавай дэфармацыі.

— Ды што ты вярзеш, генерал! Ты мазгі маеш?

— Я па-а-прашу! — надзьмуўся той, але супакоіўся і зноў затараторыў: — Ты ж сам чуў, як той расказваў пра сваё апошняе месца працы, пра коней нешта там і весавую…

І памочнік не вытрымаў:

— Я і кажу, што ты дурань! Ды конюх гэты і трыццаць гадоў таму, як і перад сеансам вашым ляцкім, коней пасвіў! — ён падняў папку і з размаху ляснуў ёй аб стол. — Заві свайго прафесара!..

На поўную адаптацыю імператара спатрэбілася некалькі дзён. І ўсё павінна было пайсці звычнымі кругамі, аднак… Аднак абмаладзелага кіраўніка адмовіўся прызнаць народ, які датэрмінова выбіраў яго, верыў і любіў. І старэў. Разам з народам старэлі і вера з любоўю. А што ж цяпер? На прыпынках і ў курылках пачаліся насцярожаныя перашэпты, якія выліліся ў стыхійныя мітынгі. І з кожным публічным выхадам імператара «на людзі» людское неўразуменне расло і пагражала стаць абурэннем.

— Імператара забілі, а замест яго падсоўваюць нейкага двайніка-недавярка!..

— Так! Паглядзіце ж, ён нашаму ў сыны гадзіцца…

Анічога не магла зрабіць ні тэлепрапаганда, ні Дэпартамент дзяржаўнай бяспекі. А тут, як на ліха, узняў галаву прэм’ер:

— Правільна, народзе, нас усіх дураць! Па-а-а-дман!

Пакуль ён не ўзначаліў народнае паўстанне, вырашылі правесці выбары новага імператара — як ні цяжка было рашыцца на тое імператару старому. «Нічога не зробіш, — суцяшаў яго прафесар сакрэтнай лабараторыі. — Не забывайце, што біяграфія заканчваецца, калі чалавек пачынае сябе ўсведамляць. Першы ўспамін — апошняя старонка жыццяпісу. Вяртаймася да першапрыроды...»

Што куды і як вярталася, не вядома, аднак на перавыбары памаладзелы гаспадар мусіў згадзіцца. А прафесара пасля тых суцяшэнняў ужо ніхто не бачыў…

Прайшлі месяцы. Не бачылі ўжо і абмаладзелага імператара. Ягонае знікненне было спісана на апазіцыйнага прэм’ера. А ў высокім кабінеце-паркетным полі сядзеў колішні Першы памочнік Жакей…

Ён перастаў піць каву і перайшоў на натуральныя сокі, бо цяпер — як ніколі раней — патрэбна было здароўе. Бо ён таксама дасягнуў на гэтай зямлі ўсяго: неабмежаванай нікім і нічым улады, любові народа, росквіту імперыі, і вось…

Раніцай да яго ветліва пастукаў Першы памочнік, мякка прачыніў дзверы і далікатна вымавіў:

— Вітаю Вас, пане Імператар… Дазволіце зайсці?..

— Што ў цябе?

— Прабачце, я б не турбаваў, але тут без папярэджання Бадакін просіцца…

— А яму што?

— Не магу знаць. Сказаў, што па нумары нуль…

— Запускай.

Старшыня Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі быў падкрэслена ветлівым і заклапочаным:

— …Тут нашыя спяцы з сакрэтнай лабараторыі аквавіту вынайшлі, правільней, размарозілі… Разумееце, Вашая Імператарская Вялікасць, пласт ледку тысячаметровай глыбіні… З Антарктыды… Вечная мерзлата, і вада там першародная. А, як ведаеце, мы на восемдзесят пр цэнтаў з вады… То я й падумаў, ці не зацікавіць Вас тая метода… Эфект аздараўлення уражвае! Я й сам піць тую віту пачаў…

Імператар нібыта закамянеў: маўчаў і ўзіраўся ў шчырыя вочы Бадакіна. А потым нібыта й сам растаў:

— Што ж, вада ды вада… Думаю, варта паспрабаваць. Толькі абавязкова кожную партыю — на праверку маёй службе аховы!

— Слухаю, таварыш Імператар. — Старшыня Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі казырнуў і пакрочыў да дзвярэй… Але там нечакана спыніўся, азірнуўся і застыў.

— Што яшчэ? — не зразумеў імператар.

— Толькі гэта… Аперацыяй кіраваў асабіста я. Мой намеснік аб тым анічога не ведае…

— І што з таго?

— Ды так, я на ўсялякі выпадак… Будзьце здаровыя, Вашая Імператарская Вялікасць! — ён яшчэ раз казырнуў і схаваўся ў прыёмнай…

ВЕРШЫ

## Віктар СЛІНКО

# З НОВАЙ КНІГІ «АРАХНА»

### Ідэнтыфікацыя па голасе

*Хунта — гэта заўсёды вясёлыя лычкі*
*На плячах салдат рэгулярных войскаў.*
*Зніжаюцца цэны*
*нават у танных бардэлях,*
*І прадуктовыя карткі можна змяняць*
*на патроны;*
*Таксама й наадварот. Іржа на бацькоўскай*
*зброі*
*Будзе падставай для трыбуналу,*
*пасля — расстрэлу*
*Падлетка год чатырнаццаці.*
*Павуцінне ў зачыненых крамах*
*Цалкам магчыма ўспрыняць і як драпіроўку.*

*Хунта — гэта істотнасць адмены*
*жыццёвых планаў.*
*Ва ўніверсітэце — шпіталь.*
*Ды ніхто не адменіць мора,*
*Шум яго хваль — і пясок на даўжэзных пляжах.*
*Жаданне выйсці на лодцы*
*амаль што да*
*далягляду*
*І выкінуць вёслы. Хунта — гэта свабода.*
*Свабода забыцца на тое,*
*што значыць свабода.*
*А мы, хоць жывем у краіне,*
*дзе мора замена — балота*
*І закасаныя рукавы*
*непакояць сівых інвалідаў,*
*Пляцем сваю лесвіцу*
*з доўгіх і тонкіх вяровак,*
*Затойваемся*
*і не адгукаемся*
*на пераклічцы.*

**31.10.09**

***

*На клавікордах — снег. Дажыць да сарака*
*Дзеля цікавасці. Між мора — і аблокаў*
*Яліны й сосны, што глядзяць*
*на дзюны,*
*Уборы годна захаваюць. Мы — пясчынкі*
*Ці горы, ці нябёсы — ўсё няважна.*
*Калі табе пад сорак, ты павінны*
*Бурштын балтыйскі у кішэнь пакласці.*
*Класічны лёс паэтаў*
*гэтак мовіць.*
*А хто прыхільнік поўнае свабоды*
*І не прымае штампаў ці клішэ, –*
*Няхай прыемных, як карчма на ўзлессі, –*
*Сабе той знойдзе покуль адпачынак*
*У іншым месцы; ўсюды, дзе магчыма*
*Рукою далікатнай вымыць твар*
*У лужыне, наўколенцы прысеўшы,*
*І рыбіну сухую раздзяліць, і куфаль*
*поўны*
*На той крыху падобнага бурштыну*
*З падобным на цябе*
*і непадобным.*
*Усё магчыма й тут. Ну а калі твае*
*Цікавасці у іншым палягаюць*
*(Аб чым казаць услых не выпадае),*
*Ты навядзі сябе, нібыта лінзу,*
*І ракурс выберы, адкуль відаць, што ёсць,*
*Чаго няма, і дзе адлюстраванне*
*Сабранага*
*у фокусе адным.*
*Спазніся на цягнік, — альбо квіток*
*Які быў прызам, для другіх зайздросным,*
*Ты з пальцаў выпусці — няхай ляціць*
*між крат,*
*Куды бяжыць, нясе з сабою смецце*
*І хмаркі адлюстроўвае, і неба*
*Яна — з якой нарэшце ты супаў.*

*За спінай — лецішча пустое. Клавікорды.*

**11–12.10.09**

***

*Нам будзе проста праўду зразумець,*
*Калі яна адкрыецца — усім*



*Празрыста, ясна так — навідавоку.*
*Бы ў небе са святымі ўстане ўміг*
*Хрыстос — тады не зможам не схацець*
*Паверыць, адрачыся назусім*
*Ці каменем прыбіць ізноў — прарока.*

**12.04.06**

### Самапісец

*Нібы*
*саракагадовая жанчына ва ўласнай кватэры,*
*мы*
*напускаем на сябе сур'ёзны выгляд,*
*абіраючы бульбу, расстаўляючы салаты*
*на стале,*
*святкуем*
*дзень нараджэння чалавека з імем,*
*адпаведным пашпарту ў кішэні,*
*запрашаем гасцей;*
*але — помнім:*
*Дэталь (як частка цэлага) мусіць не выпадаць*
*з ансамбля, не пярэчыць яго размаітасці,*
*адцяняць асаблівасці таго, што за ёй:*
*сакаліныя пёры, вочы крата (ды іншае),*
*зжаўцелыя*
*голкі сасны пад нагамі, смала, прысталая*
*да кашулі (калі прыхінаўся да дрэва*
*плечуком); так. Ну, дапусцім, усё гэта ёсць*
*пэўны парадак, чарапіца, што абвальваецца*
*са старога й новага даху —*
*адначасова, развешаныя*
*на вяроўцы балкона станікі, — гарачае сонца*
*прасушвае іх хутчэй, чым гаспадыня*
*дойдзе да кухні; але цяжкасці*
*не ў пошуках сувязяў, вынікаў*
*і прычын, а ў немагчымасці злічыць*
*прыступкі на трэці паверх і не збіцца*
*аб збітыя калені,*
*нафарбаваныя вусны, —*
*усё, чым упершыню сустракаў свет,*
*калі мы, падлеткі,*
*падбіралі словы, якімі — вітаць;*
*…бы зноў — падлеткі, глядзім на*
*нераспакаваныя валізы ў прыхожай,*
*а нашы бацькі стоячы абдымаюцца*
*пад абажурам*
*лямпы — без святла.*
*Займаючыся гукапераймannем,*
*аднойчы скажам*
*(дапаможа*
*памылка ў вымаўленні —*
*нявыпраўлены прыкус)*
*тое, за што больш не дазволяць*
*закрэсліваць крыжыкам лічбы ў календары.*
*…Усё гэта пэўны парадак, які не сведчыць*
*ні аб чым. Што*
*браць пад увагу? Прымхі шафёра*
*перад выездам на трасу ці адмоўны*
*рэзус жанчыны й дзіцяці, страх*
*выкідышу, а найперш —*
*за жыццё (сваё), аборт?*
*(Сабакам кажуць: апорт, апорт —*
*і гумавы чалавечак ляціць у*
*кустоўе, пераможца атрымае*
*пячонку і сэрца.)*

*…Што ж, родныя заўжды чакаюць*
*на іншым беразе чамусь…*

*Але рачны пясок*
*захоўвае выразны след нагі —*
*да першай хвалі.*

**Ліпень 2006**

* * *

*У бессэнсоўнасці знайду сваю апору.*
*У тым, што слова падае, бы камень у ваду,*
*І ўсё знікае. Але я — іду.*
*Ёсць проста так — нізіны, рэкі, горы.*
*І ў цяню дрэва адпачне вандроўнік,*
*Глыне з біклагі. Сон яго агорне.*

*А той, хто звык усё казаць услых,*
*Цяпер — нібыта вырваны язык*
*З ужо нямога рота.*
*Крочыць рота,*
*І тыя крокі робяць непатрэбным слых*
*Да іншых гукаў — хто абуты ў боты.*

*І гэты міг, калі спадае ліст,*
*Вы лепш не параўноўвайце з палётам.*

**7.05.06**

### Песня табе

*Вылічаны з твайго заробку,*
*Госпадзе мой, я твая капейка,*
*З непрыбытковых людскіх малітваў,*
*Пертвораны па жаданню,*
*Як таго захацеў аднойчы,*
*На дзявочае камізэльцы*
*Страказою зеленавокай*
*Адпачну я, складваю крылы;*
*І гляджу, як цямнее неба,*
*Як рыхтуеш свае маланкі,*
*І паўзу пад каўнер кашулі*
*(Светла-бэжавы колер ейны)*
*Ад дажджу як лацвей схавацца.*
*Вылічаны з твайго заробку,*
*Я заеду ў пад'езд пашарпаны*
*На сваёй гаспадыні юнай,*
*Ліфт падыме нас да паверха.*
*І пачую пах свежай кавы*
*У яе непрасторнай кухні,*
*І пабачу, як філіжанку*
*Спаласне пад вадой халоднай.*
*Толькі ў станіку й белых шортах*
*Пабяжыць басанож у ванну.*
*Пад струменем адкрые люстру,*
*Што яшчэ ад мяне схавана.*
*Потым будзе па тэлефоне*
*Шчабятаць аб сваіх навінах,*
*А герань на яе падваконні*
*Адчувае, што я ўжо блізка,*
*Выгінае свае сцяблінкі,*
*Каб прысеў я ды пагайдаўся.*
*Тэлевізар пад выцінанкай*
*Ды гадзіннік мяне цікуюць.*
*Але што мне жаданні рэчаў,*
*Але што мне гайданне кветак,*
*І надвор'е з дажджом і ветрам,*
*Ад чаго прамакаць камізэльцы*
*І бутэлькі на ўсіх паліцах,*
*І памыты бліскучы посуд,*
*Калі ўжо мне пара вяртацца.*
*Госпадзе, я твая капейка,*
*Паглядзі, як зямля чарнее*
*Пад зялёным кустом парэчак,*
*А вакол некрануты дзёран,*
*А на лаўцы, што збітая з дошак*
*У шчыліне, што паміж імі,*
*Мурашыны шкілецік мёртвы.*
*І — засохлыя пацеркі ягад*
*Там, на голлі, па-над кустамі,*
*Што чакаюць свайго марозу,*
*Што чакаюць, як гаспадыня*
*Да мяне завітае ў госці.*
*…Калі я абярнуся іншым,*
*Паскідаю сухія крылы,*
*Страказіны бязважкі трупік.*
*Госпадзе, я твая капейка,*
*Ты падай ёй мяне, як лішак,*
*Будзем мы да вакна падыходзіць*
*І глядзець*
*на дом з белай верандай,*
*Як суседзі кладуць на дрэвы*
*Целы доўгіх жалезных лесвіц.*
*Будзем ведаць, што знае корань,*
*Ліст барвяны — і ліст зялёны.*
*Будуць пліты цяплець ад сонца,*
*Будуць нашы сухія вусны*
*Забывацца, што значыць смага.*
*Госпадзе, я твая капейка,*
*Маці моліць аб здароўі сына.*
*Ты пайдзі ды купі цукерак,*
*Адпачні на сваіх аблоках,*
*Што падобны да рыбін дзіўных.*

**2006**

***

*Не ўвянчалі каронай увагі*
*хвілечасовасць,*
*бо ў пяску рачным,*
*бо жалезны чайнік з днішчам,*
*якое ржа*
*ператварыла ў сіта,*
*настойвае дзьмухаўцовы адвар*
*горка-салодкі*
*шчэ дасюль, і ў пяску рачным*
*асакі схіленай постацыю*
*мезенец парэжаш, якАя ты*
*назаву ды паклічу — Ая,*
*без пасрэднікаў-сноў, Ая,*
*ілбы, бы ў сне, што не досыць сніш*
*туляцца да*
*не Месяца траўня, куфра бабулі,*
*да якога не дадасі*
*ні ключа, ні слова,*
*рыба, закапаная па жабры*
*ў пяску рачным, выбавіцца,*
*з бяды як быцам вадою з дна*
*назад у раку гусям глыток*
*пералётным, горла сухое, бы,*
*немагчымае бы,*
*бы сокам натоленыя*
*саркафагі будынкаў*
*на месцы садоў*
*нешта скажуць тым, хто пасля*
*будзе шукаць нашы рысы*
*ў пяску рачным, складаць у словы*
*спевы вады.*

**снежань 2005**

***

*Мы судзім непадсудных, а падсудных*
*Судзіць няма каму. Яны ідуць*
*У цёмны парк, закінуты і цудны*
*Ля рэчкі той, дзе човен на ваду*
*Не ляжа доўгім целам — стала плыткай.*
*Нам перайсці яе — вады па лытکі.*

*Мы судзім непадсудных. У майстэрнях,*
*Дзе дошкі твар кладзецца на варштат,*
*Дзе воцат на кап'і, і ў яркім пер'і*
*Паўлінавым — то Юдаў чысты сад.*

*Хто смелы з нас? Хто дакранецца пэндзлем*
*І перапраўвіць цені на святло?*
*Сказаў мярцвяк, што будзе жыць прыемна,*
*Чыё прадаўгаватае жытло.*

*Невідавочны лёс — як маеш, сцвердзі.*
*Ёсць вішня — і быльнёг зямное цвердзі.*
*Шаргэнь жыцця уласнага — і смерці.*

*Хто бацька здрад, прадажных, — гаварыў нам:*
*«Не сам учынак, а яго матыў*
*Звычайна вырашае. Так і ты…»*

**2009**

ПАМЯЦЬ

# З ЖЫЦЦЯ ЛІТВІНКІ

Віктар ХУРСІК

**Я паставіў ля помніка свечку: «Спі, мая харошая, спі. Сэрцайка тваё так хацела для гэтай зямлі шчасця, ты так верыла ў яе вольную будучыню, што пагрэбавала хатнім дабрабытам дзеля нейкай утапічнай ідэі свабоды. Спі, Гэленачка, не глядзі на бур'ян, хай не ведаюць вочы твае нашага сёння». Што яшчэ я мог ёй сказаць? Што я мог бы ёй адказаць, калі б яна вось тут на Пінскіх старых могілках паднялася і запытала: «Скажыце, пан, у якой я краіне прачнулася праз сто трыццаць шэсць гадоў?». Пэўна счырванеў бы: «Ну, як гэта — у Беларусі». «А Літва? Мая Літва жывая?». «Ды жывая, жывая. Хаця да Вільні далёка». «Вільня... А Пінск? Тут, дзе сэрца маё спачыла, што — гэта ўжо не Літва, пане?»**



Вокладка кнігі Браніслава Залескага «З жыцця літвінкі»

Ну што я магу сказаць, Гэлена! Вы нарадзіліся ў Расійскай імперыі, потым быў бальшавізм і Саветы, а зараз гэта краіна пустазелля. «Не, я нарадзілася ў Літве! Пустазелля ў нас амаль не было». «Што ж, так і запішам: літвінка з чыстым сэрцам і з чыстай краіны».

Успаміны аб той вольнай светлай краіне ёй былі перададзены ў спадчыну. На ўлонні палескай прыроды яе вуха не раз лавіла аповеды пра вельмі далёкія, і заманлівыя сваёй таямнічасцю і непаўторнасцю часы Вялікага княства. «Літва мая!» — крычала яна і бегла, раскінуўшы рукі, у стракаты чырвеньскі луг, падала на яго мяккі дыван і пазірала ў неба. Аблокі плылі і плылі ў бок Пінска, туды, дзе канчалася ЯЕ Літва і пачыналася Расійская імперыя. І нават калі яе малую бацькі бралі з сабой да пінскага касцёлу і прасілі паводзіць сябе прыстойна, яна задавала ім пытанне: «Ну скажыце, скажыце, мы ўжо едзем не ў Літву?»

Калі яна падрасла, то атрымала ў падарунак выдатную паслухмяную кабылу Гардзюту, на якой аблётала ўсё навакольле. Часам, спыніўшыся дзе-небудзь у лесе, Гэлена саскоквала, брала ў рукі аловак і пачынала маляваць. У асноўным гэта былі невялікія пейзажныя замалёўкі, героем якіх станавілася ўсё тая ж Гардзюта. Была то не жартаўлівая забава, а спроба мастацкага таленту пракласці сабе дарогу.

Ад нараджэння хваравітая, з аслабленым зрокам, не надта прыгожая з твару Гэлена ніколі не рвалася ў кола знакамітых аднагодкаў. Яе цалкам задавальняў свет бацькоўскага дому ў Калодным — родавым маёнтку на Століншчыне. Навакольнае жыццё праламлялася выключна праз лёсы родных і блізкіх, якія былі вялікімі патрыётамі Літвы і не надта ладзілі з маскавітымі. Яе дзядзька (родны брат маці) Напалеон Арда быў для Гэлены легендай. Маці любіла расказваць дачцэ пра свайго таленавітага брата, які жыў дзесьці далёка ў таямнічай Францыі, і вельмі неахвотна распавядала пра прычыны яго ад'езду туды (удзел у паўстанні 1831 года).

Калі Гэлене споўнілася трынаццаць гадоў, каб палепшыць яе здароўе маці павезла яе да дактароў у Вільню. У горадзе меліся прыкметы нястрачанай нацыянальнай асаблівасці, тут бурліла культурнае і асветніцкае жыццё, Вільня заставалася неафіцыйнай сталіцай літвінаў. Урачы катэгарычна забаранілі Гэлене ўсялякае напружанне, звязанае з вучобай. Адзінае, што дазволілі — працягваць маляваць. Для дзяўчынкі выяўленчае мастацтва сталася тым адзіна магчымым жыццёвым прасторам, які ёй неабходна было пераадолець, каб засведчыць у канцы сваю высокую чалавечую годнасць. І яна з радасцю рушыла ў гэты складаны, і пакуль няведамы, шлях.

У трынаццаць год яна вучылася ў Вінцэнта Дмахоўскага выдатнага (па-сучаснаму мовіць, беларускага) мастака, скульптара і знакамітага сцэнографа. Настаўнік быў проста ўражаны талентам сваёй вучаніцы. Ён браў яе малюнкі і з гонарам паказваў знаёмым. У тагачаснай Вільні маладая асоба ўважліва сачыла за палітычнымі падзеямі. Выступы супраць расійскіх улад не суціхалі. У 1838–1839 гг. сярод падазроных і арыштаваных аказалася шмат знаёмых сям'і Скірмунтаў. Арышт, следства, а потым і расстрэл Сымона Канарскага ў лютым 1839 года літаральна скаланулі край. Гэта аказала вялікі псіхалагічны ўплыў на фарміраванне светапогляду юнай мастачкі. Яна зноў вярнулася ў сваю «Літву» ў Калоднае, дзе не адну гадзіну правяла з бацькам у сядле ў конных шпацырах па наваколлю. Пэндзаль яе ў гэты час маляваў мілыя палескія пейзажы.

У 1845 годзе маці неабходна было выехаць за мяжу і яна з задавальненнем узяла з сабой дачку. Васемнаццацігадовая дзяўчына хацела працягнуць адукацыю, але туды, дзе вучыліся юнакі, яе не бралі: дзіва — жанчына мастак! «Трэба пра шлюб думаць, пра кіндэр, кухе, кірхен», — прыблізна так ёй адказвалі ў Берліне. І толькі вядомы марыніст Краўзе, у якога была вялікая сям'я, і ў якога дочкі таксама прысвяцілі сябе мастацтву, згадзіўся даць урокі.

А пасля Берліна быў Парыж, сустрэча з дзядзькам Напалеонам. У Луўры яе гідам быў скульптар Уладзіслаў Аляшчынскі. Два тыдні яна літаральна плавала ў гісторыі мастацтва, захаплялася яго шэдэўрамі, наведваючы то адзін музей, то другі.

Не цяжка зразумець, якія пачуцці авалодалі ёю, калі яна вярнулася ў Калоднае і зазначыла, што з гэтага часу поўнасцю прысвячае сябе творчасці. Вялікая беларуская муза пачала свой палёт, але здароўе пастаянна напамінала аб сабе. У 1852 годзе, ужо замужняя яна вымушана адправілася на лячэнне ў Вену, дзе адначасова паспрабавала наведаць майстэрні славутых майстроў. Даволі ветліва ёй адмаўлялі. Вядомы тагачасны венскі скульптар і медальер Юзаф Цэзар таксама аднёсся да яе з ироніяй, але потым зважаючы не настойлівасці згадзіўся даваць лекцыі. І быў здзіўлены: яго вучаніца так выдатна валодала глінай, быццам ужо некалькі гадоў займалася лепкай! У Цэзара яна засвоіла ўсе тагачасныя віды скульптурнага майстэрства — ад рубкі мармуру да ліцця з бронзы. Захоплены талентам сваёй вучаніцы мэтр палічыў за гонар прадставіць яе сваім венскім сябрам-мастакам: Марку, Прэлёйтнэру, Бауэру і іншым. Калі і саступала яна нечым ім — то толькі ўзростам. У творчых адносінах, дасведчанасці ў гісторыі мастацтва яны размаўлялі нароўні.

Пасля Вены быў Рым, галерэі Ватыкана, велічныя помнікі вечнага горада, практыка ў майстэрні скульптара Пятра Галі. З мастакоў ёй найбольш спадабаўся Авербэк. Яна з задавальненнем наведвала яго дом, праглядала карціны майстра, стары з задавальненнем тлумачыў пра іх асаблівасці. А з Рыма ў Неапаль, Фларэнцыю, Венецыю, Швейцарыю...

Хто ведае зараз тыя імёны, створаныя імі шэдэўры? У школе нам настойліва ўдалблівалі пра непераўзыйдзенасць рускай школы жывапісу, як быццам у той час не было выдатнай еўрапейскай. Была. І наша суайчынніца займала ў ёй не апошняе месца.

Як абшарніца і чалавек, які ведаў стасункі ўласнасці ў Еўропе, Гэлена была гатова павітаць перамены ў жыцці сялянства. Але бяздарная рэформа 1861 года, якую абвясціў царскі ўрад, у момант парадзіла сацыяльны канфлікт. Калі ў Варшаве з'явілія першыя расстраляныя, то лепшыя прадстаўнікі літвінаў — святары, маёмаснікі, інтэлігенцыя, студэнцкая моладзь выступілі ў падтрымку сваіх польскіх субратоў. Палыхаў тады ўвесь Паўночна-Заходні край, чым больш лілося крыві паўстанцаў, тым большымі былі антырасійскія настроі, і, зразумела, што ўзнёслая натура Гелены Скірмунт не магла апынуцца ў баку ад падзей. Пазней тыя, хто ведаў яе, будуць пытацца: «Чаго ёй не хапала?». Паветра Літвы, радзімы. Дух узбунтаваўся ад удушша, хлусні, здрады, чужынскай прысутнасці. Яна вельмі хацела ў родным маёнтку быць жыхаркай Еўропы, а яе цягнулі ў азіятчыну.

Толькі аднойчы паўстанцам запатрабавалася яе дапамога. Ёй належала адвесці неабходную дэпешу ў лес да Траўгута. Гэлена села ў брычку і паехала з маладым фурманам у бок лесу. Аднак у гушчары пабачыла толькі пабітых расійскіх жаўнераў. Спалохалася, павярнула назад. Ля роднага дому, падбухтораны рускімі служкамі, яе ўжо чакаў раз'юшаны натоўп сялян. Фурман ледзьве выратаваў ад самасуду.

Але суд яе не мінуў. Адмералі за тую паездку еўрапейскай мастачцы ссылку ў Тамбоўскую губерню, туды, дзе толькі воўк — таварыш.

Дзённікі Гэлены з падарожжа ў ссылку — адзіныя такога роду абразкі. Ніхто з паўстанцаў не занатаваў для гісторыі з такой дакладнасцю партрэт тагачаснай Расіі: разбітыя дарогі, панурыя паштовыя станцыі, адсутнасць лагічнай, цэльнай забудовы гарадоў, адсутнасць іх архітэктурнага аблічча. Яна была ўражана адсутнасцю парадка на могілках, якія прадстаўлялі сабой ледзь прыкметныя магільныя пагоркі, здзіўлялася скокам пад музычны інструмент — касу. Усё ў гэтым краі «пераможцаў» гаварыла пра вялікую адсталасць Расіі ад Еўропы.

Нязломны дух не дазваляў ёй прасіць літасці. У ссылцы яна імкнулася згуртаваць, аб'ядначаць ссыльных, працягвала мастацкую працу. Тут яна распачала адзін з сваіх апошніх шэдэўраў — галерэю выдатных скульптурных вобразаў на тэму гісторыі ВКЛ. Каб зацікавіць яе ў паспяховым завяршэнні працы, родныя выказалі намер выкарыстаць скульптуры ў якасці шахматных фігур. Мауляў ссыльным будзе цікава біць на дошцы ненавісных ворагаў дзяржавы.

Страчваючы зрок, не маючы скульптурнай майстэрні, Гэлена паспяхова вырашала пастаўленую задачу. Пры гэтым станавілася відавочнай мастацкая ўнікальнасць твораў. Аб гэтым сведчылі як кампазіцыі скульптур, так і тэхніка іх выканання. Але хто ў варожай Тамбоўшчыне мог гэта ацаніць!

Шляхам вялікіх намаганняў яе родным удалося не толькі вывезці скульптуры ў Еўропу, але і выканаўшы шматлікія строгія патрабаванні да экспанатаў прадэманстраваць іх на Венскай выставе 1872 года. Гэта быў трыумф яе духу і таленту, трыумф нашага нацыянальнага выяўленчага мастацтва.

О, пані Гэлена, ты памерла праз два гады ўдалечыні ад роднага дому. Яшчэ праз год «с высочайшего повеления» твой прах дазволілі перавезці на родную Літву — у Пінск. Твой знаёмы, таксама выгнанец, Браніслаў Залескі напісаў пра цябе кнігу «З жыцця літвінкі». Чуеш, ён назваў цябе літвінкай! Ён назваў цябе так у Расійскай імперыі! Ты пытаеш: дзе сёння твая Літва? Што табе адказаць...


Паклон і памінальная свечка помніку Гэлене Скірмунт

УВАГА: КОНКУРС!

## Паважаныя сябры!

З 1 студзеня 2010 года Саюз беларускіх пісьменнікаў абвяшчае новы конкурс на лепшы літаратурны твор, у якім асвятляецца вобраз жанчыны ў сучасным грамадстве і асэнсоўваюцца актуальныя гендэрныя праблемы.

На конкурс прымаюцца тэксты ўсемагчымых жанраў: паэзія, проза, драматургія, крытыка. Аўтарамі конкурсных твораў могуць быць і мужчыны, і жанчыны, і пачаткоўцы, і прафесіяналы.

Лаўрэатаў літаратурнага конкурса **«Жанчына ў сучасным грамадстве»,** які будзе доўжыцца да 1 кастрычніка 2010 года, чакаюць прэміі, прызы і падарункі, а пераможца атрымае магчымасць выдаць свой тэкст асобнай кнігай!

Калі ласка, дасылайце свае творы на адрасы: паштовы — 220025, Мінск-25, а/с 91; электронны — sbp@tut.by.

**Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў**

ЗГАДКІ

# СНЫ МАЕ — ГОТЛАНД

Валерыя КУСТАВА

### «Снёныя званы»

Адно з першых заданняў, атрыманых ад майстра, да якога я паступіла вучыцца на кінадраматурга, было такім: напісаць (вядома, у выглядзе мастацкага твора) пра тое месца і той час, дзе і калі мяркуеш памерці. Мой прыдуманы час быў — праз дванаццаць гадоў (потым аказалася, што і праўда ў пісьменнікаў звычайна ў перыяд ад трыццаці сямі гадоў і здараецца душэўны крызіс, які яны мусяць (ці не мусяць) пераадолець. Маё месца, як цяпер памятаю, выглядала так: дом на беразе мора поруч з храмам, са званіцаю, а з вокнаў бачныя неба, мора і той самы храм. Напраўду, прачнуўшыся, са сваіх вокнаў я бачу дзве вялікія (адну — чырвоную, другую — зялёную) шыльды з надпісамі «Аптэка» і «Крама». Таму адмыслова кожную раніцу, калі прачынаюся, колькі хвілін не ўстаю, ляжу і ўглядаюся — менавіта на такім ўзроўні з майго ложка можна бачыць выключна нябёсы, у чыстым выглядзе, як у рамачцы, адная ранішняя сінеча, крыху затуманеная, як шыба ў замерзлым за ноч восьмым тралейбусе...

Калі я прачнулася ў Візбю, вокны майго пакоя выходзілі на мора, нябёсы і храм са снёнаю званіцаю. Час ішоў (не ішоў — мінаў) абсалютна неадчувальна, хіба толькі званы, — чый гук рассыпаўся па-над горадам, пералятаючы сцяны, якой быў акружаны Візбю, і бераг, якім ён акальцаваны, — адлічвалі рух быцця. Здаралася, прачынаешся ўначы: дзе ты? А ў адказ табе: бом-бом-бом-бом... «Чатыры... І як жа званар штогадзіну прачынаецца, хто ж яго будзіць...» — скрозь сон спрабуеш прамовіць ты і зноў занураешся ў падушку бясчасся. Але думкі пра скон неяк самі сабой адступалі, паміраць расхацелася. На кожным узгорку, на кожным куце тут, на Готландзе, цікавала штосьці немінучае, невымоўнае. А паколькі ў мяне па плане было пераасэнсоўваць, то планам маім, як ніякім іншым, лёсіла спраўдзіцца. Я трапіла на дванаццаць гадоў наперад. І не толькі ў сваіх індывідуальных сненнях, а ў сненнях Беларусі.



Фота Дзмітрыя Плакса

На фоне — Стакгольм



З трольным вікінгам

### «Як звычайна пачынаюцца казкі...»

Усё пачалося, як звычайна пачынаюцца казкі. Раптоўная прапанова паездкі ў Балтыйскі дом творчасці заспела мяне ў Варшаве, акурат на наступны дзень пасля прэзентацыі маёй літаратурнай праграмы «Кахай мяне па-беларуску». Уражанне ад таго, што адбываецца, было ўзмоцненае і тым, што пасля паездкі ў Польшчу я трапіла на які тыдзень у сталіцу Туркменістана Ашхабад — і адтуль, з сэрца Азіі, пабыўшы толькі суткі ў Менску, праз Рыгу адправілася з задумамі новай кнігі ў сэрца Скандынавіі — Стакгольм.

У Стакгольме маім адаптатарам да Еўропы быў лёсаабраны амбасадар беларускай культуры ў Швецыі, вялікі выдумляльнік і спраўнік Дзмітры Плакс. Цяпер ён стала замацаваўся ў асацыятыўным шэрагу ці не кожнага беларуса, якому даводзілася мець хоць якія культурніцкія кантакты са шведамі. І так, цяпер, пачуўшы «Швецыя», усе беларусы дружна будуюць наступны асацыятыўны ланцужок: «Карлсан — Стэфан Эрыксан — Дзмітры Плакс». Вось яны — рухавікі беларуска-шведскага нашага ўсяго.

Плакс забраў мяне з аэрапорту і павёз у адмысловае сакрэтнае месца, з якога была бачная панарама ўсяго Стакгольма. Потым мы гулялі па старым горадзе, у якім канцэнтрацыя гістарычных падзей на адзін квадратны метр мяне сапраўды захапляла. «Гэта найстарэйшая ў Стакгольме піўная рэстарацыя, пойдзем? Гэта помнік Георгію Перамоганосцу, а гэта тут так крыва вуліцы ідуць, бо дэмакратыя — хто дзе хацеў, той там і будаваў, а во помнік шведскаму паэту, а гэта помнік шведскаму Скарыну, а вось Каралеўскі Палац, а вось Вежа Карла XII, а тое тэатр Оперы і балета, а тут крама з пальчаткамі, зойдзем, дапаможаш мне выбраць, а то ўжо рукі мерзнуць на стырне...» — экскурсіраваў абазнаны Плакс. І мне было цікава ўсё, нават крама з пальчаткамі. Бо з любой крамы на мяне паглядалі вікінгі і тролі, бо ў любой краме можна было сустрэць традыцыйна-шведскіх вожыкаў, авечак, ласёў і Піпі Доўгуюпанчоху... Праўда, мяккіх і бяскрыўдных...

### «Ёсць такая прафесія»

Мне пашчасціла правесці цэлы месяц у Балтыйскім цэнтры пісьменнікаў і перакладчыкаў. Упершыню напоўніцу адчула, што ёсць такая прафесія — літаратар, паэт. Цэлы месяц займалася сваёй улюбёная справай: пісала вершы, перакладала, распачала кнігу прозы. Тут створаныя абсалютна ўсе ўмовы для больш чым камфортнага жыцця, для пісання. З аднаго боку, ты аддадзены толькі самому сабе і сваім думкам. З іншага — пры жаданні ёсць выдатныя магчымасці для завязвання кантактаў са сваімі іншамоўнымі калегамі, стварэння задумаў новых праектаў. Ды і ўвогуле гэта проста вельмі і вельмі натхняльна. Ты апынаешся ў пісьменніцкай сям'і, нават шырэй — у еўрапейскай супольнасці, дзе спрацоўваюць прынцыпы цывілізаванага грамадства, дзе прыярытэтнымі з'яўляюцца еўрапейскія каштоўнасці.

Гэта была сапраўдная скандынаўская казка. Я гуляла па начах. Я шукала вожыкаў. Я назірала за белымі лебедзямі, якія жылі наўпрост у моры, на хвалях. Я заспела восень ва ўсёй яе красе. Штодзень брала ровар і ехала ў горад: па перападзістых — то ўверх, то ўніз — брукаваных вуліцах, па марскім узбярэжжы, уздоўж сцяны.... Калі прыляцела (трыма самалётамі!) на выспу, было так цёпла, што некаторыя яшчэ купаліся, дрэвы стаялі ўсе ў яблыках, грушах і лістах, зелянелі пааcобныя пальмы, кусты малінніку прыгіналіся ад саспелых ягадаў, шыкоўная фаўна Готланда толькі пачынала прымяраць кастрычніцкую расфарбоўку. А ў дзень майго ад'езду выпаў першы снег. То бок перыяд майго знаходжання быў самым жаданым для любога паэта: самы смак восені, ва ўсёй яе красе ды сіле. Хацелася пабываць ці не ва ўсіх вартых месцах са спісу, які па маёй просьбе склала Веранiка Эрыксан, але разам з тым, хацелася выканаць і яе просьбу: «Ты толькі пішы, пішы!». І мне пісалася, пісалася соладка, як у восеньскія дажджы, пісалася са светлым сумам, як пішацца не дома, пісалася з той моцаю ды інтэнсіўнасцю, з якой пішацца, калі карціць занатаваць штосьці найістотнейшае, да чаго даўно ішла, што выношвала не адзін месяц і нат не адзін год.

### «І набываеш сваю праўду»

Увачавідкі на сабе самім ты адчуваеш жыццё без аглядкі назад (на Візбю нават заўсёды расфіраненыя вокны знаходзіліся на ўзроўні вачэй мінакоў!), жыццё спакойнае і ўладкаванае, дзе ніхто нікуды не спяшаецца (бо ўсе ўжо даўно сябе знайшлі), жыццё, узровень якога якасна сягае за ўсё тое, што ты толькі ўяўляў, — гэта жыццё еўрапейца, жыццё Еўропы. Што казаць: у шведаў нават на грашах — пісьменнікі. Пісьменнікам тут ставяць прыжыццёвыя помнікі, будуюць вялізныя бібліятэкі. Сваіх пісьменнікаў тут ведаюць на вуліцах. У Швецыі прэстыжна быць пісьменнікам...

Што ж да Еўропы, то на сваёй скуры: у побыце, у размовах, у крамах і на вуліцах, — ва ўсім адчуваеш на кожным кроку: Еўропа — гэта не калі ў цябе ёсць выбар, а калі ты можаш з яго скарыстацца і скарыстоўваеш.

Выдатна, што сюды могуць трапіць менавіта беларускія творцы. Вечна засяроджаным на нацыянальнай праблематыцы, закаваным у абставіны, ім неабходна часам вольна ўздыхнуць і паглядзець на ўсё збоку. У галаве робіцца ясна, і ты страчваеш «супольную» праўду — і набываеш сваю, уласную...

### «Расчытаць Беларусь»

У самы першы вечар свайго прыезду ў чаканні, пакуль закіпіць імбрык, я мыла вала — рука неяк сама пацягнулася да запацелай ад пары шыбы — Belarus. А за вакном было цёмна. І нейкі высокі доўгавалосы хлопец памахаў мне рукой, відаць, падумаў, што ў яго так пільна ўглядаюся. Я памахала наўзаем.

Калі чарговы раз ставіла ваду, каб запарыць гарбату, і кожны раз бачыла напісаную на шыбе Беларусь, то лавіла сябе на думцы, што вось з'еду я, а Беларусь мая і тут застанецца, і мо хто потым прачытае гэты надпіс і ўсміхнецца. Можа, тое і не вельмі файна — пісаць на чужых шыбах сваю Беларусь. Але тут усе пісьменнікі...

Так, мне хацелася пакінуць тут частку сябе, як хочацца пісаць сваё імя на пяску, на які праз імгненне набяжыць хваля...

Усе мы, людзі, мякка кажучы, паэтычныя, крыху нядбайлы і маем патрэбу ў тым, каб пра нас хоць крыху хтосьці клапаціўся. У Візбю гэтую ролю на сябе мужна ўзяла Алена Пастарнак — дырэктарка Дома творчасці — і яе памагаты Патрык. Алена валодала ўсімі тымі мовамі, на якіх толькі размаўлялі госці і насельнікі дома. Мне пашчасціла займець прыязныя размовы з калегамі з Амерыкі, Грузіі, Латвіі, Ірландыі, Польшчы, Славакіі, Эстоніі, Літвы, Расіі і, вядома, Швецыі.

Кухня — была знакавым месцам у доме, туды, набыўшыся сам-насам са сваімі героямі, насмеліўшыся на кантакт, сцякаліся пісьменнікі з усіх канцоў свету. Перадусім на кухні рознамоўныя пісьменнікі і інтэграваліся, шукаючы супольныя дзеля паразумення мовы. Маёй аддушынаю была польская перакладчыца Ганна — з ёй я спакойна і з прыемнасцю магла практыкавацца ў польскай, з гаспадыняй дома спадарыняй Аленай практыкавалася ў расійскай, з астатнімі ж, — перадусім са Шведамі — падцягвала ангельскую. З кухні глыбока ўначы я сыходзіла больш еўрапейкаю, а яны — крыху беларусамі.

...Усё пачалося як казка. І скончылася як казка. І цяпер мне сняцца сны пра Готланд: неба, мора, званіца і брукаваныя вулачкі ў кірунку маёй душы...

23 лістапада — 14 снежня 2009



Панарама сталіцы

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 7 ЛЮТАГА, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.30** Сямейная камедыя «Пераможцы ў шоў» (ЗША).
**09.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** У свеце матораў.
**11.30** Nota Bene.
**12.00** Навіны.
**12.10** Лірычная кінаааповесць «Дажывём да панядзелку» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**14.35** Фэнтэзі «Гары Потэр і філасофскі камень» (ЗША-Вялікабрытанія).
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**17.40** Алімпійскі часопіс.
**18.00** Суперлато.
**19.00** Навіны.
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.05** Прэм'ера. Рамантычная камедыя «Прыгажунчык» (Германія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** «Песні Перамогі».
**13.30** Фільм «Двое і адна».
**15.00** Прэм'ера. «Белка, Стрэлка і іншыя...».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Тэорыя неверагоднасці.
**16.50** Фільм «Матчын інстынкт».
**18.40** «Ірына Радніна. 6.0». Юбілейны вечар.
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** КІВІН-2010 у Сочы.
**00.05** Камедыя «Маё першае вяселле».

### СТВ

**06.55** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.45** Фільм «Даспехі бога 2: аперацыя Кондар». Ганконг, 1991 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Мастацкі фільм «Каралі і капуста». СССР, 1978 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Мастацкі фільм «5 невядомых». ЗША, 2006 г.
**22.20** Мастацкі фільм «Ідзі з неба «. Мексіка, 2006 г.
**00.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.15** Дабравест.
**07.40** Мір вашай хаце.
**07.50** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Эксцэнтрычная камедыя «Сямейка Ады» (Расія).
**10.00** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.45** Кінаспробы.
**12.05** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**13.00** Футбол. Эўра-2012. Лёсаванне адборачнага турніру. Прамая трансляцыя.
**13.50** Дэтэктыў «План «Б» (Расія). 6-8-я, заключная, серыі.
**16.30** Жаночая ліга.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-Віцязь (Чэхаў). Прамая трансляцыя.
**19.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Чэлсі-Арсенал.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.35** Экспедыцыя.
**22.05** Авантурная камедыя «Вялікі Стэн» (ЗША).
**00.00** Свая музыка. Працяг.
**00.30** Пасоўванне +.

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Пажар». Расія, 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** Мастацкі фільм «Пажар». Расія, 2010 г. Працяг.
**12.10** Мастацкі фільм «Вялікае каханне».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Вялікая выстава пяцьдзесят дзявятага». Дакументальны фільм.
**15.30** Фільм «Вершнік без галавы».
**17.15** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.20** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.20** Мастацкі фільм «Журботная дама чарвякоў». Расія, 2007 г.

### НТВ

**06.10** Камедыя «Сустрэча з бацькам».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.45** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўская кухня». Прыслуга.
**14.10** Камедыя «Прышэльцы».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Следапыт».
**00.00** «Авіятары».

### EUROSPORT

**09.30** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**09.35** Санкавы спорт. Кубак свету ў Італіі (Турын).
**10.00** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145.
**11.30** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Швецыі. Жаночыя спаборніцтвы. Спрынт.
**12.30** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Швецыі. Жаночыя спаборніцтвы. Гонка пераследу.
**13.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы-2012. Лёсаванне. Прамая трансляцыя.
**13.45** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Катара. 1-ы этап.
**14.30** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145.
**15.30** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145. Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**17.25** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**17.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Канадзе (Кэнмор). Мужчыны і жанчыны. Спрынт класічным стылем.
**18.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Эстоніі (Талін). Паказальныя выступы.
**20.00** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145. Камандныя спаборніцтвы.
**21.15** Бокс.
**23.00** Шары (боўлінг). Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ланэлі, Вялікабрытанія). Фінал.
**00.00** Скачкі на лыжах з трampліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145. Камандныя спаборніцтвы.
**01.30** - 02.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Канадзе (Кэнмор). Мужчыны і жанчыны. Спрынт класічным стылем.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.20** Дакументальная гадзіна: «Белы тэрор», дак. фільм, 2006 г., Францыя.
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**20.00** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.30** Фільматэка майстроў: «Ад-магілы-да-магілы», Мастацкі фільм, 2005 г., Славенія.

---

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ______
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

КАМЕНТАРЫ

# СЦЯПАН БАНДЭРА — ГЕРОЙ УКРАІНЫ

Алег ПЯТРОЎ

**Тэмай нумар адзін на расійскіх інтэрнэт-форумах на мінулым тыдні было супярэчлівае рашэнне прэзідэнта Ющанкі ўзнагародзіць лідэра ўкраінскіх нацыяналістаў Сцяпана Бандэру званнем Герой Украіны.**

Бандэра — даволі адыёзная фігура, сімвал антырасійскага супраціву. Тым больш парадаксальна, што ў рунэце знайшлося дастаткова шмат людзей, якія падтрымалі ўчынак украінскага гаранта. Хто яны — расійскія аматары лідэра АУН, і якія ў іх аргументы? Прапаную агляд расійскай блогасферы.

Перш за ўсё, трэба адразу адкінуць каментары прыкалістаў, для якіх інтэрнэт — гэта канал для правакацый і жартаў. «Варта аддаць належнае пакуль яшчэ Прэзідэнту Украіны Віктару Ющанку — ён не замарочваецца і напрыканцы нараджае даволі крэатыўныя рэчы», — піша адзін з прадстаўнікоў гэтай групы. Ён таксама заклікае ў дадатак надаць званне Героя Украіны Астапу Бендэру.

Што да расійскіх аматараў Бандэры, якія маюць свядомую пазіцыю, то перш за ўсё гэта, натуральна, антыкамуністы. Праўда, тут вельмі шмат эмоцый. Так, адзін з іх піша ў сваім блогу: «Ва ўмовах сучаснага жыцця Бандэра для мяне сапраўды асоба гераічная па адным простым параметры — ён ненавідзеў усёй душой чырвоных д'яблаў, а ягоныя хлопцы паспелі задраць асобных сталінскіх пацукоў накшталт Ватуціна. Калі ў блакадным Ленінградзе Жданаў і ўся партыйная верхавіна блінцы гарачыя жэрла, калі энкавэдзісты чынілі тэрор на ўсёй СССР, калі адмарозкі ў пагонах кшталту Жукава гналі людзей тысячамі на кулямёты, праводзячы партыйную сталінскую лінію, — я не магу не пацешыцца і не сказаць «дзякуй» тым, хто хоць аднаго бальшавіцкага вырадка адправіў у пекла».

Другі значны сегмент расійскіх «бандэраўцаў» — лібералы, якія не хочуць, каб новая Расія выконвала функцыі рэгіянальнага жандара.

Вось іх думка: «Так, нашы бацькі і дзяды перамаглі фашысцкіх захопнікаў — гэтага ніхто не смее аспрэчваць… Але ці маюць права іх унукі і праўнукі павучаць увесь белы свет, у якіх месцах у іх павінны стаяць пакінутыя намі помнікі, як павінны выглядаць іх нацыянальныя падручнікі і якія шэсці ў іх гарадах іх улады і грамадскасць павінна дазваляць, а якія — не… Як і тое, каго лічыць іх нацыянальнымі героямі? …Сумняваюся ў такім нашым праве… Можа, нам не трэба так настойліва лезці ў чужую гісторыю? Няўжо ў нас сваіх гісторый бракуе?»

Асобная група — тыя, хто параўноўвае Бандэру і Сталіна: «Не разумею людзей, якія лічаць Бандэру здраднікам і адначасова захапляюцца Сталіным (а такіх у нас абсалютная большасць). Бандэра ўжываў тэрарыстычныя метады, забіваў мірных грамадзян — гэта дрэнна. Але хіба не тым самым займаліся бальшавікі? Хіба не тым самым займаліся і пасля рэвалюцыі? Бандэра ваяваў супраць савецкай улады — гэта дрэнна для савецкай улады. Ён лічыў (і небеспадстаўна!) СССР акупантам украінскай зямлі і прыгнятальнікам свайго народа. Бандэра з 1939-га па 1941 гады супрацоўнічаў з нацысцкай Германіяй — гэта дрэнна. Але тым жа самым тады займаўся і Сталін! Адзін арганізоўваў навучанне сваіх байцоў афіцэрамі вермахту, а другі забяспечваў вермахт рэсурсамі. Хто прынёс больш карысці Гітлеру? Бандэраўцы заклікалі забіваць (і, відавочна, забівалі самі) нацменшасці (палякаў, габрэяў і рускіх) — гэта дрэнна. Але наш галоўны спецыяліст па нацыянальным пытанні займаўся прыкладна тым жа, але ў значна большых маштабах».

Адзін з блогераў нагадвае, што «па ініцыятыве замежнага аддзела Расійскай праваслаўнай Царквы (РПЦ) разглядаецца пытанне наконт прызнання Уласава змагаром супраць бальшавізму». Зрэшты, піша аўтар, «замежны аддзел РПЦ яго такім ужо прызнаў».

Найбольшую падтрымку аднак знайшоў тэзіс пра тое, што Масква не мае права крытыкаваць Кіеў, паколькі сама дае званне Герой Расіі паводле вельмі дзіўнага прынцыпу. Размова пра нядаўняе рашэнне надаць званне Героя чачэнскаму кіраўніку Аслану Кадыраву, які, як вядома, пачынаў кар'еру ў шэрагах байцоў Дудаева.

Вось тыповы каментар на гэты конт: «Віктар Ющанка надаў званне Героя Украіны Сцяпану Бандэру, лідэру Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў. Асоба неадназначная, больш за тое, шмат у чым (мяркуючы па міфах і штампах) адыёзная. Чалавек, вялікая частка сям'і якога была рэпрэсавана, і які змагаўся за незалежнасць сваёй краіны. Украіна — гэта незалежная дзяржава, і мэта Сцяпана Бандэры дасягнута. Прэзідэнт гэтай краіны прысвойвае званне Героя барацьбіту за незалежнасць. Чаму зноў такое выццё пачынаюць камуністы і тыя, хто з імі? Значыць, прысвойваць званне Героя Расіі чалавеку, які са сваімі падручнымі рэзаў глоткі маладым хлопцам у Чачні, можна? Абсалютна не разумею гэту логіку… Можа, ужо час зразумець, што Украіна — гэта не рэспубліка Расійскай Федэрацыі?»

Нарэшце, самая экзатычная фракцыя аматараў Бандэры ў Расіі заклікае ненавіснікаў Бандэры «не парыцца», паколькі сам Бандэра ніколі б не прыняў падобную ўзнагароду з рук былога камсамольскага правадыра (Ющанка за савецкім часам быў сакратаром камсамольскай арганізацыі).

«Гадоў дзесяць таму адзін з кіраўнікоў АУН і галоўнакамандуючы УПА Васіль Кук адмовіўся прыняць званне Героя Украіны з рук Леаніда Кучмы. Пагадзіцеся: Шарль дэ Голь таксама наўрад ці прыняў якую-небудзь узнагароду з рук Вішыскай рэспублікі, у якой байцы Супраціву дагэтуль лічыліся б злачынцамі. Сцяпан Бандэра, які быў змешчаны ў канцлагер Заксенхаўзен адразу пасля таго, як адмовіўся ануляваць Акт аднаўлення УНР ад 30 чэрвеня 1941 года, наўрад ці палічыў бы цяперашнюю ўкраінскую дзяржаву той самая дзяржавай, стварэнню якой прысвяціў усё сваё жыццё. Таму, думаю, Віктару Андрэевічу пашанцавала, што Бандэра і Шухевіч загінулі паўстагоддзя таму. У выніку ў яго з'явілася выдатная магчымасць рабіць піяр на іх памяці», — дзеліцца думкамі адзін з блогераў.

Застаецца дадаць, што прыхільнікаў пералічаных вышэй падыходаў адносна Бандэры ў расійскай грамадскасці абсалютная меншасць. Аднак, у любым выпадку, гэтая група прысутнічае, і яна дастаткова заўважная.






Дэпутат райсавета Севастопаля Канстанцін Зарудныеў дэманстратыўна спаліў свой пашпарт на знак пратэсту супраць прысваення звання Героя Украіны Сцяпану Бандэру



У Львове з'віўся шасцімятровы бронзавы Бандэра

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Скептычна ставяцца эксперты да перспектыў беспраблемнага функцыянавання Мытнага саюза. У двухбаковым фармаце такі саюз Расіі і Беларусі быццам бы і так існаваў ужо амаль 15 гадоў. Тым не менш, пошліны на цэлы шэраг тавараў, пачынаючы з аўтамабіляў, так і не былі ўзгодненыя. І, безумоўна, базавай супярэчнасцю тут будзе пытанне энергетыкі, Беларускія ўлады ніколі не хавалі, што для іх галоўным фактарам удзелу ў гэтым Саюзе ёсць атрыманне энерганосьбітаў па ўнутрырасійскіх коштах. Расія хацела б, у сваю чаргу, атрымаць уласнасць на тэрыторыі Беларусі. Гэта значыць, матывацыя абедзвюх дзяржаў розная, і сутыкненні непазбежныя. Але спадар Лукашэнка наўрад ці пойдзе на фармальны выхад з Мытнага саюза. За апошнія 15 гадоў ён выдатна навучыўся карыстацца механізмамі мытных адносін паміж Расіяй і Беларуссю так, як гэта яму зручна.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Ён (Лукашэнка) будзе блефаваць, даваць абяцанні Захаду, але ўсё адно — з аглядкай на Маскву. Наўрад ці падобная гульня зменшыць градус эканамічных і палітычных адносін з Расіяй. І сацыяльна-эканамічная, і палітычная, і ваенная беларускія мадэлі значна бліжэй да тых мадэляў, якія існуюць у Расіі, чым да тых, што на Захадзе. Адсюль можна казаць пра тое, што калі Лукашэнка «пойдзе» на Захад, то і мадэль развіцця павінна будзе адаптоўвацца да заходняй. Гэта будзе патрабаваць ад беларускага кіраўніцтва трансфармацый і можа паставіць пад пытанне аўтарытарную сістэму, якая існуе ў Беларусі апошнія пятнаццаць гадоў.

**«Росбалт» (Расія)**

Казахстан на мінулым тыдні паспрабаваў змяніць правілы гульні. Астана заявіла, што калі Расія адмовіць Мінску ў нафце і газе, то яна зможа замяніць Маскву ў справе паставак энерганосьбітаў. Ва ўсім свеце такая дамова лічылася б абсалютна звычайнай, трывіяльнай справай. Але не на постсавецкай прасторы. Рэакцыя Масквы на тое, што дзве былыя савецкія рэспублікі могуць паспрабаваць дамаўляцца за спіною Крамля, наўрад ці будзе ўспрынята пазітыўна. Прапанова Астаны, аднак, паказвае, у прыватнасці, што шматлікія рэспублікі былога СССР ужо не баяцца гневу Масквы. Альянс Беларусі і Казахстана — самых блізкіх саюзнікаў Расіі — у будучыні можа моцна аслабіць уплыў апошняй. Хаця аналітыкі схільныя лічыць заявы Казахстана блефам. Гандаль Беларусі і Казахстана шмат у чым злучаны з Расіяй, і пакуль гэтыя краіны не гатовыя быць сістэмнымі апанентамі Маскве.

**«Time» (ЗША)**

Альтэрнатывай палітыкі неалібералізму ў эканоміцы для Украіны можа быць толькі варыянт аўтаркіі, блізкі да беларускага. Адсюль і нечаканае збліжэнне Аляксандра Лукашэнкі з украінскім кіраўніцтвам напярэдадні выбараў. Візіт Лукашэнкі ва Украіну не сарваў нават свіны грып, не тое што «аранжавая чума». Інтуіцыя «Бацьку» не падвяла, ён дакладна адчуў у Цімашэнцы верагодную «матухну» для Украіны і ўсе плюсы падобнага супрацоўніцтва».

**«Левый берег» (Украіна)**

Дарэчы, пра аўтамабілі. Беларусь, уступіўшы ў Мытны саюз, узяла на сябе абавязкі павялічыць пошліны на ўвоз іншамарак да расійскага ўзроўню. Так што наш шматпакутны аўтапрам атрымлівае новы рынак збыту, што, мабыць, не выклікае эйфарыі ў простых беларусаў. Апошнія даўно адвыклі ад «жыгулёў» і ездзяць на недарагіх, але надзейных старых іншамарках.

**«Калининградская правда» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. ЧУВАШЫ ПАЎСТАЛІ ЗА ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ



Секцыя Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі (КПРФ) у Чувашыі заклікала чувашоў падняцца на абарону дзяржаўнасці. Усё пачалося 21 студзеня, калі Барыс Грызлоў, кіраўнік урадавай партыі «Адзіная Расія», нечакана падтрымаў даўнюю ідэю Жырыноўскага — правесці адміністратыўную рэформу, якая павінна пакончыць з малымі нацыянальнымі аўтаномнымі рэспублікамі. «Суб'ект федэрацыі — гэта вялікае імя. Яму трэба адпавядаць. На маю думку, калі суб'ект федэрацыі жыве за кошт сваіх суседаў, ён не мае права так называцца. Трэба шукаць новыя падыходы да працы ў такім суб'екце або ўключаць яго ў склад іншага». У Чувашыі, якая з'яўляецца датацыйным рэгіёнам, словы Грызлова зразумелі як «чорную метку». Больш за ўсё незадаволеныя камуністы, якія прыдумалі цікавы адказ на пытанне, хто вінаваты ў тым, што Чувашыя бярэ грошы ў суседзяў. Чувашскія зюганаўцы сцвярджаюць, што іх рэспубліка стала праблемнай, як толькі сканаў Савецкі Саюз. Раней Чувашыя быццам была квітнеючай і перадавой. Усё, натуральна, дзякуючы камуністам. Не забылі згадаць чувашскія камуністы і пра тое, што сваю прамову Грызлоў агучыў у дзень, калі ў 1924 годзе памер Уладзімір Ленін. У Чэбаксарах (сталіца Чувашыі) пабачылі ў гэтым вялікі цынізм, паколькі менавіта Ленін, як гаворыцца ў заяве, даў чувашам у 1920 годзе дзяржаўнасць.

**Па матэрыялах КПРФ (Расія)**

### ВЕНЕСУЭЛА. АМЕРЫКАНЦЫ ВЫКЛІКАЛІ ЗЕМЛЯТРУС НА ГАІЦІ

Урадавая прэса Венесуэлы абсалютна сур'ёзна сцвярджае, што за землятрусам на Гаіці стаіць Пентагон. Быццам янкі ладзілі на Карыбах выпрабаванне новай зброі, што і выклікала катастрофу. Пры гэтым эксперты па землятрусах спасылаюцца на нейкія матэрыялы расійскага вайсковага флоту, што нібыта падзяліўся з братамі-венесуэльцамі сакрэтнымі файламі. У дэталях гісторыя выглядае наступным чынам: яшчэ з 1970-х гадоў амерыканцы працуюць над новым відам зброі, так званай сейсмічнай зброяй. Яна здольная выклікаць у краінах, з якімі ЗША маюць дрэнныя адносіны, маштабныя землятрусы. Сцвярджаецца, што самыя вядомыя апошнія землятрусы (напрыклад, у Кітаі ў маі 2008 года) былі не чым іншым, як вынікам выпрабавання той самай зброі. Гаіці стала чарговай краінай, на якой эксперыментавалі ў Пентагоне. Што далей? Зноў жа, са спасылкай на расійскіх маракоў, блізкія да Чавеса СМІ кажуць, што бліжэйшым часам трэба чакаць штучных землятрусаў у Іране, у выніку якіх падзе рэжым варожых Вашынгтону аятолаў.

**Па матэрыялах «Gazeta Wyborzca» (Польшча)**

### ЗША. ПАРТЫЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ВЕРМОНТА ІДЗЕ ВА ЎЛАДУ




Партыя незалежнасці Вермонта выставіла сваіх кандыдатаў на выбары губернатара і ў сенат штата. Кандыдатам на губернатарскую пасаду стаў ветэран Дэніс Стыл. У выпадку перамогі Стыл абяцае выхад Вермонта са складу федэрацыі. У прынцыпе, падобныя рэчы — балаціроўка сепаратыстаў ва ўладу, адбываюцца даволі часта ў розных штатах. Асаблівасць сітуацыі ў Вермонце ў тым, што штат сапраўды нейкі час быў незалежнай дзяржавай. У 1777 годзе мясцовая міліцыя выбіла з краю брытанскіх жаўнераў і абвясціла пра стварэнне Рэспублікі Вермонт. Дзяржава існавала да 4 сакавіка 1791 года. У гэты дзень яна ўвайшла ў склад ЗША як чатырнаццаты штат. Пасля гэтага абарыгены забылі пра незалежнасць аж да 2003 года, калі Томас Найлар апублікаваў кніжку «Маніфест Вермонта», дзе заклікаў адрадзіць незалежны Вермонт, які павінен, па яго словах, быць нейтральным і будаваць паводле федэральнага прынцыпу. Ідэя была ўспрынятая на ўра, і за некалькі гадоў у штаце сфармавалася нават асобная палітычная сіла прыхільнікаў самастойнасці. А адзін з вермонцкіх сенатараў Берні Сандэрс нават называе сябе «дэмакратычным сацыялістам».

**Па матэрыялах «Boston Globe» (ЗША)**

НАТАТКІ

# КОСАВА — ЦЯЖКІ ШЛЯХ

*Уладзімір ВЯЛІЧКІН, праваабаронца, Брэст*




Фота аўтара

**У наш час развітых камунікацый няцяжка атрымаць і сабраць самую разнастайную інфармацыю пра падзеі ў любым рэгіёне свету. І скласці свае пра іх уяўленне, прычым дастаткова ўсебаковае. Але такім уяўленнем не стае адчування эмацыйнага нерву падзей. У гэтым я пераканаўся, калі мне пашчасціла патрапіць гэтай восенню ў склад міжнароднай місіі назірання за выбарамі ў Рэспубліку Косава. Краіну, што з'явілася на мапе свету ў 2008 годзе ў выніку рэалізацыі плана Ахтысаары.**

У Прышціне па прыездзе нам паведамілі, што ў новаўтворанай краіне шэраг міжнародных арганізацый і місій ажыццяўляюць дапамогу ва ўмацаванні і развіцці структур улады, але ENEMO сярод іх — адзіная міжнародная місія па маніторынгу і назіранні за выбарамі. Прадстаўнікі Міжнароднага грамадзянскага офісу — Адмысловага прадстаўніцтва Еўрасаюза (ICO — EUSR) азнаёмілі нас з сітуацыяй у Косава, што склалася на працягу першага года пасля абвешчання незалежнасці, і прадставілі нам адказнага за нашу бяспеку афіцэра.

«Калі штО — паведамляйце, прымем меры, па традыцыі тут «ствол у кожнай хаце», — сказаў ён.

— Не бачылі мы ніякай зброі, — запярэчылі мы.

— На заднім падворку хаваюць... Бывае, усплыве дзе-ндзе, галоўнае — не апынуцца ў благім месцы ў неадпаведны час. Бывае, заб'юць каго, гранату на дыскатэцы кінуць...

— Вы да нас прыедзеце, калі што?

— Не. Паведамім каму трэба. Абы-дзе не бадзяцца, абы-чаго не чапаць, за надпіс «мінное поле» — не заходзіць.

На развітанне нам далі картку з нумарамі экстраных выклікаў.

## Горад у гарах

Месцам наглядання за выбарамі прызначылі нам горад Прызрэн, што знаходзіцца ў гарах побач з межамі Албаніі і Македоніі.

Праз горад бяжыць невялікая горная рачулка, якая ператвараецца ў магутную і бурлівую плынь пасля дажджу. Над горадам узвышаецца старажытная асманская фартэцыя. Вакол маляўнічыя горы, скалы, бездані, каньёны. Горад часамі губляецца ў аблоках, але часцей тут, здаецца, можна дакрануцца да блакітнага неба, павітацца з сонцам, а ўначы заблукаць сярод зорак.

У самім горадзе 27 мячэцей, адзін касцёл, праваслаўныя цэрквы амаль усе папаленыя ці разбураныя. На адной з іх пад ахоўвай вайсковай паліцыі нямецкіх міратворчых сілаў (KFOR) замацавалі звон. Па афіцыйных звестках, у вобласці засталося 160 сербаў, у самім Прызрэні — дзве састарэлыя сям'і.

Людзі тут размаўляюць на некалькіх мовах (албанскай, турэцкай, сербскай) і цудоўна разумеюць адзін аднаго. Выключна ветлівыя, прыязныя і працавітыя. Шмат хто апранаецца ў традыцыйную нацыянальную вопратку.

Адразу па прыездзе ў Прызрэн мы скантакталіся з нашым сек'юрыці і з яго дапамогай вызначыліся, з кім у гэтай вобласці нам давядзецца ўзаемадзейнічаць. Сустрэліся з прадстаўнікамі Еўрапейскага корпуса суддзяў (EULEX), якія дапамагаюць мясцовым уладам у функцыянаванні паліцыі, судовай і мытнай сістэмаў.

Кіроўца, якога мы нанялі, акрамя трох ужо згаданых моваў, ведаў яшчэ цыганскую і... рускі мат, які ён засвоіў пару год таму ад нейкага Івана — расійскага міратворца. Свае адносіны да іншых удзельнікаў дарожнага руху наш кіроўца выказваў эмацыйна: «Казззззёл!» На працягу месяца я намагаўся паўплываць на яго і замяніць мярзотнае «пі...» на мілагучнае беларускае «Гамон!» Урэшце той перайшоў на англійскую мову.

## Зброя

У нашых вандроўках нам часта трапляліся на вочы знакі пра забарону ўваходзіць са зброяй — дзе з пісталетамі, дзе з аўтаматамі.

Адзін нямецкі палкоўнік распавёў падчас нефармальнай гутаркі, што ў насельніцтва шмат баявой зброі, што яны пастаянна фіксуюць выпадкі палявання з выкарыстаннем баявой зброі, але затрымаць нікога не ўдаецца. Выказаў шкадаванне, што пасля хваляванняў у 2004 годзе здача зброі праводзілася на добраахвотнай аснове. У выніку насельніцтва старыя паляўнічыя стрэльбы здавала і набывала сучасныя вінтоўкі і аўтаматы.

«Зброі шмат, толькі мы яе не бачым», — падсумаваў палкоўнік.

Каб трымаць сітуацыю пад наглядам, тэрыторыя пастаянна кантралюецца ўзброенымі вайскоўцамі патрулямі і на машынах, і пехам. Больш таго, каб ведаць настроі насельніцтва, створана спецыяльная адзінка, асабовы склад якой апрануты ў цывільнае, жыве сярод насельніцтва ў звычайных кватэрах, сябруе з мясцовымі.

Пра сваё вайсковае жыццё палкоўнік распавёў, што служба арганізавана па схеме — паўгода тут, потым на 2 тыдні адпачынак, каб пабачыцца з сям'ёй. Страты сярод асабовага складу і вайсковай тэхнікі ёсць, але ў асноўным па віне маладых кіроўцаў на вузкіх горных дарогах.

## Чыя радзіма Косава?

Касавары-албанцы сцвярджаюць, што яны паходзяць ад ілірыйцаў, якія калісьці першымі засялілі Косава, а таму гэта іх Радзіма. Сербы ж лічаць, што калі паміж кааліцыйнымі войскамі сербаў і войскамі Атаманскай імперыі на Косаўскім полі ў 1389 годзе адбылася бітва, дык гэта спрадвечна сербская зямлі.

Аргументаў у агонь канфліктаў 1999 і 2004 гадоў хапала ў абодвух бакоў. У выніку сербскае насельніцтва было выцеснена з Косава ў сумежныя мясціны. Некаторыя мясцовыя наракаюць: «У нас так многа міратворцаў... Дзе яны былі падчас беспарадкаў? Напэўна, гэта было камусьці наверсе карысна!»

Сёння разбураныя кварталы і паселішчы пад аховай міратворцаў і паліцыі. Сербы-уладальнікі, якія мусілі пакінуць сваю нерухомасць, могуць яе прадаваць. Здараецца, у пакінутыя дамы самазахопам засяляюцца мясцовыя, што часам прыводзіць да крымінальных разборак. Тут людзі не надта любяць звяртацца ў суд ці ў паліцыю, часам высвятляюць адносіны з дапамогай зброі.

Вайна 1999 года катком пракацілася па людскіх лёсах. Так, баснійка Хашыма жыве ў горнай вёсцы Глабачыца, яе муж — у Босніі, дзеці — у Бялградзе. А яна адна мусіць пільнаваць майно і цярпець пагрозы. У прыватнасці, ад "Паралельнай структуры" за тое, што прымае ўдзел у выбарах у незалежным Косава. Сербы ўтварылі паралельныя органы ўлады і заклікалі сербскае і баснійскае насельніцтва да байкоту выбараў у «самаабвешчанай» рэспубліцы.

Нянавісць яшчэ не астыла. Калі едзеш, па абодва бакі дарогі — пахаванні, пахаванні, пахаванні... Не краіна — могілкі. Ад аповедаў пра перажытае, ад абвінавачванняў — боль і скруха: калі ж гэта забудзецца, калі ж астыне.

Хамід Адэмай, старшыня арганізацыі, якая аб'яноўвае 152 сям'і ахвяр вайны, успамінаючы мінулае, не можа стрымаць слёз, нечакана перакідваецца на іншую тэму, смяецца, а слёзы застаюцца.

У муніцыпалітэце Рахавец, куды мы заехалі, сербы падчас вай-

# ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

## Даведка

У 1999 годзе Савет Бяспекі ААН узяў тэрыторыю Косава пад свой кантроль і размясціў там міратворчыя сілы NATA. Структура кіраўніцтва ААН была сфарміравана ў адпаведнасці з чатырма вызначанымі ўзроўнямі адказнасці: ахова правапарадку і суд, грамадзянскае кіраванне, пабудова ўстаноў, эканамічная перабудова.

У 2001 годзе кіраўніцтва ААН правяло канстытуцыйныя змены, якія вызначылі правілы для часовых органаў самакіравання, Асамблеі, ураду і судовай сістэмы Косава.

У 2004 годзе адбыліся масавыя выступленні супраць Кіравання ААН і сербаў, што прымусіла бакі распачаць перамовы адносна канчатковага статусу Косава.

Прапанова па вызначэнні статусу Косава, вядомая як план Ахтысаары, акрэсліла пералік правоў, якія павінны быць нададзены розным меншасцям Косава, а таксама дазваляла фарміраванне незалежных структур бяспекі, такіх як паліцыі, войска і службы бяспекі.

Сербія не прыняла гэты план ,і перамовы зайшлі ў тупік. Не зважаючы на гэта, 17 лютага 2008 года парламент Косава абвясціў у аднабаковым парадку незалежнасць Косава ў выкананне плану Ахтысаары.

Са 192 краін — удзельніц ААН, 62 краіны прызналі незалежнасць Косава. Беларусі сярод іх няма.

ны кудысь павялі некалькі сотняў хлопцаў, старэйшых за 12 год. Што з імі здарылася, ніхто не ведае да сённяшняга дня. Там жа ў вёсках Малая і Вялікая Круша сербы пазабівалі ўсіх мужыкоў. Пасля вайны міжнародныя арганізацыі мусілі навучаць жанчын і падлеткаў, што ацалелі, карыстацца трактарамі і іншай тэхнікай, каб тыя маглі займацца гаспадаркай і выжываць.

У Сухарэцы сербы загналі сям'ю ў кавярню і закідалі гранатамі. Загінула 63 чалавекі — уся сям'я разам з дзецьмі. У Драгашы Хаджы Берыша распавёў, як сербы каталі ягонага сваяка: калі цела таго знайшлі — ніводнай цэлай косткі.

У нашага сек'юрыці ў доме падчас вайны жыло 23 чалавекі, сем'і сваякоў і суседзяў, у якіх сербы забралі хаты на патрэбы войска. Яго самога хавалі на даху, бо сербы забівалі любога, хто ім не падабаўся, забівалі і дзяцей, і старых, маглі за мусульманскае імя, за албанскую мову ці проста за нацыянальны капялюш забіць. Як тлумачылася: «Па падазрэнні да прыналежнасці да УЧК» (Вызвольнага войска). Мужчынскае насельніцтва ратавалася ад смерці — сыходзіла з паселішчаў са зброяй у горы. Там з часам аб'ядноўваліся ў партызанскія аддзелы і атрады самаабароны. Пад канец вайны паміж імі склалася адмысловая сістэма каардынацыі дзеянняў. Гэта і называлася Вызвольным войскам.

Сябра парламенту Зафір Берыша распавёў: «Калі ўсё пачалося, я вярнуўся ў Косава з Германіі, дзе працаваў і быў знаёмы з сынам Гельмута Коля. Я вярнуўся, каб змагацца за Радзіму, за народ. 44 маіх сябра загінулі. Я — адзін з тых, хто падпісаў дамову аб незалежнасці Косава».

Калі мы запыталі нашага сек'юрыці, ці былі ў яго сябрысербы, ён адказаў:

— Так. Раслі разам…

Калі запыталі, ці засталіся яны ягонымі сябрамі, ён адказаў:

— Кантакты даўно страчаныя.

— А калі б аднавіліся? Былі б сябрамі?

— Не!!! Але я да іх нічога не маю.

Наш кіроўца Нолі, які таксама не любіць узгадваць пра вайну, вымавіў толькі: «Паселішча знішчана не тады, калі там дамоў не засталося, а тады, калі яго адбудаваць няма каму, калі ўсіх пазабівалі. Пакуль хоць адзін з сям'і застаўся — усё будзе адбудавана».

Пазней у Джакова мы наведалі недзяржаўную грамадскую арганізацыю «Голас Маці», якая аб'ядноўвае сем'і ўдоў і сваякоў загінуўшых і прапаўшых без вестак. Пасля вайны прайшло амаль дзесяць год, некаторых загінуўшых знаходзяць і пераносяць пахаванні на іх радзіму бліжэй да сваякоў, але па-ранейшаму лёс 1800 прапаўшых без вестак касавараў невядомы. Родныя і блізкія спадзяюцца на цуд.

Падчас гэтых горкіх апавядаў не раз лавіў сябе на думцы: а колькі падобных жа гісторый могуць распавесці выцесненыя з Косава сербы. Даўно вядома, што самыя жорсткія войны — грамадзянскія. Асабліва з адбіткам міжнацыянальнай ці рэлігійнай нецярпімасці.

## Ціхае Косава

Да нас — беларуса і ўкраінкі — мясцовыя людзі ставіліся насцярожана, атаясамліваючы з рускімі. Пра Беларусь амаль нічога не ведаюць, але ведаюць, што Лукашэнка прыляталў у Бялград і выказваў салідарнасць са «шматпакутным» сербскім народам. Калі з табой вітаюцца: «Здравствуй! Говоришь по-русски?» — хутчэй для таго, каб высветліць, «свой» ці не. Адзін чэх перакінуўся парай слоў з мясцовым у Джакова — здалі ў паліцыю як сербскага шпіёна.

Грамадская арганізацыя «Голас Маці» імкнецца наладзіць абмен прадстаўнікамі беларускіх і касоўскіх НДА з мэтай больш блізкага знаёмства з культурай і гісторыяй нашых народаў, разбурэння адмоўных стэрэатыпаў пра нашы краіны.

Узаемаадносіны паміж этнічнымі супольнасцямі складаныя. Прараў агрэсіі не назіраецца, але напружанасць адчуваецца. Найбольш спакойна на кропках міратворчых войскаў, умацаваных мяхамі з пяском і калючым дротам. Безліч вайсковых патрулёў KFOR, разнастайнай вайсковай тэхнікі і цяжкавікоў з вайскоўцамі калясяць па вуліцах і дарогах Косава. Месцы правядзення масавых мерапрыемстваў падлягаюць узмоцненай ахове.

Першы тур выбараў 2009 года ў Косава прайшоў спакойна, палітычныя апаненты актыўна выкарыстоўвалі сродкі масавай інфармацыі, пераважна тэлебачанне і радыё, друкаваліся ў газетах (праўда, іх агульны тыраж па краіне — усяго 30000 асобнікаў), правялі шмат сустрэч з насельніцтвам.

Партыяў тут шмат, больш за дзесятак, асноўныя — ЛДК (Дэмакратычная ліга Косава), ПДК (Дэмакратычная партыя Косава), ААК (Альянс за будучыню Косава), АКР (Новы альянс Косава), ЛДД (Дэмакратычная ліга Дарданіі) і ОРА (Партыя рэфармацыі «Час»). Вялікай розніцы паміж імі няма, усе яны паўсталі пасля разбраення партызанскіх аддзелаў УЧК, а таму з большага прывязаны да тэрыторыяў, на якіх дзейнічалі аб'яднанні партызанскіх атрадаў. Былыя камандзіры сталіся дэпутатамі, а падначаленыя і іх сем'і — выбаршчыкамі. Тэма супольнай баявой мінуўшчыны пастаянна закранаецца падчас сустрэч з насельніцтвам як аргумент на карысць кандыдата. Выбіваецца з гэтага шэрагу ОРА, якая аб'ядноўвае інтэлігенцыю, мае цікавую праграму, але не атрымала шырокай падтрымкі насельніцтва.

## Экзамен на самастойнасць

Хто б ні прыйшоў да ўлады ў Косава, яму будзе вельмі цяжка. Грамадства ў Косава моцна падзеленае, партыі адлюстроўваюць гэты падзел адпаведна прыналежнасці да партызанскіх аб'яднанняў у мінулым, ці пэўнай нацыянальнай (этнічнай) групы — баснійскай, гаранскай, сербскай, цыганскай, турэцкай… Насельніцтва не атаясамлівае сябе як касавараў. Канфрантацыя і супрацьстаянне — адметнасць народаў Косава, што ёсць асноўным чыннікам нестабільнасці ў рэгіёне. Наяўнасць агульнага ворага — сербаў — аб'ядналa іх у барацьбе за незалежнасць Косава, зазвычай, пад албанскімі сцягамі. Зараз агульнага ворага няма, і на паверхню ўсплылі супярэчнасці інтарэсаў нацыянальных груп унутры краіны.

Самі выбары прайшлі дастаткова спакойна. Здараліся перабоі з электразабеспячэннем — запальвалі свечкі, рабілася зімна — распальвалі «буржуйкі». Няшмат здарылася і рознага кшталту інцыдэнтаў. У Джылане ўзарвалі аўтамабіль старшыні муніцыпальнай выбарчай камісіі. У вёсцы Піранё, бліз Прызрэні, падчас сустрэчы партыі ЛДК з выбаршчыкамі, сябар канкуруючай партыі ПДК адкрыў агонь у паветра з аўтамата «Калашнікава». У Джакова этнічны албанец кінуў выбуховую прыладу: паранена 3 чалавекі, злачынца арыштаваны. Другая прылада, выкрытая міратворцамі, не выбухнула. У тым жа Джакова невядомыя абстралялі муніцыпалітэт, былі пашкоджаныя вокны, ніхто не пацярпеў.

Выбары ў мясцовыя органы ўлады з'яўляюцца своеасаблівым экзаменам на дарослaсць маладой Рэспублікі Косава, яе здольнасці самастойна распараджацца сваім лёсам. Ці станецца так — адказ дасць час.

Як адзначыў прэм'ер-міністр Косава Хашым Тачы: «Усе памятаюць, дзе мы былі 10 гадоў таму, але зараз мы мабілізаваліся, каб адбудаваць усё, барацьба працягваецца. З Вамі мы будзем у саюзе Еўрапейскіх краін!»

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ФЕЛІПЕ КАЛЬДЭРОН

Падкантрольная Кальдэрону, лідэру кіруючай у Мексіцы Нацыянальнай партыі дзеяння (PAN), фракцыя ў парламенце патрабуе забароны ў Мексіцы вулічных песняў на тэму наркотыкаў. Кальдэрон называе гэты жанр «narcocorridos». На ягоную думку, песні «narcocorridos» штурхаюць слухачоў набываць наркотыкі. Дэпутат таксама лічыць, што «narcocorridos» з'яўляюцца часткай крымінальнай субкультуры, якая пагражае ўнутранай бяспецы краіны. Зрэшты, мафіёзныя кланы сапраўды вядуць вайну супраць ураду. Кожны дзень СМІ інфармуюць пра тое, што некалькі чалавек былі забітыя ў сутычках паміж паліцыяй і мафіёзі. Цікавы аспект справы: калі дэпутаты падтрымаюць праект, шмат вядомых музычных груп, чые песні так ці інакш тычацца праблемаў спажывання наркотыкаў, могуць быць забароненыя. За спевы пра наркотыкі, як патрабуе дэпутат, музыка павінен сесці ў турму на тры гады. Тое ж датычыцца тых, хто будзе прадаваць дыскі з запісамі падобных песняў. Праціўнікі Кальдэрона кажуць, што песні пра наркотыкі ў Мексіцы даўно сталі чымсьці падобным на крымінальны шансон у Расіі. Іншымі словамі, гэта масавая культура, якая амаль не ўплывае на статыстыку злачынстваў.

### ІСЛАМ КАРЫМАЎ



Прэзідэнт Узбекістана стаў галоўным ворагам вядомага прапуцінскага руху «Наши». За апошнія пару тыдняў «Наши» паспелі правесці чатыры пікеты ўзбекскага пасольства ў Маскве, патрабуючы рэстаўрацыі ў Ташкенце помніка савецкім воінам — Абаронцам Айчыны. Помнік, прысвечаны ўдзельнікам другой сусветнай вайны, быў адкрыты ў 1975 годзе каля штаб-кватэры Туркестанскай вайсковай акругі і прастаяў там да 2009 года. У мінулым годзе яго дэманціравалі. Першапачаткова Абаронцаў Айчыны папросту планавалі перанесці ў іншае месца, а на іх месцы адчыніць манумент «Клятва Вернасці», макет якога быццам прыдумаў сам Карымаў. Манумент пра клятву адчынілі, а сам помнік Абаронцам Айчыны, між тым, знік. Расія, як вядома, любіць ваяваць за помнікі воінам другой сусветнай вайны ў рэспубліках былога СССР. Дастаткова згадаць скандал вакол помнікаў у сталіцы Эстоніі або ў Кутаісі. Вось і на гэты раз у Маскве пратэстуюць. Між тым, эксперты кажуць, што пратэсты супраць палітыкі Карымава ў галіне манументальнай прапаганды — нешта новае. Маштабы пратэстаў вельмі сціплыя. На пікеты «Наших» выходзяць не больш за 20 асобаў. Здаецца, крамлёўская адміністрацыя хоча захаваць твар і вырашыла абмежавацца сімвалічнымі карлікавымі пратэстамі сваіх марыянетачных арганізацый. Спрачацца з Карымавым для Масквы няма сэнсу, паколькі, як вядома, Узбекістан і Расія «стратэгічныя партнёры». Аднак ёсць іншы бок — мяркуючы па вялай кампаніі «нашыстаў», можна казаць, што Узбекістан — першая дзяржава з былых савецкіх рэспублікі, якая перамагла Расію ў вайне за помнікі.

### ДЖОРДЖ БУШ-МАЛОДШЫ



Былы прэзідэнт ЗША напрыканцы сваёй кадэнцыі ў 2008 годзе і так быў самым непапулярным прэзідэнтам у гісторыі Штатаў. Зараз брытанская газета «Guardian» раскапала сувязі ягонага дзеда з рэжымам нацыстаў. Увогуле, і раней было вядома, што дзед Джорджа — Прэскат Буш — быў звязаны з нацыстамі нават да вайны. Ужо ў 1920-я гады звязаныя з ім фірмы фінансавалі выбарчыя кампаніі нацыянал-сацыялістаў. Аднак гэта толькі кветачкі. Зараз высвятляецца, што Прэскат нават пасля таго, як ЗША абвясцілі вайну Германіі, падтрымліваў бізнес-кантакты з Берлінам. Больш таго, выданне сцвярджае, што атрыманыя на тым брудным бізнесе грошы дапамаглі Бушам з часам стаць уплывовай палітычнай дынастыяй. Але нават і гэта яшчэ не ўсё. Кампаніі і фірмы, якія дэ-факта былі заснаваныя Бушам, мелі дачыненні да Халакосту. Прынамсі яны мелі дачыненне да будаўніцтва і эксплуатацыі вязняў у такіх сумна вядомых лагерах, як Асвенцым. Дарэчы, два вязня Асвенцыма даўно ўжо судзяцца з Бушамі, патрабуючы кампенсацыі. Між тым, цікава, што факты кантактаў Бушаў з нацыстамі аспрэчваюць шмат габрэйскіх арганізацый ЗША.

З НАГОДЫ

# СЕРЫЯЛ «ШКОЛА»: ВЯРТАННЕ Ў ЗВЯРЫНЕЦ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**11 студзеня па расійскім канале канале ОРТ пачалі паказваць шматсерыйны фільм «Школа». Здымае яго маладая рэжысёрка Валерыя Гай Германіка, чыя карціна «Усе памруць, а я застануся» атрымала ў 2008 годзе прыз на Канскім кінафэсце за найлепшы дэбют. Тэлесерыял ускосна працягвае тэмы і вобразы гэтага розгалоснага фільма. Па АНТ «Школу» не паказваюць і, мяркуючы па «абы-чаго-не-выйшласці» айчыннага эфіру, ніколі не пакажуць. Беларускія гледачы фільма — уладальнікі спадарожнікавых талерак або хуткаснага інтэрнэту. Да мяне фільм трапіў па апошнім канале — суседзі запісалі першыя некалькі серый. У Расіі фільм выклікаў вялізны скандал ва ўсіх без выключэння сферах грамадства. Расійскі Мінадук заклікае забараніць серыял за чарнуху і аднабаковасць раскрыцця складанай тэмы «школьная пара» ў сачыненні Германікі.**



Між тым, па праглядзе ўсіх выпускаў мыльнай, ці, дакладней сказаць, крэйдавай оперы, даступных у сеціве на момант напісання гэтага тэксту, я зрабіла выснову: на серыял варта хаця б адным вокам зірнуць усім, каму неабыякавы лёс беларускай школьнай адукацыі.

PR-легенда Першага канала Расіі і яго кіраўніка Канстанціна Эрнста асабіста такая: Гемраніцы замовілі прыцягальнае гледзіва для падлеткаў, якія апошнім часам амаль не глядзяць тэлебачанне, і тым больш такі сур'ёзны канал, як Першы. Але на вушах стаяць дарослыя, якія ў сваёй масе катэгарычна асудзілі «Школу», і найперш школьныя настаўнікі, якія баяцца: прымітыўныя героі фільма стануць кумірамі іх несапсаваных вучняў. У той жа час «магутная кучка» інтэлектуалаў Расіі перакананая: серыял, зняты ў стылі рэаліці-шоу, — люстра наяўнай сітуацыі, і адбіае гэта люстра гуманітарную катастрофу ў сферы адукацыі і выхавання, якая мае месца ў РФ. Паралельна ідуць спрэчкі ў іншай плоскасці: ці мае серыял «Школа» дачыненне да мастацтва? Такі розгалас вакол новага тэлепрадукту, а галоўнае, эмоцыі ад тэлепрагляду абудзілі ўва мне перажыванні з нагоды нядаўняга мінулага.

## Хто скраў партрэт

Што сказаць наконт якасці серыяла «Школа»? Прынамсі я нарэшце пабачыла нешта іншае за ўбогія рускія серыялы, «з жыцця», якія ў сваёй масе даводзяць мяне да шалу. «Ирина, почему ты бросила Александра? — Потому что он изменил мне с Анастасией», — і так гадзіну з перапынкамі на рэкламу.

У серыяле няправільна толькі адно: заяўленая мэтавая аўдыторыя — падлеткі. На мой густ, ён зняты занадта «твінпіксава» і «доктархаўзава» як на тынэйджэрскую псіхіку. Дасягаецца поўны эфект прысутнасці гледача ў кадры, бо камеру падносяць упрытул да акцёраў, у некаторых выпадках мы бачым адно палову твару ці вусны. Гэта грузіць і ціsне. Зрэшты, я, магчыма, дарма кажу за сучасных тынэйджэраў: я дзіця 1990-х, вяршыня майго тэхнічнага прагрэсу ў 13 год — чорнажоўты «Тэтрыс» на DOS-аўскім кампутары.

Паводле сюжэту «Школа» — тое ж мыла, толькі з жыцця 9 «А» класу. Праз апісаны вышэй эфект плюс асаблівасці сцэнарыя адчуваеш, нібы ты таксама сядзіш за партай або ў курылцы. Размаўляюць акцёры на дзікім, канцэнтраваным маскоўскім дыялекце. Усё паказана вельмі праўдападобна. У рускім інтэрнэце захлёбваюцца: ды што ж вы робіце, школа не такая, няма харошая. А я вось вам скажу: школа такая. У Беларусі, праўда, — з папраўкай на БРСМ ды іншую дзяржаўную ідэалогію.

Мяркую я не па сваёй школе — я вырасла ў парніку. Школьная форма, профільныя класы і г.д. Ячэйкі БРСМ намаганнямі дырэктара няма і дагэтуль. Пасля 9-га класа дырэктар збіраў паралель у актавай залі і казаў: усе адкіды павінны самі забраць дакументы для ПТВ або суседніх школаў, або ён іх выкіне сілай. Гэты «нацызм» прыводзіў да таго, што ў нас не было кампаніі паўкрымінальных, але рамантычна-абаяльных кепскіх мальцаў, якія зводзілі б малодшых дзевак. То бок, яны былі, але не рабілі надвор'я і ўрэшце мімікравалі пад «харошых». Выдатнікаў і завучак ніхто не чапаў — іх вакол мяне была пераважная большасць. У маім класе было 19 медалістаў з 29 вучняў, і толькі адзін з нас скончыў школу з «троешным» атэстатам. Усе 29 выпускнікоў паступілі ў бэбібумны 1999 год у дзяржаўныя ВНУ або ЕГУ. Такі вось парнічок.

У верасні 2004 года ў мяне быў шанец «успомніць усё» і на пару месяцаў стаць «вучылкай». Педпрактыка ў прэстыжнай гімназіі. Працаваць-вучыцца я ішла туды, як у чарговы парнічок.

Серыял Германікі для мяне — як вяртанне на педпрактыку. Спачатку хаос і малалеткі, што лётаюць па калідоры, потым «малаўпраўляемы» 9 клас, да якога мяне прымацавалі, потым — настаўніцкая з шампанскім у кубках ад гарбаты. Хіба што ў расійскім серыяле завуч не ўлятае ў кадр у эпілептычным прыпадку: «Хто скраў гімн, герб і партрэт з 25-га кабінета? Зараз жа павесіць на месца!!!»

Серыял «Школа» пачынаецца з таго, што ў звычайную маскоўскую с\ш прыходзіць разбітны новенькі, які, ледзь прайшоўшы вахту, атрымлівае па мордзе ад дзесяцікласніка, а потым кіруецца ў хлапечую прыбіральню, дзе каля пісуараў наводзіць даведкі, «які 9 клас самы нармальны». Яму кажуць, 9 «А» самы нармальны, у 9 «Б» адны ўроды. Ён ідзе ў 9 «А», хоць кажа, што ён сам прыдурак, таму яго з іншай школы выгналі. У выніку нам паказваюць «нармальны» 9 «А». І ўсё, пра што ты думаеш: «Божухна, а 9 «Б» тады які?»

У гэткім самым жаху была я, калі прыйшла на практыку. Два месяцы ў мяне пайшлі на тое, каб усвядоміць: гэта не жывёлы, гэта нармальныя, адэкватныя беларускія падлеткі. Калі я ўжо ўсвядоміла гэта напрыканцы практыкі, я запрасіла аднакурсніц на пазакласнае мерапрыемства як асістэнтак. Аднакурсніцы скарысталіся з унікальнай магчымасці нашага года і засталіся на практыку на філфаку чытаць лекцыі першакурснікам, таму завітаць у школу ім было цікава. З мерапрыемства яны выпаўзалі: «Мартысевіч, гэта звярынец!» — мармыталі яны.

Галоўнае, што я спасцігла з педпрактыкі: гэта проста выглядае, як звярынец. Калі быць сапраўдным педагогам, да кожнага з іх можна знайсці падыход, пабачыць індывідуальнасць і асобу. «Я личность, я индивидуальность», — самазадаволена і нахабна паўтараюць героі серыялу «Школа», і, як ні спрабуюць аўтары серыялу паказаць прорву паміж ісцінай і гэтай заявай, у ёй ёсць пэўная рацыя.

Клас, які падаўся сяброўкам звярынцам, быў з беларускай мовай навучання, ён складаўся пераважна з дзяцей журналістаў ды выкладчыкаў, некаторыя вучні ездзілі туды праз паўгорада. Сёння мама адной з вучаніц — мая начальніца ў «НЧ», а сама дзяўчынка часам піша для газеты. Не збірала інфармацыі, але, думаю, у іншых «звяркоў» па чалавечых мерках таксама ўсё нармальна. І самае галоўнае, я такі пабывала ў 9 «Б». Дакладней, у «маёй» гімназіі гэта быў 9 «В». Сапраўды, вось дзе ўроды.

## Са сметніцай на галаве

Абурэнне серыялам палягае, відаць, у канвенцыі крывадушша, якую заключаюць міжсобку дзеці ў школе. Я мела магчымасць заўважыць гэта, бо была не настаўніцай, не дырэктарам, не школьным псіхолагам, не «радзіцелем», а студэнткай-практыканткай. Вучні не прымалі мяне за «дарослую». Я бачыла іх, і калі ў класе былі настаўнікі, і калі настаўнікаў не было. Гэта былі палярна розныя дзеці. У малодшых класах маёй школы мяне вельмі абурала настаўніцкая слепата, якую дэманструе 99% педагогаў. Тваёй суседзі па парце надзяваюць сметніцу на галаву. Яна сядзіць і плача. Той, хто «на стрэме», зазважае на калідоры настаўніцу. Сметніцу здымаюць і ставяць на месца. Настаўніца заходзіць у клас і выганяе дзяўчынку з уроку за тое, што прыйшла ў Храм Навукі брудная. Яе выганяюць, а ты маўчыш, бо калі нешта скажаш, на наступным перапынку сметніцу надзенуць на цябе. І крыўдуеш не на прыдуркаўаднакласнікаў, а на настаўніцу, якая не дапёрла сваімі педунівераўскімі мазгамі, адкуль у Леначкі семкавае шалупінне ў валасах.

У серыяле «Школа» гэтыя «чароўныя» пераўтварэнні паказаныя на «выдатна». Дарослыя маюць магчымасць бачыць, як паводзяць сябе сённяшнія дзеці ў школе самна-сам. Паўтаруся, нармальныя дзеці. Не падонкі, а нармальныя маленькія грамадзяне сваёй краіны. Гэта такія парнічкі, як мая школа, хутчэй ненармальна. Але ж і там дзеці палілі, пілі піва пасля ўрокаў, кахаліся ў пад'ездах і рабавалі шапікі са «снікерсамі»… Як пішуць у расійскім інтэрнэце ў адказ на абурэнні бацькоў і дзядоў з бабулямі нейкія напаўпісьменныя юзэры: «Ша, взрослые, сидите и смотрите, как есть на самом деле».

Цалкам верагодна, я б абрала «звярынец» як будучае месца працы, калі б не наглядчыкі гэтага звярынцу. Вось акурат тое, што рабілася ў настаўніцкай, прыводзіла мяне ў сапраўдны жах. Тое, што ўвесь малады педсклад гуляў у КВЗ, у настаўніцкай размаўляў толькі пра гэта, а школу скарыстоўваў як месца, дзе ляжыць працоўная кніжка, было яшчэ паловай бяды. КВЗшнікі былі там найчалавечнейшымі педагогамі. Іх старэйшыя калегі былі збольшага абмежаванымі і жорсткімі жанчынамі і мужчынамі, якіх даводзіў да шалу стрэс і нізкія заробкі. На нашы студэнцкія пытанні, як трымаць дысцыпліну ў класе, яны адказвалі: «Крычыце на іх. Забірайце і рвіце кнігі, часопісы і сшыткі не па вашым прадмеце. Стаўце двойкі атрамантам у журнал. Гэта не дзеці, гэта жывёлы». І калі дзеці яшчэ спрабавалі здавацца настаўнікам лепшымі, чым ёсць насамрэч, то настаўнікі нават не спрабавалі хаваць ад вучняў сваёй злобы і агіды.

## Заткнуць гэта чмо

Найболыш мяне абразіла сітуацыя, калі адна малаадукаваная настаўніца рускай літаратуры («А теперь, дети, рассмотрим с вами поэзию Польверлена»), якая дамагалася добрага стаўлення ад вучняў тым, што «сябравала» з дзеткамі, — какетнічала з хлопцамі і абмяркоўвала з дзяўчаткамі вопратку, каханне ды серыялы, — скарыстоўвала практыкантак, каб падняць свой аўтарытэт у класе: «Вы, Катя, урок ведите, а я тут на задней парте стихотворение поспрашиваю». — «Оксана Сергеевна, заткните это чмо, она мешает нам стихотворение повторять!» Настаўнікі ў серыяле «Школа» паказаныя таксама, як яны ёсць.

Мне бязмежна пашанцавала з выдатнай настаўніцай рускай мовы і псіхалогіі, якая апекавалася мной падчас педпрактыкі. Але гэта быў адзіны вынятак, які пацвярджаў правіла.

І асабліва гэты беларускі момант з убіваннем дзецям у галовы асноваў Ідэалогіі. Мой «звярыны» 9 «Г» ладзіў негалосны сабатаж школьнаму БРСМу. І за гэта я гэтых «жывёлаў», як называлі іх у настаўніцкай, бязмежна паважала. Хоць, вядома, ж стаўленне да розных дзяцей было неаднaзначнае. І гэтая неаднaзначнасць таксама захоўваецца ў серыяле «Школа». Дзевяцікласнік сустракае на калідоры свайго бацьку-алкаголіка: да малодшага выклікалі. Сын пачынае прычэсваць бацьку, дае яму жуйку, каб зажаваў перагар: «Сначала меня позорил, теперь Федьку позоришь. Нет, денег на похмел не дам, откуда у меня, у нас что, кто-то, кроме матери, работает?» Потым ён здабывае ў сталоўцы лішнюю порцыю для малодшага брата, ідзе размова пра тое, што ў малога няма ранца, няма спартовай формы… «Не, не надо помогать, я сам малого одену», — кажа ён сябрам. А потым крадзе ў аднакласніцы грошы і ідзе прапіваць іх у стрып-бар. І штодня б'ецца з аднакласнікам-каўказцам, бо «этот хач» надта ганарлівы: «Они дружить не умеют, только воевать, они это давно доказали».

Праз паўгода пасля педпрактыкі мы здавалі дзяржаўны іспыт па методыцы выкладання мовы і літаратуры. На кансультацыі выкладчыца, якая сама немаведама калі ў апошні раз выбіралася ў школу, вяшчала з кафедры: «Важно не только ставить культуру речи во время уроков русской литературы, важно отводить для этого отдельные занятия за счёт часов по русской литературе!» Я згадала, як адной суботай падрыхтавалася да двух урокаў у гімназіі, а мой клас знялі з заняткаў прыбіраць лісце вакол школы. Не вытрымала і разрагаталася. Яшчэ пяцьдзесят чалавек з патоку таксама рагатала. А шасцёра азіраліся і шыкалі: «Замаўчыце, вы што, бальныя?» Гэтыя шасцёра праходзілі педпрактыку ва універсітэце.

Цяпер я вярнулася на школьную педпрактыку. Гляджу серыял выпяндрожнай маскоўскай тусоўшчыцы Валерыі Гай Германікі. Але наглядчыцай у звярынец не пайду. НІКОЛІ.

Паводле этычных меркаванняў нумары беларускіх школаў у артыкуле не называем.

ЦІКАВА

# ТАЯМНІЦА ЗАКІНУТАЙ СЯДЗІБЫ

Беларусь — край загадак і нечаканых адкрыццяў. Ці можна ўявіць, каб недзе ў вясковай глушы, забыты ўсімі, стаяў будынак, узведзены вядучым архітэктарам стылю Arts&Crafts (англійскага папярэдніка еўрапейскага мадэрну) Бэйлі Скотам? Але гэта неаспрэчны факт.

Напачатку гэтай гісторыі быў званок Іосіфа Барысавіча Цімкоўскага, які прапанаваў «НЧ» матэрыялы пра рэалізаваны ў Беларусі праект архітэктара. І вось у мяне на руках адмысловы артыкул Эдзіты Баруцкай.

Для Іосіфа Цімкоўскага шлях да зацікаўлення закінутымі рэшткамі сядзібы Хлудзінскіх гербу «Даленга» ў Лясковічах, у Шумілінскім раёне Віцебшчыны, пачаўся з візіту беларускіх архітэктараў у Польшчу ў 2003 годзе. Яе праграма ўключала сустрэчу з патрыярхам польскай гісторыі архітэктуры Тадэвушам Баруцкім, аўтарам дзесяткаў манаграфій і даследаванняў. Тады і прагучала інфармацыя пра забыты твор маэстра англійскага мадэрну ў Лясковічах, гісторыю якога вяртае з небыцця жонка аўтарытэтнага даследчыка.

Родны брат пана Хлудзінскага ачольваў Манетны двор у Пецярбурзе і меў 17 маёнткаў у Расіі. Гаспадар Лясковічаў, Уладзіслаў Хлудзінскі, таксама выглядаў нябедным чалавекам, у гаспадарцы якога выраблялася да 1 мільёна пудоў збожжа штогод. Існуе няспраўджаная інфармацыя, што нават чыгуначная калейка — пасля спецыяльнага звароту гаспадара сядзібы да цара — была скіравана ад Шуміліна бліжэй да Лясковічаў, каб спадручней вывозіць ураджай. Сядзібу абкружаў цудоўны парк з алеяй італьянскіх дрэваў. Наваколле ўпрыгожвалі тры маляўнічыя возеры.

Прапаную скарочаны варыянт артыкула Баруцкай у маім перакладзе з польскай.

**Аляксей Хадыка**

**Эдзіта БАРУЦКАЯ**

У 1912 годзе англійскі часопіс «The Studio» апублікаваў праект дома архітэктара Макэя Х'ю Бэйлі Скота (M.H.Baillie Scott) «для польскай сям'і Хлудзінскіх у Лясковічах каля Віцебска». Годам пазней іншае выданне, «The Architect», змясціла малюнак зменenай версіі праекта, а ў другім выданні кнігі Бэйлі Скота «Дамы і Сады» («Houses and Gardens») 1933 года, ён з'явіўся пад назвай «Дом у Лясковічах, Польшча». Кім жа быў Бэйлі Скот? І што засталося ў Лясковічах?

## Кар'ера архітэктара

Месца Бэйлі Скота сярод архітэктараў Arts&Crafts было не зусім тыповым: асноўны час яго творчасці прайшоў па-за цэнтрамі развіцця стылю — Лонданам і Глазга. Ён не наследаваў неагатычным узорам, не ўступіў у лонданскі Цэх Работнікаў Мастацтва, месца рэгулярных спатканняў вядучых прадстаўнікоў стылю. У яго была іншая перавага: ён стаў аўтарам адзінага сістэматычнага выкладу прынцыпаў ідэальнага дому Arts&Crafts у кнізе «Дамы і Сады», выдадзенай у 1906 годзе, дзе прапаноўваліся тэорыя праектавання і афармлення дома, апісанні канкрэтных праектаў, планы, праілюстраваныя малюнкамі і паэтычнымі акварэлямі.

Прыйшоўшы да еўрапейскай славы праз папулярызацыю новага стылю, Бэйлі Скот, аднак, пачынаў кар'еру не як архітэктар. Народжаны ў заможнай шатландскай сям'і ў Рамсгэйт (графства Кент), ён меўся пераняць кіраванне сямейнымі маёнткамі і распачаў адукацыю ў Каралеўскім Сельскагаспадарчым Каледжы ў Цірэнчэстэры. Але адзнака, атрыманая там па класе малюнка, і цікаўнасць да мастацтва вызначылі яму іншы лёс. Шлюбнае падарожжа з маладой жонкай на размешчаную паміж Англіяй і Ірландыяй выспу Мэн у 1889 годзе зацягнулася на 12 гадоў, а знаёмства з яшчэ жывымі традыцыямі кельцкай культуры падштурхнулі яго да выпрацоўкі своеасаблівага архітэктурнага стылю. «Чырвоны Дом» (1892) для ўласнай сям'і, праекты прыватных дамоў і маляўнічых катэджаў у наваколлі — гэта быў пачатак прафесійнай кар'еры.

Артыкулы Бэйлі Скота ў спецыяльных часопісах — настойлівая прапаганда прагрэсіўнага мастацтва і архітэктуры. У «The Studio» з'явіліся яго праграмныя допісы: «Ідэальны прыгарадны дом», «Мастацкі дом», «Пра выбар простай мэблі». Публікацыі, праілюстраваныя выразнымі акварэлямі, зрабілі Бэйлі Скота найбольш упадабаным у Еўропе прадстаўніком новай англійскай архітэктуры. Папулярнасць цягнула за сабой рэзанансныя замовы прадстаўнікоў еўрапейскай эліты.

На піку кар'еры Бэйлі Скот далучыўся да руху па праектаванні гарадоў-садоў, тэорыі і практыкі мадэрнізацыі гарадскога ландшафту сучаснага горада XX стагоддзя. Новыя павевы дэкларавалі падзел гарадской прасторы на зоны — прыватную, жылую і грамадскую, звязаную з функцыянаваннем публічных інстытутаў — распарадчых органаў, банкаў, офісаў.

Каля 1904 года Бэйлі Скот пачаў супрацоўніцтва з першай Карпарацыяй гарадоў-садоў (Garden City Corporation), праектуючы шэраг дамоў каля Лондана. Затым быў праект Ватэрлоо Корт — узведзены ў плане чатырохкутніка з унутраным дзядзінцам дом з жытлом для адзінокіх асоб і працуючых жанчын, знак новага стагоддзя, якое ў хуткім часе прынесла жанчынам выбарчыя правы і эмансіпацыю. Дамы Бэйлі Скота знайшлі прызнанне ў навукова-акадэмічным асяроддзі — з 1897 года Бэйлі Скот запраектаваў у Кембрыджы дванаццаць сядзібаў.

## Заказ з Беларусі

У 1912 годзе архітэктару паступіла замова з Беларусі. У манаграфіі па гісторыі рэзідэнцый былой Рэчы Паспалітай польскага даследчыка Рамана Афтаназі прыводзіцца здымак 1914 года іншага, неакласіцыстычнага аднапавярховага будынку ў Лясковічах з порцікам у 6 тасканскіх калон. Менавіта на яго месцы паўстаў спланаваны Бэйлі Скотам дом. Жонка заказчыка, апошняга ўласніка рэзідэнцыі Уладзіслава Хлудзінскага, Эма Паулучы паходзіла з арыстакратычнай англійскай сям'і. Роднасныя сувязі перадвызначылі зварот да вядомага майстра: заможная сям'я магла дазволіць сабе амбітны праект, сведчанне знаёмства з сучасным стылем жыцця і архітэктуры. А таксама ўзяць удзел у творчым супрацоўніцтве з аўтарам.



Праект дома архітэктара сям'і Хлудзінскіх Макэя Х'ю Бэйлі Скота

Першы варыянт пабудовы, надрукаваны ў «The Studio» ў 1912 годзе, які прадстаўляў вялікую квадратную ў плане магнацкую рэзідэнцыю з унутраным дваром, перакрытым купалам над зімнім садам, і нагадваў творы венскай сецэсіі, быў адкінуты Хлудзінскімі.

Наступны, захоўваючы базавыя ідэі творчасці Бэйлі Скота, быў цясней звязаны з сярэднявечнай традыцыяй Рэчы Паспалітай. Чатырохкутнік дапоўнілі вежы са спічастымі дахамі, двор пазбавіўся перакрыцця. Рэмінісцэнцыі абарончага дойлідства дапоўніў фахверкавы мур — драўляная канструкцыя, утопленая ў бутоўку. Дамінантай стала тыповая рыса рашэння прасторы ў стылі Бэйлі Скота — прадстаўнічы двухпавярховы хол цэнтральнага памяшкання, абкружаны сталовай і бібліятэкай. Да іх далучалася памяшканне са сцэнай, прызначанай для тэатральных пастановак і канцэртаў.

Вакол цэнтральнай залы з камінам разгортвалася жыццё сям'і, перацякаючы ў падпарадкаваныя малыя аб'ёмы салонікаў і прыватных закуткоў. Ваконныя эркеры, аддзеленыя ад асноўнай прасторы адной-дзвюма прыступкамі, служылі месцам для інтымнай размовы або рэлаксацыі ў задуменні. У калідорах і галерэях можна спаткаць вітражы, што мадэлявалі доступ святла, далікатна выкананую сталярку з разьбянымі расліннымі матывамі. Формы дрэваў, кветак, садавіны — інтэгруючыя складнікі рацыянальнага і разам паэтычнага свету.

У інтэр'ерах Бэйлі Скота сустракаюцца спалучэнні блакіту і жоўтага, дапасаванні фіялетавага, зялёнага і белага. Дасканалая гармонія функцыянальнага і эстэтычнага… Усе матэрыялы лясковіцкага праекту меліся выраблянца на месцы — цэгла, дахоўка ручной работы, драўніна, якая, паводле эстэтыкі Arts&Crafts, несла на адкрытых частках сляды габлявання — «працы рук».

## Разбураная сучаснасць

Што ж засталося ад стылёвай пабудовы? Двухпавярховыя фрагменты сцен у закінутым парку ў Лясковічах — парэшткі вежаў, якія відаць на праектным малюнку. Здымкі руінаў трапілі ў 2008 годзе на інтэрнэт-старонкі даведніка па архітэктурнай спадчыне Беларусі radzima.org. Ці дапаможа наш пераказ дoff Эдзіты Баруцкай, прысвечанага Бэйлі Скоту, вярнуць праект слыннага майстра, «перліну духоўнага і матэрыяльнага багацця» з забыцця? Ці знойдуцца сляды былых гаспадароў, па якіх можна было б аднавіць гісторыю памятнай мясціны на Віцебшчыне?

Дапамагаючы пані Баруцкай, Іосіф Цішкоўскі працягвае даследаванне лёсу спадчыны Хлудзінскіх у Лясковічах. Але зараз нават не зразумела, за кім лічыцца руіна — ці за мясцовым калгасам, ці за выканаўчымі ўладамі… Сляды спадчыннікаў Хлудзінскіх і блізкіх ім сем'яў Дуніных і Галераў губляюцца ў Польшчы і ЗША.

### Даведка

Бэйлі Скот (1865–1945) належаў да руху «Мастацтваў і Рамёстваў» (Arts&Crafts), што развіваўся на брытанскіх выспах напрыканцы XIX стагоддзя ў супрацьстаянні з віктарыянскім гістарызмам і эклектызмам. Стыль абапіраўся на мясцовыя рамесніцкія традыцыі, якія выціскаліся ў гэты час развіццём фабрычнай вытворчасці. Лідэр руху Джон Раскін (1819–1900), харызматычны мысляр і пісьменнік, захоплены архітэктурай і мастацтвам сярэднявечча, італьянскага трэчэнта і кватрачэнта, разумеў архітэктуру як увасабленне «звычаю, жыцця, гісторыі і рэлігійнай веры народаў». Поруч з Раскіным Уільям Морыс, паэт, які пакінуў след і ў гісторыі архітэктуры, выказаў ідэал Arts&Crafts адным сказам: «У доме мы павінны трымаць толькі прадметы, якія нясуць карысць або ўяўляюцца прыгожымі». Наследуючы Морыса і Раскіна, архітэктары ў 1880-я пачалі аб'ядноўвацца ў арганізаваныя на сярэднявечны ўзор цэхі: Цэх Стагоддзя (1882), Цэх і Школу рукадзелля (1888), існы да сёння Цэх работнікаў мастацтва (1884). Так паўстаў рух Arts&Crafts. У 1904 годзе нямецкі архітэктар Герман Мутэзіус, аташэ па культуры прускай амбасады ў Лондане, апублікаваў працу «Das Englische Haus», дэталёва абмаляваўшы англійскі дом як грамадскую, эканамічную і культурную з'яву, апісаўшы новыя тэндэнцыі ў архітэктуры рэзідэнцый.



### Даведка

27 кастрычніка 2007 года каталіцкі касцёл абвясціў бласлаўлёнай Цэліну Бажэнцкую, народжаную Хлудзінскую, заснавальніцу Таварыства Сясцёр Паўсталага з Памерлых, завяршыўшы 63-гадовы працэс кананізацыі. Нарадзілася Цэліна, цётка Уладзіслава Хлудзінскага, 29 кастрычніка 1833 года. Яе бацька Ігнацы скончыў Віленскі універсітэт напачатку 1830-х, калі яшчэ жылі рамантычныя ідэі Адама Міцкевіча. У 1853 годзе Цэліна ўзяла шлюб з Юзэфам Бажэнцкім і пасялілася ў яго маёнтку каля Гродна. Выхавала дзвюх дачок, не засталася ў баку ад грамадскіх падзей. Падчас паўстання 1863 года ў маёнтку мужа ў Абрэнбшчызне хавала параненых інсургентаў, патрапіла ў вязніцу. Даглядаючы захварэлага мужа, выехала з ім на лячэнне ў Вену, дзе праз 20 гадоў сямейнага жыцця аўдавела.

У 1875 годзе Цэліна накіравалася ў Рым, пасяліўшыся на Віа дэлла Віта, паблізу касцёла св. Клаўдзія, які абслугоўвала Таварыства Братоў Паўсталага з Памерлых. І тут нагадала пра сябе далёкая радзіма: Таварыства аказалася заснаваным 40 гадоў таму Багданам Яньскім з інспірацыі Адама Міцкевіча, з мэтай маральнага адраджэння народа… Далей была супраца з айцом Пятром Семяненкам, другім пачынальнікам Таварыства, які марыў пра стварэнне яго жаночага адгалінавання. Рэгістрацыя Таварыства Сясцёр Паўсталага з Памерлых, ачоленага Цэлінай, адбылася ў 1891 годзе. Наступнае дзесяцігоддзе пайшло на ўсталяванне пляцовак Таварыства ў Польшчы. Адкрываючы законныя дамы, школы, майстэрні для працы дзяўчат, Цэліна парадаксальным чынам перасяклася з рашэннем той жа сацыяльнай задачы, якую ставіў у сваіх архітэктурных праектах для гарадоў-садоў Бэйлі Скот. Таварыства апантана вяло тое, што сёння называецца сацыяльнай працай. Абранаму шляху Цэліна засталася вернай да скону ў 1913 годзе. У адрасаваным ёй пасмяротным слове сказана: «Да скону несла крыж, які Госпад усклаў на яе, каб дапамагчы ўвекапомненню яе асобы».

▶ ГАДАВІНА

# ВЯРТАННЕ МОВЫ



*Аляксей ХАДЫКА*

**26 студзеня споўнілася 20 гадоў з прыняцця Вярхоўным Саветам БССР XI склікання «Закона аб мовах». З гэтай нагоды старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў правёў прэс-канферэнцыю.**

«Закон аб мовах» тагачаснай БССР, нагадаў спадар Трусаў, зацвердзіў ВС БССР XI склікання на адным са сваіх апошніх пасяджэнняў, «пад заслону». Прынясце закона сталася знакавай падзеяй: яно нівелявала прычыну татальнай русіфікацыі, што ішла ў Беларусі з 1959 года з увядзеннем у дзеянне закона аб адукацыі, які дазволіў перавесці ўсе школы ў вялікіх гарадах на рускую мову, а бацькам адвольна вызваляць дзяцей ад вывучэння беларускай мовы.

У 1990 годзе вяртанне мовы ў школы пачыналася з нуля: з часоў Машэрава — Брэжнева ў гарадах не засталося беларускіх класаў, нацыянальную літаратуру вывучалі па-руску, а мову — толькі ў праграме 4–8 гадоў навучання. Паступова мова вярнулася ў навучальны працэс з пачатковых класаў, паўстала першая мінская беларускамоўная школа на вул. Уральскай, пачаў працаваць створаны ў 1990 годзе Уладзімірам Коласам беларускі Ліцэй.

Тэрмін увядзення Закона быў, не ў прыклад Прыбалтыйскім краінам, расцягнуты (10 год), але шанса беларусізацыі школы, а за ёй і грамадства, выглядалі цалкам пазітыўна. Да сярэдзіны 1990-х колькасць першакласнікаў беларускамоўнага навучання сягала 2/3. Здавалася, яшчэ 5 гадоў — і беларускія школьнікі складуць 75–80 працэнтаў. Ішоў пераход на беларускамоўнае выкладанне ў ВНУ, які стымулявала адпаведная даплата.

Функцыянальнае вяртанне мовы да грамадскага жыцця перапыніў адкат пасля ганебнага рэферэндуму 1995 года. Тым не менш Алег Трусаў выказаў аптымізм з нагоды перспектыў беларусізацыі. Насуперак зніжэнню колькасці беларускага школьніцтва да катастрафічных 18 працэнтаў, усе сацыялагічныя апытанні апошняга часу, праведзеныя дзяржаўнымі і недзяржаўнымі агенцтвамі, паказваюць, што мову тытульнай нацыі як абсалютную каштоўнасць упершыню пачало ўспрымаць больш за 50 працэнтаў насельніцтва.

Колькасць носьбітаў літаратурнай рускай мовы, са спыненнем іх фізічнага прытоку з-за мяжы, знізілася да 1–5 працэнтаў, у той час большасць грамадзян карыстаецца трасянкай. Навукоўцы, даследуючы практыку маўлення, лічаць яе жывым рэзервам вяртання да паўнавартаснай беларускасці. Шансы нацыянальнай мовы ўзрастаюць на фоне пераарыентацыі моладзі на вывучэнне англійскай замест рускай у якасці мовы міжнародных зносін.

Ёсць іншыя станоўчыя факты. Упершыню за шмат стагоддзяў беларусізуецца касцёл, следам за якім пачынаецца перагляд моўнай практыкі іншых канфесій. Вырасла пакаленне маладых беларусаў пачатку 1990-х, зараз не дзіва сустрэць чыноўніка топ-узроўню, які вольна карыстаецца беларускай мовай — ад міністра культуры Паўла Латушкі да кіраўнікоў гарадскога ўзроўню. У грамадскія кансультатыўныя рады мясцовае кіраўніцтва запрашае сяброў ТБМ. Застаюцца спадзяванні, што вынікі перапісу–2009, як і папярэдняга, паспрыяюць станоўчаму падыходу да нацыянальнай мовы.

Звяртаючыся да кіраўніцтва краіны з нагоды 20-годдзя «Закона аб мовах», ТБМ патрабуе адмяніць накіраваныя на русіфікацыю папраўкі, унесеныя ў яго ў 1998 годзе. А таксама вярнуцца да практыкі спрыяння беларускай школе: ад павелічэння гадзін выкладання мовы і літаратуры да аднаўлення беларускіх курсаў гісторыі і геаграфіі ў школе і курса «Беларусазнаўства» ў ВНУ і 20 працэнтаў даплаты за беларускае выкладанне ў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школе.

Грамадзян Беларусі ТБМ запрашае да ўдзелу ў выбарах мясцовых саветаў на платформе падтрымкі беларускай мовы і культуры, нагадваючы, што ў 1990 годзе дэпутатамі ВС як сябры Таварыства сталі 13 чалавек. А часы прыярытэту беларускай мовы вяртаюцца, лічыць Алег Трусаў.

▶ ВЫСТАВЫ

# ВАСІЛЬ СУМАРАЎ І ІНШЫЯ. НАПЕРАД З СССР

*Аляксей ХАДЫКА*

**У гісторыі мастацтва часам сустракаюцца імёны жывапісцаў ці скульптараў, чыё жыццё пакінула па сабе вялікую памяць не столькі за кошт створаных шэдэўраў, колькі дзякуючы выхаваным імі таленавітым і нават геніяльным вучням.**



Скажам, выкладчык і прафесар піцерскай Акадэміі мастацтваў, настаўнік плеяды мастакоў Расіі і нацыянальных ускраін-калоній імперыі, Павал Чысцякоў. Або ягоны вучань, Юдаль Пэн, пачынальнік віцебскай школы мастацтва XX стагоддзя і творчы «бацька» Марка Шагала. Пры гэтым лёс і Чысцякова, і Пэна даводзіць, што самі выкладчыкі-выхаваўцы адначасова заставаліся таленавітымі мастакамі.

Да ліку такіх унікальных выкладчыкаў і адначасова цудоўных творцаў належыць Васіль Фёдаравіч Сумараў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1981), які нарадзіўся праз 106 гадоў пасля Чысцякова — у 1938 годзе ў Мінску.

Выстава «Васіль Сумараў. Настаўнік і вучні», што адчынілася 15 студзеня ў Нацыянальным мастацкім музеі і працягнецца там да 15 лютага, самой сваёй канцэпцыяй засведчыла відавочную, агульнапрызнаную значнасць прафесарска-выкладчыцкага ўнёску Сумарава, зробленага ў развіццё выяўленчага мастацтва. Стаўшы на чале дзіцячай народнай студыі пры Палацы тэкстыльшчыкаў у Мінску ў 1965 годзе, жывапісец цягам чвэрці стагоддзя адчыняў шлях да творчасці таленавітай моладзі ў не зусім спагадлівай да маладых талентаў беларускай, збольшага пралетарскай, сталіцы.

Узыходжанне ў свет мастацтва школа Сумарава аднолькава гарантавала і дзецям творчай багемы, і сялянска-рабочай костцы, якім па розных прычынах не даводзілася стартаваць у прафесію праз звыклую мастацкую вучэльню. Такая вось выспа мастацкай свабоды, на якой вырасла цэлая генерацыя знакамітых не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі жывапісцаў, графікаў, дызайнераў. Многія з іх далучыліся да сёлетняга выставачнага праекта разам са сваім Настаўнікам. Такія розныя, але аднолькава пазнавальныя, прызнаныя імёны — Раман Заслонаў, Ігар Бархаткоў, Андрэй Задорын — усе яны вучні майстра.

Асабіста для мяне важна, што Васіль Сумараў не шукаў свой шлях на творчы Парнас праз гарантавана запатрабаваныя ў рамках савецкай сістэмы палітзаказу тэмы, увасабленне якіх у яго працах можна пералічыць на пальцах.

У праграмнай карціне «Мой дом» (1973), адначасова вельмі асабістай і сінтэтычнай, адлюстраваліся рысы «суровага стылю» — шчырае перажыванне звычайнага, штодзённага жыцця чалавека, узнятага да паэтычнага абагульнення. Адвечныя чалавечыя пачуцці і клопаты замест плакатных лозунгаў, зрабіўшыся зместам мастацкага выказвання, перададзеныя праз абагульненыя і экспрэсіўныя формы і насычаны колеравы лад.

Праўда вобразу пачала прыцягваць увагу да сумараўскіх работ у самыя застойныя часы. У наваградскіх краявідах 1970–1980-х увасаблялася не проста прыгажосць беларускай зямлі, але і подых тысячагадовай даўніны старажытнага краю, характэвічаўскі гістарычны рамантызм. А побач з манументальнымі кампазіцыямі мастак ствараў камерна-лірычныя нацюрморты і краявіды, адзначаныя тонкай гармоніяй колеравых градацый, мяккасцю пластычных пераходаў.

Сапраўднае мастацтва, якое жыло ў карцінах майстра, адчыняла для яго твораў залы вялікіх музеяў, вабіла прыхільнікаў, якія беспамылкова адчувалі шчырасць яго таленту. Таму сказаныя на адкрыцці выставы вядомым графікам і паэтам Рыгорам Сітніцам словы пра тое, што Сумараў «з'яўляецца сапраўдным багаццем нацыі», не падаюцца перабольшваннем.

***

Гэтымі днямі ў мінскіх выставачных залах адчыніліся яшчэ дзве выставы, якія сведчаць, як і экспазіцыя сумараўскіх работ, што шлях да самарэалізацыі і грамадскага сцвярджэння ў позняя савецкія часы ляжаў праз абранне індывідуальнага стылю, адрознага ад трафарэтных рамак калектыўных тэматычных выстаў і ідэалагізаванага дзяржзаказу.

Аляксандру Ісачову (1955–1987), заўчасна памерламу мастаку з Мазыра, можна закідаць наіўнасць яго міфалагічных сюжэтаў і вучнёўскую статычнасць вытачаных да дробязі формаў, калі не памятаць, якую ўсхваляваную рэакцыю выклікалі сярод тысячаў прыхільнікаў яго творы. Дагэтуль памятныя даўжэзныя чэргі на яго адзіную прыжыццёвую выставу ў Мінску.

Хаця творчасць Ісачова была хутчэй выяўленнем з'яваў сацыялагічнага характару — дэманстратыўны сыход ад афіцыёзнай штучнай рэальнасці ў герметычную прастору гістарычнага міфа, пошук трагічнага і загадкавага ў сімвалах мінулых цывілізацый, нарэшце, багашукальніцтва. Тое, што мастак ствараў іконы, заставалася, праўда, менш вядомым, бо яны не выстаўляліся на публічны агляд, прызначаючыся для храмаў. Прыватная калекцыя яго работ выстаўлена да 14 лютага ў Музеі сучаснага мастацтва (пр. Незалежнасці 47).

Яшчэ адна адметная выбітная асоба мастацкага свету Беларусі, іранічны і разнастайны графік, дызайнер Уладзімір Цэслер (працы творчага тандэма Цэслер — Войчанка электрызавалі атмасферу экспазіцый познесавецкага часу сваёй нестандартнай вобразнасцю) — прапануе персанальны праект «Вектарная прастора» ў Галерэі «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а). Гэтая выстава — уводзіны ў майстэрню мастака, апалогія і ўхваленне тэхнічнага прыёму — вібруючай, геаметрызаванай лініі, да чаго і трэба быць гатовым наведвальніку галерэі.

Пры ўсёй абмежаванасці музейнай прасторы Мінска прыемна адначасова ўбачыць тры выставы, досыць розныя па фармаце, але аб'яднаныя адным: іх героі, аўтары абралі адметны творчы шлях, заслужыўшы павагу і любоў гледача пад дзвюма зоркамі — індывідуальнасці і шчырасці.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 84
Падпісана да друку 29.01.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.